# ГІСТОРЫЯ СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ

## XIV–XV стст.

Вучэбны дапаможнік для 7 класа
агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных
навук, прафесара В. А. Фядосіка

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск «Народная асвета» 2009

Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

УДК 94(075.2=161.1)
ББК 63.3(0)4я721
Г51

А ў т а р ы:
В. А. Фядосік, І. А. Еўтухоў, А. А. Яноўскі,
А. А. Прохараў, С. М. Цемушаў, І. А. Аўдзееў

Пераклад з рускай мовы *Т. Р. Сяржант, Л. А. Цімафеевай*

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ імя Максіма Танка (кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А. М. Сурта*); настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі СШ № 4 г. Мінска *Т. Я. Сіўчык*; ад Дзяржкамісіі рэцэнзавалі: доктар гістарычных навук, прафесар, рэктар Брэсцкага дзяржуніверсітэта імя А. С. Пушкіна *М. Э. Часноўскі*; дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці *П. М. Гламбоцкі*

Г51 **Гісторыя** сярэдніх вякоў : XIV—XV стст. : вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. установ з беларус. мовай навучання / В. А. Фядосік [і інш.] ; пад. рэд. В. А. Фядосіка ; пер. з рус. мовы Т. Р. Сяржант, Л. А. Цімафеевай. — Мінск : Нар. асвета, 2009. — 167 с. : іл.

ISBN 978-985-03-1190-0.

**УДК 94(075.2=161.1)**
**ББК 63.3(0)4я721**

**ISBN 978-985-03-1190-0**

© Сяржант Т. Р., Цімафеева Л. А., пераклад на беларускую мову, 2009
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2009

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Ад аўтараў

Дарагія сябры!

У папярэднім класе вы вывучалі гісторыю цывілізацый свету першых двух перыядаў сярэдневякоўя — Ранняга і Высокага. З гэтага вучэбнага дапаможніка вы даведаецеся пра трэці перыяд сярэдніх вякоў — Позняе сярэдневякоўе.

З дапамогай зместу ў канцы кнігі вы зможаце хутка арыентавацца ў вучэбным матэрыяле і знаходзіць патрэбныя раздзел і параграф. Тэкст кожнага параграфа падраздзяляецца на асноўны і дадатковы. Асноўны ўключае матэрыял, абавязковы для вывучэння і засваення. Дапытлівыя вучні змогуць азнаёміцца і з дадатковым тэкстам. Ён дадзены пад рубрыкамі «Гістарычная крыніца», «Гістарычная даведка» больш дробным шрыфтам. Асобным шрыфтам выдзелены і новыя словы: найбольш важныя — паўтлустым, астатнія — курсівам.

З дапамогай пытанняў і заданняў да тэкстаў, карт, малюнкаў і схем вы праверыце свае веды і паразважаеце над вывучаным матэрыялам. Слоўнік забяспечыць вас даведачнай інфармацыяй і растлумачыць важнейшыя гістарычныя паняцці. Сінхранічная табліца дапаможа запомніць найбольш значныя падзеі і параўнаць іх адну з другой. Карты дадуць магчымасць суаднесці час і прастору гістарычнай падзеі. А яркія і маляўнічыя ілюстрацыі дапоўняць расказ пра мінулае. Як бачыце, нічога складанага ў рабоце з падручнікам няма. Дык смялей адгарніце наступную старонку і пачынайце сваё падарожжа па захапляючым свеце сярэдневякоўя.

У добры шлях!

Правообладатель Народная асвета

# УВОДЗІНЫ

## Свет і Еўропа ў Познім сярэдневякоўі

**Успомніце:** **1.** Якія цывілізацыі сфарміраваліся на працягу Ранняга і Высокага сярэднявякоўя ў Еўропе, Азіі, Афрыцы і Амерыцы? **2.** У чым галоўнае адрозненне паміж натуральнай і таварна-грашовай гаспадаркай? **3.** Якія назвы сучасных дзяржаў Еўропы можна знайсці на карце Еўропы Высокага сярэднявякоўя? **4.** Якія вынікі меў чацвёрты крыжовы паход для Візантыі?

**1. Цывілізацыі Позняга сярэднявякоўя.** Перыяд з **пачатку XIV** і да **канца XV** ст. называецца ***Познім сярэднявякоўем***. Развіццё цывілізацый і дзяржаў у гэты час працягвала заставацца нераўнамерным. Развіццё адных было запаволена захопамі качэўнікаў, напрыклад мангольскім панаваннем у Кітаі, Іране, на Русі. Развіццё іншых паскорылася, у першую чаргу — заходнееўрапейскай цывілізацыі. Узніклі і новыя цывілізацыі, напрыклад ацтэкаў і інкаў у Паўднёвай Амерыцы.

Сур'ёзны ўдар у Познім сярэднявякоўі быў нанесены ўсходне-еўрапейскай цывілізацыі. Пад націскам турэцкіх заваёўнікаў пала Візантыя. Туркі стварылі вялізную Асманскую дзяржаву на захадзе Азіі і паўднёвым усходзе Еўропы. Пад іх панаваннем на многія стагоддзі апынуліся грэкі і многія паўднёваславянскія народы. Але пасля падзення Візантыі цэнтр усходнееўрапейскай цывілізацыі перамясціўся на землі ўсходніх славян. *(Успомніце, хто захопліваў візантыйскія землі ў перыяд Высокага сярэднявякоўя? Продкамі якіх сучасных народаў з'яўляюцца ўсходнія славяне?)*

У Познім сярэднявякоўі на поўначы Азіі, у Афрыцы, Амерыцы і на ўсёй прасторы Аўстраліі нямала народаў па-ранейшаму жыло ва ўмовах першабытнага ладу. Гэтыя рэгіёны заставаліся малазаселенымі, людзі здабывалі там сродкі для існавання паляваннем, рыбнай лоўляй, збіральніцтвам. У Трапічнай Афрыцы, Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыцы цы-

Правообладатель Народная асвета

вілізацыі заставаліся асобнымі ачагамі. Некаторыя з іх наогул не мелі кантактаў з іншымі цывілізацыямі.

Найбольш развітыя грамадствы ў Познім сярэдневякоўі існавалі ў Еўропе, на ўсходзе, поўдні і захадзе Азіі, на поўначы Афрыкі. Але нават паміж многімі з гэтых цывілізацый на працягу амаль усяго Позняга сярэдневякоўя не было пастаянных сувязей.

І толькі ў самым канцы XV ст. гэта становішча рэзка змянілася. Еўрапейцы на караблях накіраваліся ў далёкія землі, да невядомых ім дагэтуль берагоў. Яны адкрылі Амерыку, трапілі ў Трапічную Афрыку, даплылі да далёкай Індыі. Розныя цывілізацыі свету сталі больш звязанымі паміж сабой.

**2. Заходняя Еўропа ў XIV—XV стст.** Чаму менавіта Еўропа з'явілася ініцыятарам устанаўлення сувязей з іншымі цывілізацыямі? Чаму гэта не зрабіў, напрыклад, Кітай? Кітайцы ж таксама адпраўлялі свае караблі да невядомых зямель. І флатыліі іх налічвалі не некалькі караблёў, а многія дзесяткі.

Галоўная прычына была ў імклівым эканамічным развіцці Заходняй Еўропы ў Познім сярэдневякоўі. На змену панаванню натуральнай гаспадаркі ў феадальным заходнееўрапейскім грамадстве прыйшло бурнае развіццё таварна-грашовай гаспадаркі. У гарадах пачалі выраблядь значна больш тавараў. Але для іх вытворчасці патрабавалася сыравіна, а для іх продажу — новыя рынкі. У пошуках сыравіны і рынкаў збыту еўрапейцы рушылі ў далёкія землі.

Мянялася і само феадальнае грамадства. Феадальныя адносіны панавання-падпарадкавання, якія ўсталяваліся паміж людзьмі ў Высокім сярэдневякоўі, звязвалі іх ініцыятыву. Залежны селянін не імкнуўся вырасціць вялікі ўраджай для свайго феадала, ведаючы, што з гэтага ён нічога не атрымае для сябе. У Познім сярэдневякоўі большасць сялян Заходняй Еўропы атрымалі асабістую свабоду. Цяпер яны былі

Правообладатель Народная асвета

вольныя ад самавольства феадалаў, вызвалены ад паншчыны. Праўда, феадалы заставаліся ўласнікамі зямлі, на якой працавалі сяляне. Пазямельная залежнасць сялян ад феадалаў захоўвалася. Затое, заплаціўшы ўласніку зямлі ***грашовы аброк***, сяляне маглі самі распараджацца той часткай ураджаю, што засталася. Маглі яго прадаць і купіць на атрыманыя грошы вырабы рамеснікаў.

Змяніліся адносіны і паміж самімі феадаламі. Цяпер сеньёр ужо не мог паслаць свайго васала ваяваць супраць караля. Таму што адзіным сеньёрам для ўсіх феадалаў стаў сам кароль. Улада каралёў у канцы сярэдневякоўя рэзка ўзмацнілася. Сціхалі і адыходзілі ў мінулае міжусобныя войны феадалаў.

У выніку ў Познім сярэдневякоўі Заходняя Еўропа робіць імклівы рывок у сваім эканамічным і грамадскім развіццi і выходзіць у лідэры сярод цывілізацый свету.

**3. Лёсы дзяржаў. Дзяржаўныя уніі.** У Познім сярэдневякоўі буйнейшай дзяржавай Заходняй Еўропы заставалася Свяшчэнная Рымская імперыя. Але яна не з'яўлялася самай уплывовай і моцнай з дзяржаў. Улада імператараў стала зусім слабай. У Свяшчэннай Рымскай імперыі працягвала панаваць феадальная раздробленасць. *(Успомніце, якія былі прычыны феадальнай раздробленасці.)*

Мацнейшымі дзяржавамі Заходняй Еўропы ў Познім сярэдневякоўі з'яўляліся тыя, дзе ўстанавілася моцная каралеўская ўлада. У гэтых дзяржавах каралі падпарадкавалі сабе ўсіх феадалаў. Яны абапіраліся на падтрымку гараджан, духавенства сваёй краіны. Самымі магутнымі дзяржавамі сталі Англія і Францыя. У канцы XV ст. да іх далучылася новая дзяржава — Іспанія.

Іспанія ўтварылася ў выніку ***уніі*** дзяржаў Пірэнейскага паўвострава Арагона і Кастыліі ў **1479** г. Раней **(1397 г.)** ***Кальмарскую унію*** заключылі тры скандынаўскія каралеў-

Правообладатель Народная асвета




Лічбамі на карце пазначаны:

1 Каралеўства Навара
2 Фландрыя
3 Уладанні герцагаў Бургундскіх
4 Швейцарскі саюз
5 Герцагства Савоя
6 Герцагства Мілан
7 Папская дзяржава
8 Неапалітанскае каралеўства
9 Чарнагорыя
10 Каралеўства Чэхія
11 Каралеўства Польшча
12 Мазавецкія княствы
13 Тэўтонскі ордэн
14 Лівонскі ордэн
15 Пскоўская зямля
16 Вялікае княства Разанскае

Еўропа ў канцы XV ст.

ствы: Данія, Швецыя і Нарвегія. Яшчэ раней **(1385 г.)** Польшча і Вялікае княства Літоўскае заключылі ***Крэўскую унію***. Найбольш трывалай з усіх гэтых уній аказалася унія Арагона і Кастыліі. Усяго праз некалькі гадоў пасля яе заключэння Іспанія завяршыла Рэканкісту. (**Дзяржаўная унія** — *аб’яднанне дзяржаў пад адзінай уладай.*)

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



Герб Іспаніі пасля уніі Арагона і Кастыліі



Герб Швецыі пасля Кальмарскай уніі

Буйнейшай вайной Позняга сярэднevякоўя стала Стогадовая вайна (1337—1453 гг.) паміж Англіяй і Францыяй. Французскія каралі ў працяглай і ўпартай барацьбе здолелі ліквідаваць апошнія англійскія ўладанні ў Францыі і хутка завяршыць аб'яднанне краіны.

**4. Падзенне Візантыі.** На Заходнюю Еўропу ў Познім сярэдневякоўі не было нашэсцяў з усходу, падобных да Вялікага перасялення народаў, і нашэсця манголаў. Але паўднёвы ўсход Еўропы перажыў мацнейшы націск туркаў з Малой Азіі. У выніку яго ў 1453 г. пала Візантыя — прамая наследніца некалі вялікай Рымскай імперыі.

Магутнасць Візантыі яшчэ раней была падарвана чацвёртым крыжовым паходам. І хаця візантыйцы здолелі аднавіць сваю дзяржаву, Візантыя ўжо не змагла дасягнуць сваёй былой велічы. *(Назавіце дату чацвёртага крыжовага паходу. Успомніце, калі візантыйцы выгналі з Канстанцінопаля захопнікаў — заходнееўрапейскіх феадалаў.)* Яна не змагла ажыццявіць такі эканамічны рывок, як Заходняя Еўропа. Візантыйскія гарады прыходзілі ў заняпад. У іх не існавала самакіравання, ініцыятыва купцоў і рамеснікаў падаўлялася дзяржаўнымі чыноўнікамі. У Візантыю хлынулі танныя тавары з паўночных гарадоў Італіі. Гэта прыводзіла да разарэння візантыйскіх рамеснікаў і купцоў.

Калі над Візантыяй навісла турэцкая пагроза, на захадзе Еўропы ішла Стогадовая вайна. Мацнейшыя еўрапейскія дзяржавы Англія і Францыя ваявалі паміж сабой і не збіраліся адцягваць свае сілы на дапамогу Візантыі. Адпраў-

Правообладатель Народная асвета

леныя змагацца з туркамі войскі іншых краін Еўропы былі разгромлены. Туркі, захопліваючы візантыйскія і паўднёваславянскія землі, паступова сціскалі кола аблогі вакол Канстанцінопаля. **29** мая **1453** г. турэцкае войска штурмам узяло Канстанцінопаль. Жахлівыя вынікі катастрофы Візантыі заходнееўрапейцы ўсвядомілі толькі тады, калі ўжо нельга было нічога змяніць. Турэцкая пагроза навісла і над астатняй Еўропай.

**1.** Чаму развіццё цывілізацый і дзяржаў у Познім сярэдневякоўі адбывалася нераўнамерна? **2.** Якія прычыны прывялі да лідэрства заходнееўрапейскай цывілізацыі сярод цывілізацый свету? **3.** Якія дзяржавы Заходняй Еўропы сталі найбольш магутнымі ў Познім сярэдневякоўі? **4.** Чаму буйнейшая дзяржава — Свяшчэнная Рымская імперыя — не з'яўлялася самай уплывовай і моцнай у Заходняй Еўропе? **5.** Якія дзяржавы ў XIV—XV стст. заключылі дзяржаўныя уніі? **6.** Якія былі прычыны аслаблення і падзення Візантыі? **7.** Растлумачце значэнне паняццяў: Позняе сярэдневякоўе, грашовы аброк, дзяржаўная унія.



Штурм турэцкімі войскамі Канстанцінопаля.
*Малюнак сучаснага мастака*

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная даведка*

**Падзенне сталіцы Візантыі — Канстанцінопаля**

Турэцкая аблога Канстанцінопаля працягвалася 53 дні. Да горада было сцягнута больш за 150 тыс. воінаў і каля 400 караблёў. Канстанцінопаль абаранялі прыкладна 10 тыс. чалавек. Магутныя сцены горада не дазвалялі туркам уварвацца ў горад. І тады туркі вырашылі нанесці ўдар у самае слаба абароненае месца — з боку бухты Залаты Рог. Сцены тут не былі трывала ўмацаваны. Але як да іх падабрацца? У бухце ж знаходзяцца візантыйскія караблі, а ўваход у яе перагароджаны цяжкімі жалезнымі ланцугамі. Тады ў адну з начэй туркі перацягнулі па драўляным насціле на сушы 80 сваіх караблёў у бухту ў абход ланцугоў. Яны захапілі бухту і адразу ж пабудавалі плывучы мост да сцен горада. На світанні 29 мая 1453 г. туркі рушылі на рашаючы штурм. Канстанцінопальцы змагаліся адчайна. У баі загінуў апошні імператар Візантыі Канстанцін XI. *(Успомніце, як звалі імператара, які заснаваў Канстанцінопаль. Да якіх наступстваў прывяло падзенне Канстанцінопаля?)*

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# РАЗДЗЕЛ I. ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА

## § 1. Змяненні ў грамадстве ў Заходняй Еўропе

**Успомніце:** **1.** Якімі шляхамі сяляне станавіліся залежнымі? **2.** Чаму ў Высокім сярэдневякоўі натуральная гаспадарка паступова пачала змяняцца на таварна-грашовую? **3.** Растлумачце значэнне паняццяў: панскія палі, сялянскія надзелы, аброк, паншчына, рамесная майстэрня, цэх, статут цэха, тавар.

**1. Развіццё сельскай гаспадаркі, вызваленне сялян.** У Заходняй Еўропе ў Высокім сярэдневякоўі ўзнікла шмат гарадоў. Гараджане зямлю не апрацоўвалі. У той жа час ім былі патрэбны прадукты харчавання і сыравіна для вытворчасці рамесных вырабаў. А гэта значыць, чым больш з'яўлялася гарадоў, тым большы быў попыт на прадукцыю сельскай гаспадаркі.

Прадукты і сыравіна паступалі ў горад з гаспадарак феадалаў. Феадалы разумелі, што шмат грошай яны атрымаюць толькі ад продажу вялікага ўраджаю. На зямлі ж працавалі залежныя сяляне. Ураджай быў вынікам іх працы. Сяляне адбывалі паншчыну на панскіх палях. Яны таксама працавалі на сваіх надзелах і плацілі аброк.


Ворыва і сяўба. *Мініяцюра рубяжа XV—XVI стст.*

Спачатку феадалы запатрабавалі, каб сяляне давалі ім аброк не прадуктамі, а грашамі. Затым пачалі вызваляць сялян ад паншчыны і пераводзіць іх на аброк. Цяпер панскія палі падзяляліся на надзелы і перадаваліся сялянам. Але зямля заставалася ва ўласнасці феадалаў. Сяляне плацілі аброк за карыстанне зямлёй не прадуктамі, а грашамі. Гэта значыць ся-

Правообладатель Народная асвета



Кірмаш. *Фрагмент карціны мастака рубяжа XV—XVI стст.*

ляне па-ранейшаму знаходзіліся ў пазямельнай залежнасці ад феадалаў.

Сялянам не трэба было працаваць на паншчыне. Яны больш часу ўдзялялі сваёй гаспадарцы. Таму іх праца стала больш плённай, і яны атрымлівалі большы ўраджай. А гэта было выгадна для феадалаў. *(Падумайце, што азначае выраз «праца сялян стала больш плённай».)* Цяпер селянін сам адвозіў прадукты на гарадскі рынак. І чым больш ён прадаваў там прадуктаў, тым больш у яго заставалася грошай пасля выплаты аброку феадалу.

Затым феадалы пачалі вызваляць сялян ад асабістай залежнасці. Але не дарма. За свабоду сяляне павінны былі заплаціць грошы.

Феадалы атрымлівалі грошы і ад продажу сыравіны гарадскім рамеснікам. Самым выгадным таварам у той час была воўна. У гарадах Фландрыі і Паўночнай Італіі хуткімі тэмпамі развівалася вытворчасць сукна. Там патрабавалася ўсё больш воўны. Многія феадалы спынялі вырошчванне ў сваіх маёнтках збожжа. Іх больш цікавіла вытворчасць воўны. Панскія палі ператвараліся ў пашу, дзе пасвіліся авечкі.

***Гістарычная даведка***

Фландрыя — адна з самых эканамічна развітых абласцей Заходняй Еўропы ў XII—XV стст. Асабліва цесныя эканамічныя сувязі Фландрыя мела з Англіяй. У фландрскіх гарадах з англійскай воўны выраблялі сукно, якое пасля вывозілі ў краіны Еўропы.

Правообладатель Народная асвета

**2. Змяненні ў феадальным саслоўі.** У Познім сярэднявякоўі каралі многіх краін Заходняй Еўропы пачалі ўмацоўваць сваю ўладу. Галоўнай перашкодай на гэтым шляху былі буйныя феадалы. Яны жылі ў добра ўмацаваных замках. У іх былі ўласныя рыцарскія атрады. У шэрагу краін Заходняй Еўропы буйныя феадалы выступалі супраць каралеўскай улады са зброяй у руках. У гэтых умовах каралеўская ўлада ажыццявіла важныя пераўтварэнні.

Феадальныя замкі разбураліся. Атрады буйных феадалаў распускаліся. Самі буйныя феадалы прысягалі на вернасць каралю. Рыцары, што раней уваходзілі ў атрады сваіх сеньёраў, паступалі на службу ў каралеўскую армію. Цяпер усе феадалы краіны, і буйныя, і дробныя, падпарадкоўваліся каралю. У Заходняй Еўропе паступова знікала феадальная іерархія.

Так на змену феадалізму Высокага сярэдневякоўя прыйшоў феадалізм Позняга сярэдневякоўя. Грамадства засталося феадальным, але змяніліся адносіны паміж феадаламі і сялянамі і паміж самімі феадаламі. (**Познефеадальнае грамадства** — *грамадства, у якім галоўнымі застаюцца феадальныя адносіны, але знікаюць асабістая залежнасць сялян ад феадалаў і феадальная іерархія.*)

**3. Мануфактурная вытворчасць. Наёмныя рабочыя.** ***Мануфактура*** — *гэта прадпрыемства, заснаванае на падзеле працы і ручной рамеснай тэхніцы.* Тэрмін «мануфактура» паходзіць ад лацінскіх слоў, якія абазначаюць «рука» і «вытворчасць».



Французскі рыцар XIV ст. *Рэканструкцыя*

Правообладатель Народная асвета

***Гістарычная даведка***

У Еўропе першыя мануфактуры ўзніклі ў Паўночнай Італіі ў пачатку XIV ст. Найбуйнейшыя з іх знаходзіліся ў Фларэнцыі. Гэта былі прадпрыемствы па вытворчасці тканіны — мануфактуры, якія выраблялі сукно.

За работай рамеснікаў у гарадах сачылі цэхі. Статут цэха вызначаў, колькі станкоў магло быць у майстэрні. Акрамя таго, у статуце пазначалася, якія вырабы і ў якой колькасці мог вырабіць майстар. *(Успомніце, ці мелі права займацца рамяством у гарадах людзі, якія не належалі ні да якога цэха.)*

У Фларэнцыі цэхі дазвалялі выраб сукна з воўны не толькі майстрам, але таксама і купцам. Купцы абяцалі цэхам захоўваць усе правілы вытворчасці і сачыць за якасцю сукна. Каб стрымаць абяцанне, яны прымалі на працу вопытнага майстра-сукнароба. Пасля гэтага яны закуплялі воўну і наймалі людзей для яе апрацоўкі. Гэтыя работнікі рабілі толькі адну простую аперацыю. Напрыклад, адзін работнік мыў воўну. Нічога другога ён не рабіў. Вымытая воўна паступала да другога работніка, які яе сушыў. Высушаная воў-




Сярэдневяковы горад. *Мініяцюра XV ст.*

Правообладатель Народная асвета

на паступала да трэцяга работніка, які яе часаў. Затым воўну атрымлівалі прадзільшчыцы. Атрыманая пража перадавалася ў ткацкія майстэрні.

Размеркаванне работнікаў па простых аперацыях пры вытворчасці вырабу называецца ***падзелам працы.***

Работнік павінен быў добра ведаць і выконваць толькі сваю аперацыю. У выніку работнікаў стала больш, чым раней. Гэта значыць, што і вырабаў пачалі выпускаць больш. Праца работніка не патрабавала доўгай падрыхтоўкі, а значыць, была таннай. Калі ж праца работніка была таннай, а вырабаў выпускалася больш, то і цана іх была невысокай.

Арганізаваная купцамі вытворчасць называлася мануфактурай. Работнікі мануфактур атрымлівалі за сваю працу грошы, гэта значыць яны былі ***наёмнымі рабочымі.***

Такім чынам, у гарадах Заходняй Еўропы з’явіўся новы прынцып арганізацыі вытворчасці — падзел працы. Выкарыстанне падзелу працы ў вытворчасці прывяло да ўзнікнення мануфактур і наёмных рабочых. Мануфактура прыйшла на змену рамеснай майстэрні. Мануфактурная вытворчасць прывяла да рэзкага павелічэння выпуску тавараў на рынак і да таго, што тавары станавіліся таннейшымі.

**1.** Як звязана развіццё сельскай гаспадаркі ў Познім сярэдневякоўі і вызваленне сялян? **2.** Чаму многія феадалы ператваралі свае панскія палі ў пашы? **3.** Якія змяненні адбыліся ў Познім сярэдневякоўі ў феадальным саслоўі? **4.** Што такое падзел працы? Апішыце стварэнне на мануфактуры якога-небудзь вырабу: крэсла, тканіны з воўны, збана, лапаты і г. д. **5.** Чаму мануфактурныя прадпрыемствы рэзка павялічылі аб’ёмы вытворчасці тавараў на рынак? **6.** Дайце азначэнне паняццям: мануфактура, падзел працы, наёмныя рабочыя.

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная крыніца*

**Балада аб багатым суконшчыку Джэку з Ньюберы (XV ст.)**

У гэтай даўжэзнай, вялікай пуні
Дзвесце ткацкіх станкоў стаяць
І дзвесце ткачоў — іх дзень прасачы!
Працуюць ад золку, выходзяць уначы.
Ля кожнага моўчкі хлопчык сядзіць,
Чаўнок ён рыхтуе, а майстар бурчыць.
У пуні суседняй пыл у паветры вісіць —
Жанчыны расчэсваюць воўну — іх сотня, калі падлічыць.
А ў тым памяшканні — хадзіце туды!
Дзвесце работніц, дзеці бяды.
Не ведаюць стомы і воўну прадуць
І сумную песню пяюць.
А побач на бруднай падлозе
Дзяцей паўтараста сядзіць, бы ў аблозе.
За пені ў дзень яны воўну скубуць —
Яе адсартуюць, ім зноў прынясуць.

*Далей у баладзе распавядаецца аб тым, што ў наступным памяшканні 50 чалавек стрыгуць воўну, а 80 — выраўноўваюць гатовую тканіну, 40 — фарбуюць, 20 — пакуюць.*

*(Падлічыце, колькі чалавек працавала ў мануфактуры суконшчыка Джэка. Апішыце працэс вырабу сукна ў мануфактуры. У чым вы бачыце адрозненне ткацкай мануфактуры ад рамеснай майстэрні па вытворчасці тканін?)*

| Пытанні для параўнання | Рамесная майстэрня | Мануфактура |
|---|---|---|
| Хто быў гаспадаром? | | |
| Ці адбываўся падзел працы? | | |
| Хто працаваў? | | |
| Хто сачыў за якасцю вырабаў? | | |

Правообладатель Народная асвета

## § 2. Цэнтралізаваныя дзяржавы

**Успомніце:** 1. У якой дзяржаве Еўропы Ранняга сярэдневякоўя кіраванне было цэнтралізаваным? **2.** Чаму ўмацаванне буйных феадалаў аслабляла каралеўскую ўладу? **3.** Як у канцы Высокага сярэдневякоўя каралі Францыі аб'ядноўвалі краіну? **4.** Растлумачце значэнне паняццяў: цэнтралізаванае кіраванне, чыноўнік, самакіраванне гарадоў, саслоўе, манархія, парламент.

**1. Дзяржавы ў Заходняй Еўропе.** Самымі вялікімі краінамі Заходняй Еўропы ў Познім сярэдневякоўі былі Свяшчэнная Рымская імперыя, Англія, Францыя і Іспанія. *(Знайдзіце на карце* (гл. с. 7) *гэтыя краіны.)* Свяшчэнная Рымская імперыя заставалася раздробленай. Улада імператара была слабай. У той жа час каралеўская ўлада ў Англіі, Францыі і Іспаніі ўмацавалася. Там феадальныя ўладанні былі аб'яднаны ў адну краіну.

**2. Фарміраванне цэнтралізаваных дзяржаў.** Аб'яднанне краіны пад уладай караля адбывалася не адразу. Спачатку паміж яе рознымі часткамі наладжваліся гандлёвыя сувязі. Арганізоўваліся кірмашы. Развіваўся гандаль. Раслі гарады. Рамеснікі і купцы хацелі, каб іх тавары без перашкод прадаваліся па ўсёй краіне. Раней кожны феадал за права праезду па сваіх уладаннях браў плату. І гандляры неслі страты. У адзінай краіне такіх перашкод не магло быць. А значыць, гарады гатовы былі падтрымаць караля ў аб'яднанні краіны. Дробныя феадалы таксама хацелі атрымаць дапамогу ад караля супраць усеўладдзя сваіх сеньёраў. Нарэшце, усе жыхары краіны пакутавалі ад міжусобных войнаў феадалаў. І толькі кароль з яго моцнай арміяй мог абмежаваць правы буйных феадалаў, спыніць іх войны і аб'яднаць краіну. У выніку аб'яднання краіны каралеўская ўлада стала цэнтрам, які кіраваў дзяржавай.

Дзяржава, кіраванне якой ажыццяўляецца з аднаго цэнтра, называецца ***цэнтралізаванай дзяржавай***. У Познім ся-

Правообладатель Народная асвета




Цэнтралізаваная дзяржава ў Францыі

рэдневякоўі цэнтралізаваныя дзяржавы сфарміраваліся ў Англіі, Францыі і Іспаніі.

**3. Саслоўна-прадстаўнічая манархія.** У тых краінах, дзе фарміравалася цэнтралізаваная дзяржава, адбываліся вялікія змяненні. Цяпер краіна кіравалася з аднаго цэнтра. Але трэба было, каб рашэнні, прынятыя ў цэнтры, выконваліся нават у самых далёкіх кутках краіны. Таму для кантролю над выкананнем рашэнняў ствараліся спецыяльныя органы ўлады. У іх працавалі каралеўскія чыноўнікі. Паколькі цэнтралізаваныя дзяржавы займалі вялікія тэрыторыі, то і органаў улады было многа. Гэта значыць, што і чыноўнікаў патрабавалася намнога больш. *(Успомніце, чаму ў Высокім сярэдневякоўі ў краінах Заходняй Еўропы было мала чыноўнікаў.)*

Для падтрымання парадку ў краіне, а таксама для абароны яе меж была неабходна моцная армія. У перыяд Высокага сярэдневякоўя яна збіралася толькі ў выпадку ваеннай пагрозы або пачатку вайны. Армію краіны ў гэты час складалі атрады, якія прыводзілі з сабою буйныя феадалы. З узнікненнем цэнтралізаваных дзяржаў атрады буйных феадалаў былі распушчаны і створана каралеўская армія. У мірны час яе не распускалі, гэта была пастаянная армія.

Павелічэнне колькасці чыноўнікаў і з'яўленне пастаяннай арміі патрабавалі вялікіх дзяржаўных выдаткаў. Грошы на свае выдаткі дзяржава атрымлівала, збіраючы падаткі. Спагнанне падаткаў было выключным правам дзяржавы. Падаткі спаганяліся з усіх жыхароў краіны. Пры гэтым нельга

Правообладатель Народная асвета



Збор падаткаў каралеўскімі чыноўнікамі. *Мініяцюра XIV ст.*

было дзейнічаць толькі з выкарыстаннем сілы. Нездаволенае насельніцтва магло ўзняць паўстанне. Трэба было дабіцца згоды людзей плаціць падаткі. Але як атрымаць гэту згоду? Немагчыма ж было спытаць у кожнага жыхара краіны, ці згодны ён аддаць свае грошы ў выглядзе падатку. Таму ўжо ў Высокім сярэдневякоўі ў Англіі каралі пачалі атрымліваць згоду на выплату падаткаў не ва ўсіх жыхароў, а ў выбраных імі прадстаўнікоў. Прадстаўнікі саслоўяў на сваіх сходах давалі згоду не толькі на збор падаткаў. Яны таксама прымалі законы, па якіх жыла краіна.

Манархія, пры якой кароль звяртаецца за парадай або згодай да прадстаўнікоў саслоўяў, называецца ***саслоўна-прадстаўнічай манархіяй***.

**4. Дзяржаўны лад Англіі, Францыі і Іспаніі.** Саслоўна-прадстаўнічым органам улады ў Англіі быў ***парламент***. Англійскі парламент складаўся з дзвюх палат. *(Назавіце дату ўзнікнення парламента ў Англіі. Што стала прычынай з'яўлення англійскага парламента?)* На пасяджэнні верхняй палаты кароль запрашаў буйных феадалаў і вышэйшых кіраўнікоў царквы. Ніжняя палата выбіралася багатымі свабоднымі англічанамі. У ёй засядалі па двое рыцараў ад кожнага графства і па двое гараджан ад кожнага горада. Ніжняя палата магла звяртацца да верхняй палаты і да караля з просьбай прыняць той ці іншы закон.

Сход прадстаўнікоў французскіх саслоўяў называўся ***Генеральнымі штатамі***. Упершыню яны былі склікаыны ў **1302** г. Генеральныя штаты складаліся з трох палат. У іх былі прадстаўлены тры саслоўі краіны: свяшчэннікі, феада-

Правообладатель Народная асвета



Герб Англіі



Герб Францыі

лы, гараджане. Кожнае саслоўе збіралася асобна. Канчатковае рашэнне прымалася на агульным сходзе.

У Іспаніі саслоўі былі прадстаўлены ў ***картэсах***. Першыя картэсы ў дзяржавах Пірэнейскага паўвострава былі створаны яшчэ ў Высокім сярэдневякоўі. У картэсах былі прадстаўлены феадалы і гараджане.

У англійскага парламента, французскіх Генеральных штатаў і іспанскіх картэсаў было шмат агульнага. Па-першае, гэта былі саслоўна-прадстаўнічыя органы ўлады. Тут засядалі прадстаўнікі саслоўяў, якія адстойвалі інтарэсы свайго саслоўя. Па-другое, гэтыя органы ўлады мелі аднолькавыя задачы — даць каралеўскай уладзе згоду на збор падаткаў і адобрыць законы, прапанаваныя каралём. Па-трэцяе, гэта былі дарадчыя органы.

**1.** Чаму рост гарадоў і развіццё гандлю садзейнічалі аб'яднанню краіны пад уладай караля? **2.** Хто быў зацікаўлены ва ўзмацненні ўлады караля? **3.** Для чаго ў цэнтралізаваных дзяржавах патрэбны былі чыноўнікі і пастаянная армія? **4.** Навошта каралі пачалі склікаць органы саслоўнага прадстаўніцтва? **5.** Якія пытанні абмяркоўваліся ў органах саслоўнага прадстаўніцтва? **6.** У чым падабенства і адрозненне паміж англійскім парламентам і французскімі Генеральнымі штатамі?

| Пытанні | Парламент | Генеральныя штаты |
|---|---|---|
| Дата ўзнікнення | | |
| Колькасць палат | | |
| Якія пытанні вырашалі? | | |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная крыніца*

**З запрашэння прадстаўнікоў ад гарадоў на Генеральныя штаты 1302 г.**

Філіп, ласкаю Божай кароль франкаў... Мы жадаем абмеркаваць і разгледзець сумесна з прэлатамі, баронамі і іншымі нашымі і нашага каралеўства вернымі падданымі многія цяжкія абставіны... Мы прадпісваем, каб консулы і абшчыны гарадоў і мястэчак Манпелье і Басэра выбралі па два або па тры з лепшых і вопытных людзей. Гэтым людзям належыць прыбыць у Парыж для сумеснага з намі разгляду, абмеркавання, прыняцця да ведама, выканання і адабрэння ўсяго таго, што ўжо намі пастаноўлена. *(Назавіце, хто ўваходзіў у склад Генеральных штатаў. Якія пытанні там абмяркоўваліся?)*

*Гістарычная крыніца*

**З «Пахвалы законам Англіі» аўтара XV ст.**

Не можа кароль Англіі па жаданні сваім змяняць законы каралеўства свайго... Ён не можа ні змяняць законы сам без згоды свайго народа, ні абцяжарваць народ насуперак яго жаданню падаткамі... Народ, якім кіруюць з дапамогай законаў, прынятых па яго жаданні, свабодна атрымлівае даходы ад сваёй маёмасці. *(Як вы думаеце, за што хваліць законы Англіі аўтар дакумента?)*

## § 3. Каталіцкая царква ў Познім сярэдневякоўі

**Успомніце:** **1.** Калі і чаму адбыўся раскол хрысціянскай царквы на каталіцкую і праваслаўную? **2.** Чым вядомы ў гісторыі папа Інакенцій III? Чаму ў XIII ст. рымскім папам падпарадкоўваліся манархі Заходняй Еўропы? **3.** Якую ролю адыгралі рымскія папы ў арганізацыі крыжовых паходаў? **4.** Чаму царква змагалася з ерасямі?

**1. Падзенне магутнасці рымскіх пап.** XIII ст. стала вяршыняй магутнасці рымскіх пап у заходнееўрапейскім грамадстве. Папы былі незалежныя ад улады імператараў і каралёў. Больш таго, яны дыктавалі ім сваю волю, актыўна ўмешваліся не толькі ў справы асобных заходнееўрапейскіх краін, але і ў адносіны паміж імі.

У Высокім сярэдневякоўі ва ўмовах палітычнай раздробленасці каталіцкая царква на чале з папамі была галоўнай аб'яднальнай сілай у заходнееўрапейскім грамадстве. Але ў

Правообладатель Народная асвета



Герб папы рымскага

XIV ст. з надыходам Позняга сярэднявякоўя феадальныя сувязі паміж людзьмі пачалі разбурацца. У выніку змянілася само грамадства.

З утварэннем цэнтралізаваных дзяржаў у Заходняй Еўропе знікла феадальная іерархія. З гэтага часу кароль з’яўляўся адзіным сеньёрам для ўсіх феадалаў краіны. І ўжо ніякі граф або герцаг не мог загадаць сваім рыцарам ісці вайной на караля. Гэта расцэньвалася як дзяржаўная здрада. Сяляне дзякуючы каралеўскім указам былі вызвалены ад асабістай залежнасці ад сваіх феадалаў. Дабіліся свабоды ад сваіх гаспадароў-феадалаў многія гарады. У іх устанавілася самакіраванне. І ў гэтай барацьбе іх саюзнікам з’яўлялася каралеўская ўлада.

У цэнтралізаваных дзяржавах каралеўскай уладзе падпарадкоўвалася ўсё насельніцтва краіны. У тым ліку і духавенства, нягледзячы на тое, што яно па-ранейшаму заставалася першым саслоўем грамадства. Як і іншыя падданыя, свяшчэннікі павінны былі выконваць каралеўскія загады, плаціць падаткі ў дзяржаўную казну. Адмову ад гэтага манархі лічылі злачынствам супраць дзяржавы. У Англіі і Францыі вышэйшае духавенства ўваходзіла ў першыя палаты парламента і Генеральных штатаў. У саслоўна-прадстаўнічых установах сваіх краін духавенства разам з іншымі прадстаўнікамі насельніцтва абмяркоўвала важнейшыя пытанні жыцця дзяржавы. Яно прымала рашэнні і аб падатках у краіне. Інтарэсы сваёй краіны станавіліся для духавенства цэнтралізаваных дзяржаў першараднымі.

Папы рымскія не адразу ўсвядомілі змяненні, што адбыліся. Спачатку яны паспрабавалі дзейнічаць старымі метадамі. Калі каралі Англіі і Францыі пачалі рыхтавацца да вайны паміж сабой, яны ўвялі падаткі на духавенства. Папа

Правообладатель Народная асвета

Баніфацый VIII (1294—1303 гг.) забараніў уводзіць такія падаткі, пагражаючы каралям адлучэннем ад царквы. *(Успомніце, якімі маглі быць вынікі адлучэння чалавека ад царквы.)* Але на гэты раз папская пагроза не падзейнічала. А калі папа запатрабаваў ад французскага караля выканання яго распараджэнняў, той адправіў сваіх людзей у Італію. Папа быў арыштаваны. Гэта было нечуванай знявагай для ўладыкі каталіцкай царквы.



Папа рымскі Баніфацый VIII

Узрушаны папа хутка памёр, а новым папай пад націскам французскага караля выбралі француза. Ён пакінуў Рым і пераехаў у горад Авіньён. Надышоў час *авіньёнскага «палону» пап*. У гэты час папы ўжо не спрабавалі дыктаваць сваю волю каралям, яны самі залежалі ад іх. Магутнасць папства засталася ў мінулым.

Такім чынам, змяненні ў грамадстве, утварэнне цэнтралізаваных дзяржаў абумовілі падзенне ролі пап у палітычным і грамадскім жыцці краін Заходняй Еўропы.

**2. Авіньёнскі «палон» пап.** Так прынята называць перыяд з 1309 па 1377 г., калі рэзідэнцыяй пап быў не Рым, а Авіньён. «Палонам» гэты час называлі таму, што папы поўнасцю залежалі ад каралёў Францыі.

***Гістарычная даведка***

Авіньён знаходзіўся на землях Свяшчэннай Рымскай імперыі, на самай мяжы з Францыяй. У 1348 г. папы выкупілі горад і зрабілі часткай сваёй дзяржавы. Цяпер гэта невялікі горад на поўдні Францыі.

Але на самай справе гэта быў не палон, а супрацоўніцтва пап з французскімі каралямі. Усе папы таго часу былі французамі. У Рыме было неспакойна. Спробы пап вярнуцца ў Рым сустракалі супраціўленне рымлян. Каля сярэдзіны

Правообладатель Народная асвета



Манета Філіпа IV

XIV ст. жыхары Рыма паўсталі і абвясцілі аб стварэнні рэспублікі. Паўстанне з цяжкасцю ўдалося падавіць. Такім чынам у Авіньёне папы адчувалі сябе ў бяспецы пад абаронай караля Францыі.

У сваю чаргу папы падтрымлівалі французскіх каралёў. Калі Філіп IV пакваліўся на багацці ордэна тампліераў, папа, каб дагадзіць яму, аб'явіў рыцараў-манахаў ерэтыкамі.

*Гістарычная даведка*

Тампліеры мелі велізарныя багацці. Яны не раз пазычалі грошы каралям. У адзін з асенніх дзён 1307 г. па ўсёй Францыі тампліеры былі арыштаваны. Катаваннямі іх прымусілі «прызнацца» ў страшэнных злачынствах і ерасі. Кіраўнікоў ордэна спалілі на кастрах. Маёмасць французскіх тампліераў канфіскаваў кароль. А сам ордэн быў ліквідаваны па настаянні папы.

Папы падтрымалі французскіх каралёў і тады, калі паміж Англіяй і Францыяй пачалася Стогадовая вайна.

Падзенне магутнасці пап не азначала, што яны страцілі сваю вярхоўную ўладу ў самой каталіцкай царкве. Яшчэ ў пачатку Ранняга сярэдневякоўя папы змагаліся супраць прызначэння епіскапаў каралямі. І яны здолелі спачатку дабіцца таго, каб епіскапы выбіраліся духавенствам. А затым у перыяд авіньёнскага «палону» папы ўжо самі сталі прызначаць епіскапаў, а гэта значыць, што іх роля як уладык царквы ўзрасла.

У час знаходжання пап у Авіньёне рэзка памножыліся іх багацці. Гэта адбылося дзякуючы выплатам, што атрымлівалі папы ад духавенства і манастыроў.

**3. «Вялікі раскол» у каталіцкай царкве.** Знаходжанне пап у Авіньёне выклікала нездавальненне многіх вернікаў у розных краінах.

Правообладатель Народная асвета

***Гістарычная даведка***

Папы сцвярджалі, што яны пераемнікі апостала Пятра, першага епіскапа Рыма. Згодна ж з евангеллямі, менавіта Пятра Ісус Хрыстос прызначыў галоўным апосталам.

З 1377 г. папы зноў знаходзіліся ў Рыме. Але калі ў наступным годзе новым папай выбралі не француза, а італьянца, то кароль Францыі быў абураны. У выніку паслухмянае каралю духавенства выбрала свайго папу. Так у каталіцкай царкве з'явіліся адразу два папы. Адзін знаходзіўся ў Рыме, другі — у Авіньёне.

Гэта прывяло да ***«вялікага расколу»*** ў каталіцкай царкве. Ён доўжыўся з 1378 па 1417 г. Каталіцкая Еўропа падзялілася на прыхільнікаў рымскага і авіньёнскага пап. Раскол паглыбіўся ў сувязі са Стогадовай вайной. Авіньёнскага папу падтрымлівалі Францыя і яе саюзнікі Шатландыя, Кастылія. На баку папы рымскага былі Англія, Партугалія, Венгрыя і шэраг іншых краін.

Раскол прывёў да яшчэ большага падзення аўтарытэту пап. Небяспеку расколу разумела і вышэйшае духавенства. Але сама царква не змагла пераадолець раскол. Духавенства сабралася на *сабор* — свой вышэйшы з'езд — і абрала новага адзінага для ўсіх папу. Аднак ні рымскі, ні авіньёнскі папы не прызналі гэтага рашэння. Замест двух пап стала тры.

Раскол здолеў спыніць толькі імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі Сігізмунд I. Пад яго націскам быў скліка081ны новы сабор. І нарэшце быў выбраны новы папа. Астатніх пап прымусілі адмовіцца ад вышэйшай улады ў царкве. Гэтыя падзеі паказалі поўную залежнасць папства ад улады манархаў і няздольнасць каталіцкай царквы самастойна пераадолець «вялікі раскол».

**4. Дзяржавы Заходняй Еўропы і каталіцкая царква.** Аслабленне ўлады пап прывяло да фарміравання ў цэнтралізаваных дзяржавах цэркваў, падпарадкаваных каралям. У

Правообладатель Народная асвета

Францыі папам забаранілі прызначаць епіскапаў, іх выбіралі па рэкамендацыі караля. У Англіі епіскапам мог стаць толькі англічанін. Пасля ўтварэння Іспаніі інквізіцыя ў краіне была падпарадкавана каралеўскай уладзе.

Папы рымскія па-ранейшаму прызнаваліся духоўнымі ўладыкамі ўсіх католікаў. Але ў цэнтралізаваных дзяржавах галоўным уладаром для ўсіх падданых з'яўляўся кароль. І яму падпарадкоўвалася духавенства ўсёй краіны. Любыя спробы пап умяшацца ў справы дзяржаў спыняліся каралямі, і ў гэтым іх падтрымлівала мясцовае духавенства.

**1.** Якія змяненні ў заходнееўрапейскім грамадстве ў XIV ст. прывялі да заняпаду магутнасці рымскіх пап? **2.** Раскажыце пра авіньёнскі «палон» пап. Колькі гадоў ён працягваўся? **3.** Чаму адбыўся «вялікі раскол» у каталіцкай царкве? Што ён паказаў? **4.** Як было абмежавана ўсеўладдзе пап у цэнтралізаваных дзяржавах? **5.** Параўнайце вынікі дзейнасці рымскіх пап Інакенція III і Баніфацыя VIII.

## § 4. Стогадовая вайна (1337—1453 гг.)

**Успомніце:** **1.** Калі пачаліся першыя войны французскіх каралёў з англійскімі за аб'яднанне Францыі? **2.** Якім чынам у сярэдзіне XII ст. у каралёў Англіі з'явіліся вялізныя ўладанні ў Францыі? **3.** Растлумачце значэнне паняццяў: дынастыя, падатак, ерась.

**1. Прычыны Стогадовай вайны.** У XIV ст. паміж Англіяй і Францыяй пачалася вайна, якая працягвалася з перапынкамі больш за сто гадоў і таму была названа ***Стогадовай вайной***. *(Падлічыце, колькі гадоў доўжылася Стогадовая вайна.)* У караля Францыі Карла IV не было сыноў. Пасля яго смерці пачаліся спрэчкі аб тым, каму перадаць карону. Права на яе атрыманне было ў двух чалавек. Карону мог атрымаць французскі феадал ***Філіп Валуа*** або кароль Англіі ***Эдуард III***. Філіп Валуа даводзіўся памерламу каралю стрыечным братам, а Эдуард III — пляменнікам. Буйныя французскія феадалы аддалі карону Філіпу. У адказ на гэта Эдуард III пачаў вай-

Правообладатель Народная асвета

ну супраць Францыі. Ён хацеў захапіць гэту краіну і стаць яе каралём.

Стогадовая вайна была дынастычнай вайной. З боку Англіі яна была захопніцкай, а з боку Францыі — вызваленчай.



Бітва пры Крэсі.
*Мініяцюра XV ст.*

**2. Асноўныя ваенныя дзеянні.** У пачатку вайны баявыя дзеянні англічан супраць французаў былі паспяховымі. Французскі флот быў разбіты на моры, а армія — пры Крэсі ў **1346** г. Англічане захапілі горад-порт Кале, які стаў іх асноўнай базай на французскай зямлі. У **1356** г. англійскія войскі разграмілі французаў пры Пуацье. Тут загінулі некалькі тысяч рыцараў, сам французскі кароль трапіў у палон. Францыя павінна была аддаць за яго вялізны выкуп.

У 1360 г. Францыя і Англія падпісалі мірны дагавор. Паводле яго ўмоў Англія атрымлівала амаль трэцюю частку французскай тэрыторыі.

Англічане рабавалі насельніцтва захопленых тэрыторый. Яно ўзнялося на барацьбу з захопнікамі. Пасля гэтага ў вайну ўступіла французская каралеўская армія. Ваенныя дзеянні аднавіліся. Французы пачалі крок за крокам вызваляць краіну. Праз 15 гадоў Англія захавала за сабой толькі некалькі гарадоў на паўднёва-заходнім узбярэжжы Францыі. На гэтым вайна зноў прыпынілася.

У пачатку XV ст. у Францыі пачалася барацьба паміж буйнымі феадаламі. Гэтая барацьба аслабіла краіну. Англія вырашыла выкарыстаць аслабленне Францыі і ў саюзе з герцагам Бургундыі аднавіла баявыя дзеянні. Саюзнікі захапілі велізарныя тэрыторыі на поўначы Францыі. Поўдзень краіны абара-

Правообладатель Народная асвета



Аблога крэпасці.
*Мініяцюра XV ст.*



Спаленне Жанны д'Арк.
*Малюнак сучаснага мастака*

няў прынц Карл, сын караля Карла VI. У **1428** г. англічане пачалі аблогу Арлеана на рацэ Луары. Захапіўшы Арлеан, яны маглі б пачаць заваяванне поўдня і захапіць усю Францыю. *(Калі становішча Францыі было больш небяспечным: у канцы XIV ст. ці ў пачатку XV ст.?)*

**3. Жанна д'Арк.** У гэты складаны для Францыі час на абарону радзімы выступіла 16-гадовая дзяўчына-сялянка ***Жанна д'Арк.*** Яна паспяшалася да камeнданта адной з французскіх крэпасцей. Жанна пачала пераконваць яго, што Бог хоча выратаваць Францыю і зробіць гэта праз яе. Камендант пасля доўгіх ваганняў даў Жанне баявога каня і зброю. Тым часам чуткі пра яе хутка распаўсюдзіліся па краіне. Усе французы, ад селяніна да двараніна, паверылі, што Жанну паслаў Бог і Бог выратуе іх ад англічан. Карл паставіў Жанну д'Арк на чале арміі і даў ёй вопытных дарадчыкаў. Падчас бітваў яна пастаянна была ў найбольш небяспечных месцах і паказвала сапраўдныя цуды адвагі. У 1429 г. армія на чале з Жаннай падышла да Арлеана. Хутка англічане былі разгромлены. Арлеан быў у аблозе 209 дзён, армія Жанны д'Арк вызваліла яго ўсяго за 9 дзён! Для французаў гэта быў сапраўдны цуд і доказ дапамогі Бога. Вызваленне Арлеана ад аблогі стала першай вялікай перамогай французскай арміі за шмат гадоў.

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная даведка*

Лёс Жанны д'Арк склаўся трагічна. У 1430 г. яе захапілі ў палон бургундцы. Герцаг Бургундыі за вялікі выкуп аддаў яе англічанам. Над Жаннай быў арганізаваны царкоўны суд, які абвінаваціў яе ў вядзьмарстве. Суд прызнаў Жанну вінаватай у ерасі, і яна была спалена на кастры ў маі 1431 г. Праз 25 гадоў па распараджэнні караля Францыі справа Жанны д'Арк была перагледжана, і яе прызналі невінаватай. Жанна д'Арк стала нацыянальнай гераіняй Францыі.

**4. Вынікі Стогадовай вайны.** Закончылася Стогадовая вайна пасля здачы англічанамі горада Бардо. Цяпер Англія захавала толькі адзін горад на французскай зямлі — Кале. Такім чынам французы атрымалі перамогу ў Стогадовай вайне і вызвалілі сваю краіну ад захопнікаў.

**5. Сялянскія паўстанні.** Для вядзення Стогадовай вайны каралям Францыі і Англіі патрэбны былі грошы. Але падаткаў, нават павялічаных, на вайну не хапала. Таму каралі шукалі шляхі, каб павялічыць паборы з жыхароў сваіх краін. У першую чаргу ад пабораў цярпелі сяляне. Бо плацілі грошы ў асноўным яны.

У Францыі з сялян былі сабраны грошы, каб выплаціць вялізны выкуп за караля, які трапіў у палон да англічан. Акрамя таго, з іх сталі патрабаваць грошы на рамонт умацаванняў Парыжа. На ўсё гэта французскія сяляне адказалі буйным паўстаннем **1358** г. Яно вядома ў гісторыі пад назвай ***Жакерыя*** (ад зняважлівай мянушкі, якую французскія сяляне атрымалі ад сваіх паноў — «Жак-прастак»). Гэта паўстанне было жорстка задушана феадаламі. У Англіі ў **1381** г. каралеўскія чыноўнікі сабралі з сялян пагалоўны падатак. Ён быў павялічаны ў параўнанні з папярэднім годам у 3 разы. Пасля выплаты падатку зборшчыкі прыйшлі да сялян зноў. Адказам на гэта стала сялянскае паўстанне на чале з ***Уотам Тайлерам***. Гэта паўстанне таксама было жорстка задушана.

Правообладатель Народная асвета



Штурм сялянамі замка феадала. *Малюнак сучаснага мастака*

**1.** Якія былі прычыны Стогадовай вайны? Чаму з боку Францыі вайна была вызваленчай? **2.** Раскажыце аб ходзе Стогадовай вайны да пачатку аблогі англічанамі Арлеана. **3.** Раскажыце аб подзвігу Жанны д'Арк. **4.** Якія вынікі Стогадовай вайны? **5.** Чаму падчас Стогадовай вайны адбыліся сялянскія паўстанні ў Францыі і Англіі?

*Гістарычная даведка*

**Войскі англічан і французаў у пачатку Стогадовай вайны**

Англійская армія была невялікай, але вельмі рухомай і баяздольнай. Усе загады ў ёй без пярэчання выконвалі як пехацінцы, так і рыцары. Па камандзе рыцары спешваліся і займалі абарону, не лічачы, што гэта ніжэй за іх годнасць. У войску англічан было шмат лучнікаў з сялян. Яны выдатна валодалі сваімі лукамі. Пушчаная з такога лука страла прабівала даспехі рыцара на адлегласці да 150 метраў!

Французская армія была вялікай, але дрэнна кіруемай. Французскія рыцары лічылі, што на вайне трэба паказаць перш за ўсё ўласную доблесць. Яны не прывыклі выконваць агульныя загады. Рыцары пагардліва глядзелі на пехацінцаў і арбалетчыкаў, якія мелі нязнатнае паходжанне.

Правообладатель Народная асвета

*Якая армія, англійская ці французская, была лепш падрыхтавана да вайны? Чаму Францыя вельмі доўга цярпела паражэнні?*

| Пытанні для параўнання | Англійская армія | Французская армія |
|---|---|---|
| Колькасць вайскоўцаў | | |
| Як выконваліся загады? | | |
| Як былі ўзброены? | | |

## § 5. Англія і Францыя ў другой палове XV ст.

**Успомніце:** **1.** Чым закончылася Стогадовая вайна для Англіі? **2.** Якімі былі вынікі Стогадовай вайны для Францыі? **3.** Якія войны называюць міжусобнымі? **4.** Растлумачце значэнне паняццяў: цэнтралізаваная дзяржава, таварна-грашовая гаспадарка.

**1. Развіццё гаспадаркі ў Англіі і Францыі пасля Стогадовай вайны.** Шматгадовая вайна паміж Англіяй і Францыяй значна запаволіла развіццё гаспадаркі ў абедзвюх краінах. Становішча было даволі складанае. Але Англія і Францыя здолелі пераадолець цяжкасці. Дапамагло ім у гэтым развіццё знешняга гандлю.

У Фландрыі і Паўночнай Італіі было вельмі многа гарадоў. Сельская гаспадарка ў гэтых раёнах Еўропы не магла забяспечыць гарады дастатковай колькасцю прадуктаў. І ў першую чаргу збожжам, з якога выпякалі хлеб. Збожжа сюды прывозілі з-за мяжы. Францыя стала адным з асноўных пастаўшчыкоў збожжа ў Фландрыю і Паўночную Італію.

У гарадах Фландрыі і Паўночнай Італіі значна вырасла вытворчасць сукна. Там ахвотна куплялі англійскую воўну. Яе патрабавалася ўсё больш і больш. Гандаль воўнай даваў англійскім купцам добры даход. Англія вывозіла вельмі шмат воўны, але не ўсю. Нямала воўны прадавалася рамеснікам і перапрацоўвалася ў сукно на месцы. Гэта дало штуршок мануфактурнай вытворчасці ў краіне.

Правообладатель Народная асвета

I ў Англіі і ў Францыі пасля Стогадовай вайны канчаткова зацвердзілася таварна-грашовая гаспадарка. У краінах рэгулярна праходзілі вялікія і малыя кірмашы. На іх прыязджалі купцы не толькі з суседніх гарадоў, але і з суседніх дзяржаў. Каралеўская ўлада імкнулася падтрымаць гандляроў і рамеснікаў сваёй краіны. У Англіі дзейнічаў закон, які прадпісваў англійскаму купцу перавозіць тавары толькі на англійскіх караблях. У Францыі значныя ўступкі ад каралеўскай улады атрымлівалі рамеснікі.



Пунсовая і Белая ружы

**2. Вайна Пунсовай і Белай ружы.** Пасля заканчэння Стогадовай вайны ў Англіі пачалася вайна паміж прыхільнікамі двух феадальных родаў: *Ланкастэраў* і *Йоркаў*. Абодва роды мелі амаль роўныя правы на каралеўскую карону. На ўступкі ісці ніхто не хацеў. У **1455** г. Йоркі паднялі паўстанне супраць караля з роду Ланкастэраў. Пачалася вайна, якая атрымала назву ***вайны Пунсовай і Белай ружы***. Справа ў тым, што на баявым сцягу Ланкастэраў знаходзілася выява пунсовай ружы, а на сцягу Йоркаў — белай ружы.

***Гістарычная даведка***

Вайна Пунсовай і Белай ружы, нягледзячы на прыгожую назву, адрознівалася асаблівай жорсткасцю. Васалы здраджвалі сваім сеньёрам, пераходзячы з лагера ў лагер, туды, дзе ім абяцалі больш шчодрую ўзнагароду. Бітвы завяршаліся бязлітаснымі расправамі над пераможанымі. Вобраз сярэдневяковага рыцара, вернага свайму сеньёру і ідэалам справядлівасці, рыцара, які абараняе слабых, быў разбураны. *(Чаму, на вашу думку, феадалы сталі цаніць грошы і адмовіліся ад рыцарскіх ідэалаў?)*

Правообладатель Народная асвета



Бітва паміж англійскімі рыцарамі.
*Мініяцюра XV ст.*

Вайна паміж Ланкастэрамі і Йоркамі не суправаджалася вялікімі бітвамі. Гэта былі сутычкі конных і пешых атрадаў з невялікай колькасцю ўдзельнікаў. Але ў іх загінула вельмі многа знатных людзей. Некаторыя сем'і феадалаў былі знішчаны поўнасцю. У 1485 г. адбылася апошняя бітва вайны. Яе выйграў ***Генрых VII Цюдар***. Гэта быў далёкі родзіч Ланкастэраў. Ён стаў каралём і заснаваў новую англійскую дынастыю — *Цюдараў*.

За час вайны быў вынішчаны амаль увесь вышэйшы слой знаці. У Англіі не засталося буйных феадалаў, якія змаглі б выступіць супраць караля. Яго прыхільнікі сфарміравалі новы вышэйшы слой знаці. Пасля вайны Пунсовай і Белай ружы каралеўская ўлада ў Англіі ўмацавалася.

**3. Завяршэнне аб'яднання Францыі пад каралеўскай уладай.** Пасля Стогадовай вайны галоўным праціўнікам французскага караля Людовіка XI у справе аб'яднання краіны быў бургундскі герцаг ***Карл Смелы***.

Герцагства Бургундыя складалася з многіх феадальных уладанняў. Тут былі і графствы, і герцагствы, і багатыя гарады. Бургундскія землі паўколам ахоплівалі паўночна-ўсходнюю частку Францыі. Карл Смелы не хацеў падпарадкоўвацца французскаму каралю. Ён імкнуўся пераўтварыць свае землі ў каралеўства. Карл Смелы паводзіў сябе падобна да каралёў. У яго быў самы раскошны двор у Еўропе. Яго армія была адной

Правообладатель Народная асвета

з самых моцных. Падаткі ў бургундскай дзяржаве зацвярджалі не французскія, а бургундскія Генеральныя штаты.

***Гістарычная даведка***

Карл Смелы быў храбрым воінам, за што і атрымаў сваю мянушку. Ён быў самастойным правіцелем, і для яго цяжарам з’яўлялася васальная залежнасць ад французскага караля. Аб тым, якой ён хацеў бачыць Францыю, сведчаць яго словы: «Я так люблю Францыю, што палічыў бы за лепшае, каб у ёй было шэсць каралёў замест аднаго». *(Як вы лічыце, чаму Карл Смелы — васал караля — выступаў супраць улады свайго сеньёра? Якімі былі дзяржаўныя ідэалы Карла Смелага?)*

Яшчэ адным праціўнікам Людовіка XI быў герцаг Брэтані. Герцагі Бургундыі і Брэтані паднялі паўстанне супраць караля. Яны патрабавалі адмены падаткаў. Людовік XI пацярпеў паражэнне. Ён пацвердзіў феадальныя правы герцагаў на іх уладанні. Аднак падаткі кароль не адмяніў.

Людовік XI не здолеў перамагчы Карла Смелага ў адкрытым баі і таму вырашыў дзейнічаць хітрасцю. Людовік падкупіў наёмных салдат, якія служылі ў бургундскага герцага. Падчас адной з бітваў яны здрадзілі Карлу Смеламу, герцаг загінуў. Пасля гібелі Карла Смелага значная частка яго ўладанняў перайшла да французскага караля.



Замак французскага караля XV ст.

***Гістарычная даведка***

Людовік XI быў разумным, дальнабачным, разважлівым каралём. Дзеля ажыццяўлення сваіх дзяржаўных мэт ён мог чакаць гадамі і не грэбаваў ніякімі сродкамі. З ворагамі ён абыходзіўся бязлітасна жорстка. Кароль быў скупы і пазбягаў лішніх расходаў. Але ён не шкадаваў грошай на подкуп здраднікаў. *(Вызначце адрозненне паміж дзяржаўнымі ідэаламі Людовіка XI і Карла Смелага. Якімі сродкамі яны карысталіся ў барацьбе адзін супраць другога?)*

Правообладатель Народная асвета

У выніку ў канцы XV ст. аб'яднанне Францыі практычна завяршылася. Толькі Брэтань захоўвала сваю самастойнасць. Яна ўвайшла ў склад Францыі і стала правінцыяй каралеўства ў 1532 г.



Замак англійскага караля — Таўэр. *Сучасны выгляд*

**1.** Раскажыце аб развіцці гаспадаркі ў Англіі і Францыі пасля Стогадовай вайны. **2.** Што спрыяла ўстанаўленню ў Англіі і Францыі таварна-грашовай гаспадаркі? **3.** Раскажыце аб вайне Пунсовай і Белай ружы ў Англіі. Чаму пасля гэтай вайны ўмацавалася каралеўская ўлада ў краіне? **4.** Ці можна назваць барацьбу паміж Людовікам XI і Карлам Смелым міжусобнай вайной? **5.** Чым адрозніваецца аб'яднанне краіны ад яе цэнтралізацыі?

*Гістарычная крыніца*

**З сачыненняў сярэдневяковага гісторыка**

**Пра Карла Смелага.** Ён прагнуў вялікай славы, што больш за ўсё і штурхала яго да гэтых войнаў, і жадаў быць падобным да тых гасудароў старажытнасці, пра якіх пасля іх смерці гаварылі: ён быў храбры, як ніхто іншы ў яго час. Але вось абарвалася яго жыццё, і ўсё павярнулася да яго... ганьбы, бо захаваць гонар выпадае заўсёды толькі пераможцам.

**Пра Людовіка XI.** Удачлівым ён быў дзякуючы свайму розуму і таму, што не рызыкаваў і не спадзяваўся на перамогі ў бітвах... Крэпасці ён лічыў за лепшае браць нечакана, прычым такія, якія, як ён ведаў, былі дрэнна абаронены... І калі ў варожай крэпасці капітан або хто іншы жадаў уступіць у здзелку і здаць крэпасць за грошы, то ён мог быць упэўнены, што знойдзе ў ім купца, якога не спалохае ніякая, нават вельмі вялікая сума, і ён не будзе скупіцца, пагодзіцца на любую суму.

Правообладатель Народная асвета

## § 6. Германія

**Успомніце:** **1.** Калі і кім была заснавана Свяшчэнная Рымская імперыя? **2.** Чаму ўлада імператараў у Свяшчэннай Рымскай імперыі ў канцы Высокага сярэдневякоўя аслабла? **3.** Растлумачце значэнне паняццяў: палітычная раздробленасць, самакіраванне гарадоў, закон.

**1. Тэрыторыя Германіі.** Каралеўства Германія ўваходзіла ў склад Свяшчэннай Рымскай імперыі. На ўсход ад Германіі знаходзілася каралеўства Чэхія. На поўдзень — гарады Паўночнай Італіі. *(Знайдзіце гэтыя дзяржавы на карце* (гл. с. 7).*)* Каралеўская ўлада ў Германіі была слабай.

Праз Германію праходзілі гандлёвыя шляхі, якія злучалі поўнач і поўдзень Еўропы. Германскія гарады актыўна займаліся гандлем. На поўначы Германіі яны гандлявалі з краінамі Паўночнай Еўропы. Гарады, размешчаныя на Дунаі, гандлявалі з краінамі Паўднёвай Еўропы. Гандаль паміж асобнымі абласцямі Германіі амаль не развіваўся. Таму гарады не былі зацікаўлены ў аб'яднанні краіны.

У Германіі было вельмі шмат феадальных уладанняў. У сваіх землях феадалы мелі шырокія правы і прывілеі. Феадалы не жадалі аб'яднання краіны. Бо ў адзінай Германіі ім давялося б адмовіцца ад часткі правоў на карысць караля.



Герб Свяшчэннай Рымскай імперыі

**2. «Залатая була».** Кароль Германіі выбіраўся з ліку найбольш буйных феадалаў. Ён мог разлічваць толькі на даходы ад сваіх уладанняў. Але іх не хапала на стварэнне моцнай арміі, якая магла б перамагчы атрады буйных

Правообладатель Народная асвета

феадалаў. Тады кароль-імператар прапанаваў самым уплывовым феадалам і епіскапам заключыць з ім пагадненне.

У адпаведнасці з дадзеным пагадненнем феадалы і епіскапы прызнавалі ўладу імператара. Але пры гэтым устанавілі свае правілы яго выбараў. Акрамя таго, імператар пацвярджаў правы буйных феадалаў. Яны па-ранейшаму маглі трымаць ваенныя атрады, здабываць у сваіх землях золата і серабро, чаканіць уласныя манеты, браць плату за перавоз тавараў па сваіх уладаннях.



Імператар і сем вышэйшых феадалаў. *Мініяцюра XV ст.*

Гэтае пагадненне было падпісана ў **1356** г. Тэкст пагаднення быў пераплецены ў прыгожую вокладку, да якой прымацавалі залатую пячатку (ці булу). Таму дакумент пачалі называць ***«Залатой булай»***. «Залатая була» была асноўным законам Свяшчэннай Рымскай імперыі да 1806 г. Яна замацавала раздробленасць Германіі.

**3. Дзяржаўны лад.** На чале Свяшчэннай Рымскай імперыі стаяў імператар. Ён таксама быў германскім каралём. Імператара выбіралі сем чалавек — тры епіскапы, кароль Чэхіі і тры буйныя феадалы. Яны маглі звергнуць імператара і выбраць новага.

*Гістарычная даведка*

У пачатку XIV ст. улада ў імперыі перайшла да дынастыі Люксембургаў. Карл I быў французскім графам Люксембургскім, дзякуючы ж удалай жаніцьбе стаў яшчэ і каралём Чэхіі. У сярэдзіне XIV ст. Карл I быў абраны імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі пад імем Карла IV. *(Як вы думаеце, чаму ў сярэдневяковыі адзін чалавек мог быць адначасова графам Францыі, каралём Чэхіі і імператарам?)*

Правообладатель Народная асвета

Пры германскім каралю існаваў саслоўна-прадстаўнічы сход — ***рэйхстаг***. У яго ўваходзілі буйныя феадалы, епіскапы і прадстаўнікі гарадоў. На пасяджэннях рэйхстага абмяркоўваліся найбольш важныя для жыцця Германіі пытанні. Аднак рэйхстаг не мог прыняць рашэнні, якія былі б абавязковымі для ўсёй краіны, паколькі Германія так і заставалася палітычна раздробленай.

*Гістарычная даведка*

У першай палове XV ст. улада ў імперыі перайшла да дынастыі Габсбургаў, якія былі герцагамі Аўстрыі. Пасля смерці Карла Смелага наследны прынц Габсбургаў ажаніўся з яго дачкой Марыяй. Гэты шлюб прынёс Габсбургам Нідэрланды. Дзякуючы яшчэ аднаму ўдаламу шлюбу яны атрымалі ў пачатку XVI ст. Іспанію. Так Габсбургі сталі ўладарамі самай вялізнай дзяржавы ў Еўропе.

У Германіі ў Познім сярэдневякоўі не было агульных для ўсёй краіны падаткаў. Таму ў адрозненне ад англійскага парламента і французскіх Генеральных штатаў рэйхстаг не даваў згоды на збор каралём-імператарам падаткаў.

**4. Нямецкая вёска.** У Высокім сярэдневякоўі германскія феадалы захапілі землі на ўсходзе Еўропы. Мяжой паміж старымі германскімі землямі і новымі была рака Эльба.

На захад ад Эльбы жылі ў асноўным асабіста свабодныя сяляне. Яны бралі ў буйных землеўладальнікаў за плату вялікія ўчасткі для апрацоўкі. Землі на ўсход ад Эльбы належалі рыцарам, якія іх заваявалі. Шмат земляў было ў свабодных сялян, што сюды перасяліліся.

У перыяд Позняга сярэдневякоўя ў гарадах Фландрыі і Паўночнай Італіі значна ўзрос попыт на збожжа. Рыцары, якія жылі за Эльбай, пачалі рабіць усё для таго, каб атрымаць як мага больш збожжа і прадаць яго. Яны сталі забіраць землі ў сялян і прымушалі іх працаваць на паншчыне. Ураджай, што быў атрыманы, рыцары прадавалі. Германія

Правообладатель Народная асвета



Горад Любек. *Сучасны выгляд*

стала адным з асноўных пастаўшчыкоў збожжа ў Фландрыю.

**5. Ганзейскі саюз.** Гарады Паўночнай Германіі гандлявалі з Англіяй, краінамі Скандынавіі, Маскоўскай дзяржавай. Яны імкнуліся стварыць спрыяльныя ўмовы для свайго гандлю. Для гэтага гарады Паўночнай Германіі аб'ядналіся ў ***Ганзейскі саюз гарадоў***. Гэты саюз таксама называлі проста ***Ганза***. Назва паходзіць ад нямецкага слова, якое азначае «таварыства купцоў». Гарады Ганзы мелі ўласнае войска і агульную казну. Важнейшыя рашэнні прымаліся на з'ездзе прадстаўнікоў усіх гарадоў Ганзы. У XIV ст. Ганза разграміла Данію і прымусіла яе падпісаць выгадны для германскіх гарадоў дагавор. У сярэдзіне XV ст. Ганза аб'ядноўвала каля 100 гарадоў. Ганзейскі саюз абараняў інтарэсы сваіх удзельнікаў, у тым ліку і сілай зброі.

***Гістарычная даведка***

З'езды прадстаўнікоў ганзейскіх гарадоў склікаліся ў горадзе Любек. Герб Любека — арол — стаў сімвалам Ганзы.

**1.** Чаму ў Германіі не было ўмоў для аб'яднання краіны? **2.** Якім дакументам была замацавана раздробленасць Германіі? **3.** Якім быў дзяржаўны лад Германіі ў Познім сярэдневякоўі? **4.** Якімі былі асаблівасці развіцця нямецкай вёскі ў Познім сярэдневякоўі? **5.** Раскажыце пра Ганзейскі саюз гарадоў. **6.** Дайце азначэнне паняццям: «Залатая була», рэйхстаг, Ганза.

Правообладатель Народная асвета

## § 7. Італія

**Успомніце:** **1.** Калі ўтварылася папская дзяржава? **2.** Калі Паўночная Італія ўвайшла ў склад Свяшчэннай Рымскай імперыі? **3.** Чым рэспубліка адрозніваецца ад манархіі? **4.** Растлумачце значэнне паняццяў: авіньёнскі «палон» пап, рамесная майстэрня, мануфактура.

**1. Паўночная Італія.** Паўночная Італія ўваходзіла ў склад Свяшчэннай Рымскай імперыі. Улада імператара ў ёй была слабай. Гарады Паўночнай Італіі з'яўляліся самастойнымі дзяржавамі. Самымі буйнымі гарадамі-дзяржавамі былі ***Фларэнцыя, Мілан, Венецыя, Генуя***. *(Знайдзіце гэтыя гарады на карце на с. 7.)* Праз Паўночную Італію пралягалі гандлёвыя шляхі, якія звязвалі краіны Заходняй Еўропы і краіны Усходу. Гарады Паўночнай Італіі наладжвалі сувязі з далёкімі краінамі і зусім не звярталі ўвагі на суседнія італьянскія гарады.

**2. Гаспадарчае развіццё Паўночнай Італіі.** Гаспадарчае развіццё Паўночнай Італіі адрознівалася ад развіцця астатняй Заходняй Еўропы. Большая частка сялян тут атрымала асабістую свабоду яшчэ ў Высокім сярэдневякоўі. Гарады Паўночнай Італіі жылі і багацелі за кошт рамяства і гандлю, таму былі зацікаўлены ў стварэнні спрыяльных умоў для развіцця гэтых галін гаспадаркі.

Значная роля пры гэтым належала гандлю англійскай воўнай. Італьянскія купцы, што яе дастаўлялі, нядрэнна на ёй зараблялі. Напрыклад, адзін купец з Генуі даставіў у горад два караблі англійскай воўны. Пасля яе продажу ён атрымаў тысячу фларынаў (залатых манет) прыбытку. І гэта былі вялікія грошы, калі ўлічыць, што купец купіў дом у Парыжы за шэсць-



Герб Генуі



Герб Венецыі

Правообладатель Народная асвета



Венецыянскі карабель. *Рэканструкцыя*



Генуэзскі карабель. *Рэканструкцыя*

сот фларынаў. Між іншым свайму памочніку, які адказваў за справы гандлю, ён плаціў усяго сто фларынаў у год.

Купцы прадавалі воўну рамеснікам. Сукно з англійскай воўны каштавала ў два разы даражэй, чым з мясцовай. У гарадах Паўночнай Італіі былі скасаваны цэхавыя абмежаванні. Майстрам дазвалялі павялічваць колькасць станкоў. Гэта давала магчымасць вырабіць больш сукна. У Заходняй Еўропе попыт на італьянскае сукно пастаянна рос. Яго патрабавалася намнога больш, чым маглі вырабіць рамесныя майстэрні.

У гарадах Паўночнай Італіі пачалі стварацца ***мануфактуры***. Яны выпрацоўвалі сукна больш за рамесныя майстэрні. У Паўночнай Італіі адбыўся пераход ад рамеснай вытворчасці да мануфактурнай.

*Гістарычная даведка*

**Задача з «Хронікі» Джавані Вілані.** У 1308 г. 300 майстэрань выраблялі ў год з мясцовай воўны 100 000 кавалкаў сукна коштам 600 000 фларынаў. У 1338 г. 200 майстэрань выраблялі ў год з англійскай воўны 80 000 кавалкаў сукна коштам 1 200 000 фларынаў. *(Падлічыце, наколькі выраслі прадукцыйнасць працы і гадавы даход адной майстэрні.)*

**3. Венецыя і Генуя.** ***Венецыя*** (Рэспубліка святога Марка) і ***Генуя*** (Рэспубліка святога Георгія) разбагацелі за кошт гандлю. У іх былі вялізныя ўладанні за межамі Італіі. Там

Правообладатель Народная асвета



Палац правіцеляў Венецыі — дожаў. *XIV—XV стст.*

будаваліся магутныя крэпасці для абароны зручных портаў і складоў. У гэтыя крэпасці купцы прывозілі свае тавары і прадавалі іх.

Купцы Венецыі і Генуі пастаянна сапернічалі паміж сабой. У самым канцы XIII ст. іх гандлёвае саперніцтва перарасло ў вайну. У вайне перамагла Генуя. Яна амаль 100 гадоў панавала на гандлёвых шляхах Міжземнамор'я. У канцы XIV ст. Генуя і Венецыя зноў ваявалі. На гэты раз перамагла Венецыя і выцесніла Геную з Усходняга Міжземнамор'я. Пасля гэтага пачаўся заняпад Генуі.

Свайго росквіту Венецыя дасягнула ў XV ст. Яна стала вельмі багатай, яе гандлёвы флот налічваў 3000 суднаў. Сам жа горад стаў адным з прыгажэйшых у Заходняй Еўропе.

**4. Папская дзяржава.** У Высокім сярэдневякоўі Рым уваходзіў у склад папскай дзяржавы. Аднак у пачатку XIV ст. рэзідэнцыя пап была перанесена ў Авіньён. Іх улада над Рымам аслабла. Рымляне неаднаразова падымалі паўстанні. Яны хацелі вызваліцца ад папскай улады і ўстанавіць у Рыме рэспубліку. Паўстанні былі задушаны. Папы рымскія, якія знаходзіліся ў Авіньёне, рашылі аднавіць уладу над сваімі ўладаннямі ў Італіі. Для гэтага ў Рым быў накіраваны спецыяльны пасланнік.

Дзе перакананнем, а дзе і сілай зброі папскі пасланнік падпарадкаваў гарады, якія раней належалі папскай дзяржаве. Яны прызналі вярхоўную ўладу папы. У 1357 г. папскі пасланнік, прадстаўнікі феадалаў і духавенства прынялі спецыяльныя пастановы. Гэты дакумент вядомы як *«канстытуцыя»* папскай дзяржавы. Згодна з «канстытуцыяй» папская дзяржава была падзелена на сем абласцей *(правінцый)*. На чале правінцый стаялі чыноўнікі, якіх прызначыў

Правообладатель Народная асвета

папа рымскі. Знаць, духавенства і гарады правінцый маглі выдаваць законы і збіраць падаткі. Папская дзяржава стала цэнтралізаванай. «Канстытуцыя» дзейнічала да 1816 г. *(Падлічыце, колькі стагоддзяў дзейнічала «канстытуцыя» папскай дзяржавы.)*

**5. Паўднёвая Італія.** У паўднёвай частцы Апенінскага паўвострава знаходзілася ***Неапалітанскае каралеўства***. У Познім сярэдневякоўі каралеўская ўлада тут амаль увесь час была вельмі слабай. Краіна фактычна распалася на мноства дробных феадальных уладанняў. Гаспадарчае жыццё каралеўства замерла. Усё тут было так жа, як і ў Высокім сярэдневякоўі. Гарады поўнасцю залежалі ад сеньёраў, рамяство і гандаль былі развіты слаба. Большая частка сялян знаходзілася ў феадальнай залежнасці. Насельніцтва цярпела ад непасільных падаткаў. Неапалітанскае каралеўства прыйшло ў заняпад. У 1442 г. яго заваяваў кароль пірэнейскай дзяржавы Арагон.

**1.** Ахарактарызуйце развіццё гарадоў Паўночнай Італіі ў Познім сярэдневякоўі. **2.** Чаму гарады Паўночнай Італіі і Германіі не былі зацікаўлены ў моцнай імператарскай уладзе ў Свяшчэннай Рымскай імперыі? **3.** Раскажыце аб адносінах Венецыі і Генуі ў Познім сярэдневякоўі. **4.** У чым заключалася сутнасць «канстытуцыі» папскай дзяржавы? **5.** Чаму Неапалітанскае каралеўства ў Познім сярэдневякоўі адставала ў гаспадарчым развіцці ад гарадоў Паўночнай Італіі?

***Гістарычная даведка***

**Фларэнцыя ў лічбах у 1336—1338 гг. (паводле «Хронікі» Джавані Вілані).** Даходы (падатковыя зборы) — 300 000 фларынаў. Выдаткі — 40 000 фларынаў (без уліку выдаткаў на армію, рамонт гарадскіх сцен, мастоў, цэркваў). Жыхароў (мужчыны, жанчыны, дзеці) — 90 000 чалавек. Дзяцей, што ўмеюць чытаць, — каля 10 000 чалавек. Цэркваў — 110. Вытворчасцю воўны занята — 30 000 чалавек. Суддзяў — 80. Урачоў і хірургаў — 60. Аптэк — 100. Пякарняў — 146. *(Аб чым гавораць прыведзеныя ў дакуменце лічбы? Якія з іх сведчаць пра багацце Фларэнцыі ў XIV ст.?)*

Правообладатель Народная асвета

## § 8. Іспанія і Партугалія

**Успомніце:** **1.** Калі Пірэнейскі паўвостраў быў захоплены арабамі? **2.** Якія рэлігійныя войны адбываліся ў Высокім сярэдневякоўі? **3.** Растлумачце значэнне паняццяў: Рэканкіста, саслоўе, саслоўна-прадстаўнічая манархія.

**1. Кастылія, Арагон і Партугалія.** На тэрыторыі Пірэнейскага паўвострава яшчэ ў Раннім і Высокім сярэдневякоўі ўтварылася некалькі дзяржаў. Галоўная роля сярод іх належала Арагону, Кастыліі і Партугаліі.

У Высокім сярэдневякоўі Партугалія была заснавана як графства ў складзе Кастыліі. Затым Партугалія стала самастойным каралеўствам. Яе жыхары лічылі сябе асобным ад кастыльцаў народам, паколькі размаўлялі на сваёй мове. У XIV ст. Кастылія паспрабавала далучыць Партугалію. Аднак партугальцы разграмілі кастыльцаў. Так Партугалія адстаяла сваю незалежнасць.




Фердынанд Арагонскі і Ізабела Кастыльская. *Мініяцюра рубяжа XV—XVI стст.*

**2. Утварэнне Іспаніі.** У XV ст. адбылося аб'яднанне Кастыліі і Арагона. У 1469 г. прадстаўнікі іх каралеўскіх сем'яў узялі шлюб. Сястра кастыльскага караля Ізабела выйшла замуж за сына арагонскага караля Фердынанда. Пасля гэтага шлюбу склаліся спрыяльныя ўмовы для аб'яднання двух каралеўстваў пад уладай адной дынастыі.

У **1479 г.** Фердынанд стаў каралём Арагона. Ізабела да гэтага часу ўжо была кастыльскай каралевай. У выніку Кастылія і Арагон аб'ядналіся і ўтварылі новую дзяржаву — ***Іспанію***.

**3. Завяршэнне Рэканкісты.** На паўднёвым усходзе Пірэнейскага паўвострава знаходзілася апошняя мусульманская дзяржава Гранада. На мяжы па-

Правообладатель Народная асвета

між ёй і Кастыліяй час ад часу ўспыхвалі сутыкненні. Кастыльская армія пачала шматгадовую аблогу Гранады. У самым пачатку **1492** г. горад паў. Рэканкіста закончылася. Пірэнейскі паўвостраў стаў поўнасцю хрысціянскім. *(Успомніце, у якім стагоддзі пачалася Рэканкіста. Хто, акрамя мясцовага хрысціянскага насельніцтва, у ёй удзельнічаў?)*



Арабскі і хрысціянскі рыцары. *Мініяцюра XIII ст.*

**4. Гаспадарчае развіццё Іспаніі і Партугаліі.** Вы ўжо ведаеце, што ў перыяд Позняга сярэдневякоўя ў гарадах Фландрыі і Паўночнай Італіі вырас попыт на воўну і збожжа.

У Іспаніі яшчэ з часоў Высокага сярэдневякоўя гадавалі авечак і прадавалі воўну. У Познім сярэдневякоўі тут вывелі новую пароду авечак-мерыносаў. Гэтыя авечкі давалі вельмі добрую доўгую воўну. Яе ахвотна куплялі ўладальнікі мануфактур у іншых краінах Заходняй Еўропы. Іспанскія рамеснікі таксама хацелі купляць гэтую воўну. Але кошт яе быў надта высокі. У выніку Іспанія вывозіла амаль усю воўну. Іспанскія рамеснікі заставаліся без сыравіны і разараліся.

Партугалія таксама вывозіла свае тавары. Але ў адрозненне ад Іспаніі яна вывозіла не воўну, а збожжа. На збожжа ў Заходняй Еўропе быў вялікі попыт. Каралі Партугаліі ўлічвалі інтарэсы сваіх купцоў. Таму асноўная вытворчасць збожжа была сканцэнтравана каля партовых гарадоў.

Каля паўночна-заходніх берагоў Афрыкі партугальцы адкрылі і засялілі востраў Мадэйра. Тут яны пачалі вырошчваць цукровы трыснёг. Раней у Еўропе гэту расліну не вырошчвалі. Сабраны на востраве ўраджай вывозіўся ў Партугалію. Гэта быў першы прыклад развіцця гаспадаркі ў заморскіх уладаннях у гісторыі Заходняй Еўропы.

Правообладатель Народная асвета



Герб Партугаліі

**5. Дзяржаўны лад Іспаніі і Партугаліі. Ідальга.** У Іспаніі і Партугаліі ў Познім сярэдневякоўі склалася моцная каралеўская ўлада. У абедзвюх краінах былі задушаны паўстанні буйных феадалаў. Але спаганяць падаткі іспанскія і партугальскія каралі маглі толькі пасля атрымання згоды саслоўяў. Сходы прадстаўнікоў феадалаў і гарадоў у Іспаніі і Партугаліі называліся ***картэсы***.

Рэканкіста працягвалася на Пірэнейскім паўвостраве некалькі стагоддзяў. Галоўную ролю ў ёй адыгрывалі рыцары. У Іспаніі іх называлі ***ідальга***. Свяшчэнным абавязкам ідальга была абарона радзімы, хрысціянскай веры і пакрыўджаных людзей. Ідальга забаранялася выконваць любую работу за грошы.

Але нарэшце Рэканкіста закончылася. Атрады буйных феадалаў былі распушчаны. Ваяваць больш не было з кім. Дзе ж узяць грошы на жыццё? Такія пытанні паўсталі перад тысячамі іспанскіх ідальга. Пасля адкрыцця Амерыкі шмат хто з іх накіраваўся на заваяванне Новага свету.

**1.** Назавіце дзяржавы Пірэнейскага паўвострава Ранняга і Высокага сярэдневякоўя. **2.** Ад каго Партугалія адстаяла сваю незалежнасць у XIV ст.? **3.** Калі і як утварылася дзяржава Іспанія? **4.** Раскажыце аб гаспадарчым развіцці Іспаніі і Партугаліі ў Познім сярэдневякоўі. **5.** Якім быў дзяржаўны лад Іспаніі і Партугаліі? **6.** Хто такія ідальга? Раскажыце пра іх.

Правообладатель Народная асвета

## § 9. Вытокі Адраджэння і гуманізму

**Успомніце: 1.** Спецыялістаў якіх прафесій рыхтавалі ў сярэдневяковых універсітэтах? **2.** Што такое «Каралінгскае адраджэнне»? **3.** Дзе ўзніклі першыя мануфактуры?

**1. Узнікненне культуры Адраджэння.** У Познім сярэдневякоўі зарадзіўся новы тып культуры — ***культура Адраджэння***. Яна атрымала развіццё і ў далейшым, у эпоху Новага часу. *(Успомніце, калі пачынаецца эпоха Новага часу.)* Таму XIV—XV стст. прынята называць ***Раннім Адраджэннем***.

Культура Адраджэння зарадзілася ў гарадах Паўночнай Італіі. У іх бурна развіваўся гандаль, мануфактурная вытворчасць. Многія купцы і ўладальнікі мануфактур хутка багацелі. У гарадах Паўночнай Італіі з'явіліся банкі. (**Банкі** — *установы, якія ажыццяўляюць грашовыя разлікі і захоўваюць грашовыя зберажэнні.*) У банках Фларэнцыі пазычалі грошы многія манархі Еўропы.

Гарады Паўночнай Італіі даўно былі рэспублікамі. Улада ў іх належала самым багатым купцам, банкірам і ўладальнікам мануфактур. Гэтых людзей не задавольваў погляд на чалавека, як на грэшную істоту, якая жыве толькі надзеяй



Фларэнцыя. *Мініяцюра XV ст.*

Правообладатель Народная асвета

на выратаванне пасля смерці. Яны хацелі жыць прыгожа і атрымліваць асалоду ад зямнога жыцця. Свае грошы яны ўкладвалі не толькі ў вытворчасць і грашовыя аперацыі. Вялікія сродкі траціліся на будаўніцтва раскошных дамоў, адукацыю дзяцей, пакупку кніг, карцін, скульптур. І, зразумела, ім хацелася бачыць сябе на карцінах вядомых мастакоў, у творах выдатных пісьменнікаў і паэтаў.

Уладальнікі мануфактур, купцы, банкіры глядзелі на навакольны свет не так, як феадалы. Для феадалаў асноўнымі крыніцамі багацця былі войны, захопы чужых зямель, на якіх пад прымусам працавалі сяляне. А для заняткаў вытворчасцю, гандлем, грашовымі аперацыямі патрабаваліся зусім іншыя ўменні і якасці чалавека. Неабходны былі перш за ўсё вялікія веды. І не толькі ў галіне матэматыкі, тэхнікі, геаграфіі, замежных моў і звычаяў. Патрабаваліся веды пра самога чалавека, пра грамадскі лад, пра адносіны паміж людзьмі ў грамадстве. Бо тыя адносіны, якія склаліся ў феадальнай Еўропе, гарадскіх багачоў не задавальнялі. Вось чаму сярод іх пачалі асабліва ценіцца настаўнікі і прафесары, архітэктары і мастакі, вучоныя і інжынеры, урачы і юрысты. Тыя, хто меў гэтыя прафесіі, складалі асобую групу людзей, якія займаліся разумовай працай, — ***інтэлігенцыю*** (ад лацінскага слова «інтэлектус» — пазнанне, розум).



Палацца Век'ё ў Фларэнцыі. *1299—1301 гг.*

У вузкіх колах інтэлігентаў-мысліцеляў пачалі па-новаму глядзець на гістарычны шлях чалавецтва. Феадальныя адносіны панавання — падпарадкавання паміж людзьмі яны лічылі прымітыўнымі, адсталымі. Ідэалам грамадства для іх выступалі старажытныя Афіны і Рымская рэспубліка. А калектыў свабодных грама-

Правообладатель Народная асвета

дзян з роўнымі правамі і роўнасцю ўсіх перад законам уяўляўся вышэйшай формай чалавечых адносін. Зразумела, што сярэдневякоўе гэтыя мысліцелі лічылі вялікім заняпадам, а сябе — прадаўжальнікамі традыцый антычнасці, якія адраджаюць іх. Таму сваю культуру яны называлі ***Адраджэннем***.

**2. Гуманізм.** У цэнтры ўвагі мысліцеляў Адраджэння знаходзіўся чалавек ва ўсіх праявах яго жыцця. Іх сталі называць ***гуманістамі***, таму што яны вывучалі «чалавечую прыроду» (ад лацінскага слова «гуманітас»). Вучэнне мысліцеляў Адраджэння аб чалавеку атрымала назву ***гуманізм***. Выраз «Чалавек — каваль свайго шчасця» стаў дэвізам гуманістаў. Культура Адраджэння пачала сваё пераможнае шэсце па Еўропе. *(У чым адрозненне культуры Адраджэння ад «Каралінгскага адраджэння»?)*

У Познім сярэдневякоўі тое, што больш за ўсё хвалявала людзей антычнасці — грамадзянін і свабода, чалавек і лёс, людзі і багі, — зноў стала блізкім і зразумелым. Зноў загаварылі аб мудрацах антычнасці, гісторыі Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма. Людзей пачалі зачароўваць легенды і міфы грэкаў, цікавіць учынкі вялікіх грамадзян Грэцыі і Рыма. Людзі, здавалася, абудзіліся ад тысячагадовага сну. У грамадстве ўсталяваўся і стаў аб'ектам пераймання новы лад жыцця. Яго асноўнымі рысамі былі актыўнасць, практычнасць, дапытлівасць.

***Гістарычная даведка***

У эпоху Адраджэння добра адукаваным і культурным лічыўся чалавек, які: разбіраўся ў мастацтве; быў калекцыянерам прадметаў антычнасці; ведаў творы антычных мысліцеляў; чытаў і пісаў па-грэчаску або па-лацінску; размаўляў на некалькіх мовах; умеў складаць вершы і іграць на музычным інструменце; ездзіў вярхом; цікавіўся штодзённым жыццём і палітыкай; меў добрыя манеры; цаніў час і ўцехі. *(Якія з гэтых якасцей і ўменняў высока цаніліся грамадзянамі Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма?)*

Правообладатель Народная асвета

Культура Адраджэння, зразумела, не была простым паўтарэннем узораў антычнасці. Гэта была новая культура, паколькі яна выйшла з нетраў сярэдневякоўя, з'яўлялася глыбока хрысціянскай. Усе гуманісты былі веруючымі людзьмі, хрысціянамі. Культура Адраджэння стала параджэннем еўрапейскага горада, культурай новага грамадства, якое ішло на змену феадальнаму.


Дантэ.
*Фрэска XV ст.*

**3. Дантэ.** Італьянскі паэт і мысліцель ***Дантэ Аліг'еры*** (1265—1321 гг.) стаяў ля вытокаў Адраджэння. Яго творчасць была нібы пераходнай ступенькай ад старой сярэдневяковай культуры да новай. Цяжкі быў лёс паэта. Дантэ нарадзіўся і вырас у Фларэнцыі. У конным страі, у рыцарскім узбраенні ён удзельнічаў у бітвах за свой горад. Але затым, калі да ўлады ў Фларэнцыі прыйшлі яго праціўнікі, Дантэ быў прыгавораны да спалення на кастры. Ён уцёк з роднага горада.

Да канца жыцця Дантэ вандраваў па іншых гарадах і краінах і памёр на чужыне. У выгнанні ён і напісаў свае паэтычныя творы. У іх Дантэ заклікаў да аб'яднання Італіі.

Галоўная праца Дантэ — паэма «*Боская камедыя*». Сам Дантэ назваў яе проста «Камедыя», але захопленыя сучаснікі дадалі да назвы слова «боская». У паэме Дантэ апісвае сваё фантастычнае падарожжа ў пекла і рай у суправаджэнні старажытнарымскага паэта Вяргілія. У пекле яны бачаць душы грэшнікаў, якія пакутуюць. Але Дантэ і яго спадарожнік не асуджаюць тых грэкаў і рымлян, хто трапіў у пекла з-за язычніцтва і вальнадумства, імкнення да ведаў і свабоды.

**4. Мастакі Джота і Мазачыо.** Гуманістычны ідэал чалавека знайшоў сваё адлюстраванне ў творчасці мастакоў ужо ў самым пачатку Ранняга Адраджэння.

Правообладатель Народная асвета

Першым буйным майстрам новага жывапісу стаў мастак з Фларэнцыі ***Джота*** (1266—1337 гг.) На сваіх фрэсках і карцінах ён адлюстроўваў у асноўным біблейскія сюжэты. Але пад яго пэндзлем яны ажывалі, напаўняліся новым сэнсам. Ісус Хрыстос, Багародзіца і святыя нібы звярталіся да гледача, станавіліся саўдзельнікамі іх жыцця. Тым самым Джота ствараў аблічча свету, якое адлюстроўвала рэальнасць. Інакш кажучы, з евангельскіх сюжэтаў на абразах ён ствараў карціны.

Джота адным з першых мастакоў Позняга сярэдневякоўя маляваў аб'ёмна і паглыбляў прастору карціны. Фігуры людзей у яго не плоскія, яны выглядаюць як жывыя. Пры гэтым Джота выдатна адлюстроўваў чалавечыя пачуцці.

Новыя прыёмы жывапісу Джота развіў яшчэ адзін мастак з Фларэнцыі — ***Мазачыо*** (1401—1428 гг.). Ён пражыў усяго 27 гадоў. Але на яго карцінах вучыліся многія пакаленні мастакоў. Мазачыо выдатна адлюстроўваў размяшчэнне фігур у прасторы: за гарызонтам горы, лес, удалячынь адплываюць аблокі. Да аб'ёму і прасторы ў адлюстраванні прыроды Мазачыо дадаў дакладнае адлюстраванне прапорцый чалавечага цела.

Фларэнтыйскія мастакі Джота і Мазачыо з'яўляюцца заснавальнікамі Адраджэння ў выяўленчым мастацтве.



Джота. Уцёкі ў Егіпет. *Фрэска*



Мазачыо. Падатак. *Фрэска*

Правообладатель Народная асвета

**1.** Якая культура зарадзілася ў Заходняй Еўропе ў XIV—XV стст.? **2.** Чаму культура Адраджэння ўзнікла менавіта ў Паўночнай Італіі? **3.** Чаму свой ідэал чалавечага грамадства гуманісты бачылі не ў феадальным грамадстве, а ў Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме? **4.** Чаму дэвізам гуманістаў стаў выраз: «Чалавек — каваль свайго шчасця»? **5.** Чаму культура Адраджэння не была простым зваротам да антычнасці, а новай формай культуры? **6.** Што новага ў светапогляд сярэдневяковага чалавека імкнуўся ўнесці Дантэ? **7.** Якія ідэалы гуманістаў выявіліся ў жывапісе Ранняга Адраджэння? Дайце азначэнне паняццям: Ранняе Адраджэнне, гуманізм.

## § 10. Мысліцелі, паэты і пісьменнікі Адраджэння

**Успомніце:** **1.** Якія гарады-рэспублікі існавалі на тэрыторыі Італіі ў Познім сярэдневякоўі? **2.** Хто такія гуманісты? **3.** Дайце тлумачэнне паняцця «інтэлігенцыя». **4.** Якія асноўныя правы мелі грамадзяне старажытных Афін?

**1. Петрарка.** Сярод першых італьянскіх гуманістаў найбольш вядомым быў ***Франчэска Петрарка*** (1304—1374 гг.). Яго бацька быў выгнаны з Фларэнцыі палітычнымі праціўнікамі. Пасля вандраванняў сям'я пасялілася ў Авіньёне. Франчэска вучыўся ва універсітэтах Францыі і Італіі, затым вярнуўся ў Авіньён. Толькі ў канцы жыцця Петрарка пасяліўся ў Італіі. *(Вызначце, ці быў Петрарка сучаснікам «авіньёнскага палону» пап.)*



Петрарка. *Фрэска XV ст.*

Петрарку часта называюць першым інтэлігентам, паколькі ён адным з першых пачаў займацца толькі разумовай працай. Папы рымскія прапаноўвалі яму заняць розныя высокія пасады. Але ён адмаўляўся, аддаючы перавагу не багаццю, а заняткам паэзіяй і навукай.

Правообладатель Народная асвета


Турнір паэтаў. *Карціна XIX ст.*

Яшчэ ў маладосці Петрарка стаў лепшым знаўцам антычнай гісторыі і літаратуры. Ён збіраў рукапісы старажытнагрэчаскіх і рымскіх аўтараў. Петрарка здолеў знайсці працы больш чым 30 старажытных мысліцеляў і пісьменнікаў. Ён напісаў біяграфіі многіх вялікіх людзей антычнасці.

Славу Петрарку прынеслі яго вершы і паэмы. Ён пісаў не толькі на латыні, але быў адным са стваральнікаў *італьянскай літаратурнай мовы*. За вялікія заслугі Петрарку ўзнагародзілі лаўровым вянком у Рыме. У паэме «Італія мая» паэт з горыччу апісвае бедствы раздробленай краіны. Горача заклікае да яе аб'яднання.

Петрарка лічыў, што чалавека робяць вялікім яго адукаванасць, заняткі навукай, веданне гісторыі і культуры чалавецтва. Гэтай велічы кожны чалавек павінен дасягнуць сам, сваёй працай. І ніякія тытулы продкаў, нават каралеўскае паходжанне, самі па сабе не могуць зрабіць чалавека вялікім і праславіць яго. Ён высмейваў раскошу і гультайства феадалаў. Працы і вершы Петраркі сталі шырока вядомы не толькі ў Італіі, але і па ўсёй Еўропе. Яны былі асновай для творчасці наступных мысліцеляў і паэтаў Адраджэння.

**Гістарычная даведка**

Петрарка асуджаў войны, ваяўнічасць феадалаў. Ён пісаў: «Не лічу, што грудзі і галава, закрытыя жалезам, прыгажэйшыя за мірныя і не абароненыя жалезам». А на ганарлівы выкрык: «Я — правадыр на вайне, праслаўлены перамогамі!» — адказваў: «Лепш быць правадыром міру».

Правообладатель Народная асвета

**2. Бакачыо.** Славуты пісьменнік і паэт ***Джавані Бакачыо*** (1313—1375 гг.) нарадзіўся ў сям'і купца, жыў у Неапалі і Фларэнцыі. Ён захапляўся творчасцю Дантэ і Петраркі. Бакачыо напісаў шмат вершаў і раманаў на лацінскай і італьянскай мовах.

Сусветную славу яму прынёс твор «Дэкамерон», які быў напісаны на гутарковай італьянскай мове. У ім змешчана 100 розных гісторый з жыцця людзей. Апавядальнікамі гэтых гісторый пісьменнік зрабіў 10 юнакоў і дзяўчат, якія схаваліся ад эпідэміі чумы ў Фларэнцыі ў 1348 г. Бавячы вольны час, яны на працягу 10 дзён па чарзе расказвалі займальныя гісторыі. Гэта былі вясёлыя і сумныя гісторыі пра здарэнні са штодзённага жыцця людзей з самых розных слаёў грамадства: феадалаў, гараджан, сялян, манахаў. У іх усхваляліся розум і знаходлівасць людзей, уменне выходзіць з самых цяжкіх сітуацый. Бакачыо ўслаўляў лепшыя чалавечыя пачуцці, імкненне чалавека да шчасця.

У «Дэкамероне» востра крытыкаваліся прытворная набожнасць, абжорства і імкненне да ўцех некаторых святароў і манахаў. Бакачыо раілі спаліць сваю кнігу, каб не наклікаць на сябе гнеў царквы, але ён адмовіўся. Бакачыо захапляўся антычнасцю. У адной са сваіх кніг ён пераказаў мноства старажытнагрэчаскіх міфаў аб язычніцкіх багах. Гэта быў смелы ўчынак для таго часу.



Бакачыо. *Фрэска XV ст.*

**3. Італьянскія гуманісты пра чалавека і грамадства.** У аснове вучэння гуманістаў знаходзілася цікавасць да чалавека. Італьянскі мысліцель XV ст. ***Манэці*** сцвярджаў, што чалавек — гэта цудоўнейшая, мудрэйшая і магутнейшая істота. Па яго словах, «веды — гэта самая каштоўная ўласцівасць чалавека». Нават чалавечае цела — гэта «самае цудоўнае

Правообладатель Народная асвета

з усіх тварэнняў прыроды». Такія погляды гуманістаў супярэчылі вучэнню царквы таго часу. Паколькі царква даказвала, што чалавек — істота грэшная, ён павінен пастаянна маліцца аб дараванні грахоў, абмяжоўваць свае жаданні і патрэбнасці. Сярэдневяковыя мастакі пазбягалі маляваць здаровае чалавечае цела. Святыя і мучанікі выглядалі змoранымі, на іх тварах адлюстраваны былі цялесныя пакуты і мукі.

*Гістарычная крыніца*

**З кнігі папы Інакенція III «Аб пагардзе да свету, або нікчэмнасці чалавека».** Планеты і зоркі Гасподзь Бог стварыў з агню, вецер і буры — з паветра, рыб і птушак стварыў з вады, людзей і жывёлу — з праху. Параўноўваючы сябе з жыхарамі вады, чалавек спасцігае, што ён нікчэмны, разглядаючы нябесныя стварэнні, пазнае, што яшчэ больш нікчэмны, разглядаючы створаных з агню, прыходзіць да думкі, што больш нікчэмнага за яго няма... Усе дні чалавека поўныя працай і смуткам, і нават не адпачывае розум яго. І што гэта, калі не мітусня? Наўрад ці ёсць што-небудзь такое нікчэмнае, наўрад ці ёсць такое лёгкае, што чалавек разумеў бы поўнасцю, што ён спасцігаў бы ясна.

Гуманісты ж заклікалі чалавека атрымліваць асалоду ад жыцця. На карцінах і ў скульптурах майстроў Адраджэння зноў, як і ў антычнасці, паказаны фізічна развіты, прыгожы чалавек. І гэты чалавек, згодна з вучэннем гуманістаў, павінен імкнуцца да ўсіх радасцей зямнога жыцця, а не зводзіць яго сэнс толькі да дасягнення шчасця ў раю пасля смерці. Пры гэтым гуманісты заставаліся веруючымі людзьмі і лічылі чалавека вяршыняй тварэння Бога. Яны не выступалі супраць царквы, але асуджалі толькі асобныя заганы — «тоўстых манахаў», «сквапных епіскапаў».

Гуманісты лічылі чалавека грамадскай істотай. У адрозненне ад жывёл чалавек жыве ў грамадстве разам з іншымі людзьмі, дзе дзейнічаюць агульныя для ўсіх правілы і законы. Гуманіст ***Альберці*** пісаў, што чалавек — гэта творца, бо ён працуе і гэтым уладкоўвае сваё жыццё. Гуманісты асуджа-

Правообладатель Народная асвета

лі пагарду феадалаў да фізічнай працы. Яны лічылі працу абавязковай для ўсіх. Багацце, створанае ўласнай працай, гуманісты ўслаўлялі, але прагу нажывы і марнае назапашванне грошай яны асуджалі. Манэці пісаў, што сваёй працай чалавек паляпшае і ўпрыгожвае прыроду. Менавіта людской працай, а не войнамі або гультайствам узараныя пашы, пабудаваныя гарады. Гуманісты лічылі галоўнымі якасцямі чалавека веды і абавязковую працу для дабрабыту грамадства.

Манархію, феадальныя адносіны гуманісты лічылі не вартымі чалавечай годнасці. Найлепшай формай дзяржаўнага ладу была, на іх погляд, рэспубліка. Гуманіст ***Бруні*** ў Фларэнцыі першай паловы XV ст. змагаўся за роўнасць усіх грамадзян перад законам, за права кожнага чалавека выбіраць прадстаўнікоў улады і самому быць выбраным. Гуманісты ўслаўлялі чалавека, які прыносіць карысць сваёй айчыне. Тых жа, хто нічога не зрабіў для сваёй радзімы, гуманісты называлі «бескарыснымі грамадзянамі».

**1.** Раскажыце пра жыццё і творчасць Франчэска Петраркі. Што зрабіў ён для роднай Італіі? **2.** Чаму Бакачыо напісаў свой «Дэкамерон» не на латыні, а на гутарковай італьянскай мове? Ці магла інквізіцыя судзіць Бакачыо за яго твор? **3.** У чым гуманісты разыходзіліся з тагачасным вучэннем царквы пра чалавека? А што ў іх поглядах было агульнага з вучэннем царквы? **4.** Якія якасці чалавека гуманісты лічылі галоўнымі? **5.** Каго лічылі гуманісты «бескарыснымі грамадзянамі»?

***Гістарычная крыніца***

**З кнігі гуманіста Піка дэла Мірандалы «Аб годнасці чалавека» (XV ст.).** О дзівоснае і ўзвышанае прызначэнне чалавека, якому дадзена дасягнуць таго, да чаго ён імкнецца, і быць тым, чым ён хоча! Бог стварыў чалавека, каб ён разумеў законы Сусвету, любіў яго прыгажосць, дзівіўся яго веліччу. Чалавек можа расці і ўдасканальвацца па свабоднай волі. *(У чым асноўнае разыходжанне паміж поглядамі на чалавека папы Інакенція III і Піка дэла Мірандалы?)*

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная крыніца*

**З трактата фларэнтыйскага гуманіста Джаноца Манэці «Аб годнасці і перавазе чалавека» (XV ст.).** Нядзіўна, калі старажытныя і новыя вынаходнікі высакародных мастацтваў... не знайшоўшы вобраза, больш прыгожага за чалавечы, пагадзіліся, відаць, у тым, каб багоў ляпілі або малявалі ў выглядзе людзей...

Але да гэтай пары гаворка ішла пра аблічча, а што сказаць аб тонкім і вострым розуме гэтага настолькі прыгожага і вытанчанага чалавека? Праўда ж, гэты розум такі магутны і надзвычайны, што дзякуючы выдатнай і выключнай вастрыні чалавечага розуму пасля першапачатковага і яшчэ не завершанага тварэння свету, відаць, намі ўсё было вынайдзена, зроблена і даведзена да дасканаласці. *(Хто, на думку Манэці, завяршыў стварэнне свету? Чым у чалавеку ён захапляецца?)*

## § 11. Мастацтва Ранняга Адраджэння. Кнігадрукаванне

**Успомніце:** **1.** Як называўся храм усіх багоў у Старажытным Рыме? Як называўся галоўны хрысціянскі сабор Візантыі? **2.** Як малявалі мастакі Ісуса Хрыста, Багародзіцу і святых у Раннім і Высокім сярэдневякоўі? **3.** Дзе ўпершыню з'явіліся друкаваныя кнігі? Растлумачце значэнне паняццяў: раманскі стыль, гатычны стыль, абраз, фрэска, мазаіка, багаслоўе.

**1. Жывапіс і скульптура Ранняга Адраджэння. С. Батычэлі, Данатэла.** Прадаўжальнікамі творчасці заснавальнікаў Адраджэння ў выяўленчым мастацтве Джота і Мазачыо сталі мастак С. Батычэлі і скульптар Данатэла.

**Сандра Батычэлі** (1445—1510 гг.) з Фларэнцыі быў адным з першых жывапісцаў Адраджэння, які стаў пісаць карціны на сюжэты антычнай міфалогіі. Найбольш вядомым творам яго на гэту тэму з'яўляецца палатно *«Нараджэнне Венеры»*. Батычэлі пісаў таксама карціны на рэлігійныя тэмы і партрэты. Ім жа былі зроблены малюнкі да «Боскай камедыі» Дантэ.

Фларэнтыец **Данатэла** (каля 1386—1466 гг.) быў майстрам скульптурнага партрэта. Ён вельмі дакладна перадаваў знешняе падабенства і ўнутраны свет чалавека. Яго скульп-

Правообладатель Народная асвета



Сандра Батычэлі. Нараджэнне Венеры. *Карціна*

туры здаваліся жывымі. Расказваюць, што калі ён працаваў над адной са сваіх скульптур, то гнеўна крычаў свайму твору: «Дык гавары ж ты, нарэшце!» Данатэла першым з майстроў Адраджэння стварыў конны помнік.

**2. Архітэктура. Ф. Брунелескі.** Адным з лепшых архітэктараў Ранняга Адраджэння быў ***Філіпа Брунелескі*** (1377—1446 гг.). Пад яго кіраўніцтвам быў узведзены купал над саборам Санта-Марыя дэль Ф'ёрэ ў роднай Фларэнцыі. Гэта быў першы буйны архітэктурны помнік эпохі Адраджэння. Купал дыяметрам 42 м стаў сімвалам горада. Фларэнтыйскі выхавацельны дом (прытулак) Брунелескі пабудаваў у форме літары «П». Такім чынам, дом атрымаў унутраны двор. У далейшым такі план будынка пачалі выкарыстоўваць пры будаўніцтве палацаў знаці.

**3. Вынаходства кнігадрукавання. І. Гутэнберг.** У Раннім і ў пачатку Высокага сярэдневякоўя кнігі ў Заходняй Еўропе перапісвалі ад рукі ў манастырах. Старонкі кніг рабілі з пергамента — тонка апрацаванай цялячай скуры. Перапіска адной кнігі займала некалькі месяцаў. Аднак з цягам часу кніг патрабавалася ўсё больш. У XII ст. у Заходняй Еўропе навучыліся выраблять паперу. Яе рабілі з ануч, таму яна каштавала значна танней пергамента. У гарадах з'явіліся рамеснікі, якія займаліся перапісваннем кніг. Кніг стала больш. Але іх усё роўна не хапала. Для таго каб рабіць яшчэ больш кніг, трэба было спрасціць і паскорыць працэс іх вырабу.



Данатэла. Давід. *Бронзавая скульптура*

Правообладатель Народная асвета



Сабор у Фларэнцыі — тварэнне Брунелескі. *Сучасны выгляд*

Спачатку на драўлянай дошцы выразалі тэкст старонкі. Дошку пакрывалі фарбай. Потым бралі аркуш паперы і прыцiскалі яго да гэтай дошкі. На паперы атрымліваўся адбітак старонкі. Затым сталі выразаць не ўвесь тэкст старонкі, а асобныя літары. З літар складаліся словы і сказы. Літары рабіліся з драўніны. Драўніна ўбірала ў сябе фарбы. Літары хутка станавіліся непрыгоднымі. Прыходзілася пастаянна рабіць новыя літары.

Новы спосаб кнігадрукавання ў **1445** г. вынайшаў германскі ювелір ***Іаган Гутэнберг***. Для таго каб літары не псаваліся і служылі даўжэй, іх пачалі рабіць з металу. Металічныя літары былі раскладзены перад работнікам у зручным для яго парадку. Работнік браў літары і складаў з іх словы. Тэкст пры гэтым размяшчаўся ў спецыяльнай рамцы. Рамка ўключала ў сябе дзве старонкі (як сшытак, калі яго разгарнуць пасярэдзіне). Затым рамка пераходзіла да другога работніка. Той наносіў на яе фарбу, прыкладваў аркуш паперы і прыцiскаў яго да рамкі. На паперы атрымліваўся патрэбны адбітак. Фарба на адбітку высыхала. Тады паперу прыкладвалі чыстым бокам да той рамкі, на якой быў тэкст наступных старонак.



Аркуш Біблії, надрукаваны Гутэнбергам у 1450 г.

Правообладатель Народная асвета



Тыпаграфія XV ст.

Пасля 1445 г. кнігадрукаванне стала хутка распаўсюджвацца па ўсіх краінах Еўропы. Яно зрабіла кнігі даступнымі большай колькасці людзей, дапамагала развіццю адукацыі.

**1.** Раскажыце аб творчасці Батычэлі і Данатэла. **2.** Што новага ў архітэктуру Заходняй Еўропы ўнёс Брунелескі? **3.** Складзіце табліцу «Жывапіс, скульптура і архітэктура Ранняга Адраджэння». **4.** Якое значэнне для Еўропы мела вынаходства кнігадрукавання І. Гутэнбергам? **5.** Апішыце паслядоўнасць аперацый пры друкаванні кніг.

## § 12. Пачатак Вялікіх геаграфічных адкрыццяў

**Успомніце:** **1.** Чаму ў Раннім і Высокім сярэдневякоўі Еўропа не мела пастаянных сувязей з Кітаем, Індыяй і краінамі Трапічнай Афрыкі? **2.** Чаму еўрапейцы, нягледзячы на адкрыццё нарманамі паўночнага шляху ў Амерыку, нічога пра яе не ведалі? **3.** Па тэрыторыі якіх краін праходзіў Вялікі шаўковы шлях?

**1. Прычыны Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.** Адкрыцці еўрапейскіх падарожнікаў з **сярэдзіны XV ст.** да **сярэдзіны XVII ст.** называюць ***Вялікімі геаграфічнымі адкрыццямі***. На працягу адзначанага перыяду еўрапейцы адкрылі шмат невядомых ім да таго часу зямель. Яны дабраліся да поўдня Афрыкі, а абагнуўшы яе, даплылі да Індыі. Былі адкрыты Амерыка, затым Аўстралія. Першыя кругасветныя падарожжы дазволілі канчаткова даказаць, што Зямля мае форму шара.

Правообладатель Народная асвета

Гэтыя адкрыцці не толькі ўзбагацілі веды еўрапейцаў аб іншых цывілізацыях Зямлі. Еўрапейцы наладзілі з імі гандлёвыя сувязі, пачалі асваенне адкрытых зямель. З гэтага часу гісторыя чалавецтва паступова пераставала быць гісторыяй адасобленых цывілізацый, некаторыя з якіх існавалі наогул ізалявана. Развіццё цывілізацый станавілася ўсё больш узаемазвязаным, злівалася ў гісторыю ўсяго чалавецтва.

Якія ж прычыны прывялі да Вялікіх геаграфічных адкрыццяў? Галоўнай з іх было бурнае эканамічнае развіццё Заходняй Еўропы ў Познім сярэдневякоўі. Натуральная гаспадарка засталася ў мінулым. На змену ёй прыйшла грашова-таварная гаспадарка з яе вытворчасцю тавараў на продаж. У Заходняй Еўропе імкліва расла колькасць мануфактур, і ўсё больш выраблялася тавараў. Еўрапейцы шукалі новыя рынкі збыту для сваіх тавараў.

З падзеннем Візантыі і турэцкімі заваяваннямі пагоршыліся ўмовы гандлю на ўсходзе Міжземнамор'я. Там стала небяспечна не толькі прадаваць, але і купляць дарагія тавары з Усходу. А патрэбнасць у іх узрасла. Іх хацелі купляць уладальнікі мануфактур, банкіры, купцы, якія ўсё больш багацелі. Мноства дваран разлічвала разбагацець на захопах новых зямель. Чуткі аб незлічонай колькасці золата, дарагіх вострых прыпраў на Усходзе штурхалі іх на рызыкоўныя падарожжы.

Але немагчыма было здзейсніць усе гэтыя жаданні і задаволіць усе гэтыя патрэбнасці без дасягненняў у навуцы і тэхніцы. Знайсці новыя шляхі на багаты Усход у абход захопленых туркамі тэрыторый немагчыма было без новых ведаў у геаграфіі, астраноміі, марской справе. Сярод вучоных усё больш прыхільнікаў набывала вучэнне аб шарападобнасці Зямлі. Значыць, да Індыі або Кітая можна было дабрацца, рухаючыся не толькі на ўсход, але і на захад. Каб ажыццявіць такое доўгае плаванне, неабходны былі прыборы для арыенціроўкі караблёў. І такія прыборы з'явіліся. Яны дазвалялі арыентавацца ў агромнай воднай прасторы акіянаў па зорным небе.

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная даведка*

Вучэнне аб шарападобнасці Зямлі было вядома яшчэ ў антычнасці. З пачаткам сярэдневякоўя яго падтрымалі і некаторыя мысліцелі ў Візантыі. Але царква асуджала гэта вучэнне. З VI ст. яна падтрымлівала ідэю, выкладзеную ў кнізе Касьмы Індыкоплава (г. зн. «таго, хто плаваў у Індыю»). У ёй сцвярджалася, што Зямля — гэта плоскі чатырохвугольнік. Даказваць шарападобнасць Зямлі стала небяспечна — можна было трапіць пад абвінавачанне ў ерасі. ***(Як вы лічыце, чаму ў Познім сярэдневякоўі павялічылася колькасць прыхільнікаў вучэння аб шарападобнасці Зямлі?)***



Каравелы. *Малюнак сучаснага мастака*

Для далёкіх плаванняў патрэбны былі і новыя караблі. Лепшым з іх стала ***каравела***. Гэта быў быстраходны парусны карабель з трыма-чатырма мачтамі. Каравела магла рухацца і пры сустрэчным ветры — для гэтага трэба было ведаць, як упраўляцца з касымі ветразямі. Гэта рабіў невялікі экіпаж, і на караблі заставалася шмат месца для прадуктаў, грузу і воінаў.

**2. Партугалія і Іспанія — піянеры Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.** Слова «піянер» азначае «першапраходзец». Першымі распачалі вялікія адкрыцці партугальцы і іспанцы. На тое былі свае прычыны.

Па-першае, пасля завяршэння Рэканкісты ў Партугаліі і Іспаніі знайшлося многа небагатых ідальга, якія шукалі спосабы разбагацець. Яны ўмелі толькі ваяваць. І каралеўскай уладзе было выгадна адправіць іх на заваяванне новых зямель.

Па-другое, самі каралі Партугаліі і Іспаніі былі зацікаўлены ў новых даходах для дзяржаўнай казны. Гандаль з новымі землямі, што былі адкрыты, або іх захоп маглі прынесці шмат золата.

Правообладатель Народная асвета

Па-трэцяе, гандлю Іспаніі і Партугаліі ў Міжземным моры перашкаджалі італьянскія купцы. Яны здолелі дамовіцца з турэцкімі султанамі і не жадалі дзяліцца даходамі з купцамі іншых еўрапейскіх краін. Заставалася шукаць іншых шляхоў.

**3. «Прынц-мараплавец».** Першай пачала адкрываць новыя землі Партугалія. Яна завяршыла Рэканкісту намнога раней за Іспанію. Міжземнае мора не абмывала берагі Партугаліі.

Арганізатарам першых партугальскіх экспедыцый стаў прынц ***Энрыкі***. Сам ён не зрабіў ніводнага буйнога адкрыцця на моры. Але сваю мянушку «мараплавец» атрымаў па заслугах. Ён стварыў цудоўную школу для маракоў. Туды прынц запрасіў лепшых вучоных, спецыялістаў па картах, сярод якіх было нямала і арабаў. Менавіта пад яго кіраўніцтвам распрацоўваліся маршруты далёкіх плаванняў, рыхтаваліся капітаны караблёў, здольныя дасягнуць невядомых мораў. Энрыкі адпраўляў флатыліі, якія накіроўваліся на поўдзень уздоўж пабярэжжа Афрыкі. Галоўнай іх мэтай быў пошук шляху ў Індыю вакол Афрыкі. Партугальскі флот і мараходная навука пры «прынцу-мараплаўцу» да сярэдзіны XV ст. сталі лепшымі ў Еўропе.

***Гістарычная даведка***

Па маршрутах, якія Энрыкі начарціў на картах, партугальцы дабраліся да афрыканскіх дзяржаў ля ракі Нігер. Адсюль яны даставілі ў Партугалію першых чарнаскурых нявольнікаў. Партугальцы прасоўваліся ўсё далей на поўдзень. У той час гэта ўяўлялася вельмі небяспечным. Бо хадзілі чуткі, што вада ў тых морах кіпіць, і можна зварыцца зажыва. Але маракі вярталіся жывымі з золатам і захопленымі нявольнікамі. Прычым дзейнічалі яны жорстка, рабуючы і забіваючы афрыканцаў. Гандаль чарнаскурымі нявольнікамі аказаўся выгадны. Так Еўропа адкрыла адну з ганебных старонак сваёй гісторыі — гандаль рабамі з чорнай скурай.

Правообладатель Народная асвета

**4. Адкрыццё Калумбам Амерыкі.** Прасоўванне партугальцаў уздоўж афрыканскага ўзбярэжжа на поўдзень прымусіла іспанцаў шукаць іншага шляху ў Індыю. Іспаніі, якая толькі што завяршыла Рэканкісту, новая вайна з суседняй Партугаліяй была не патрэбна. Кароль Фердынанд і каралева Ізабела прынялі прапанову італьянскага мараплаўца ***Хрыстафора Калумба*** адправіць караблі ў Індыю праз Атлантычны акіян на захад.

*Гістарычная даведка*

Калумб быў ураджэнец Генуі. Свой план дасягнуць Індыі заходнім шляхам ён прапанаваў каралям Партугаліі, Англіі і Францыі. Тыя адказалі адмовай. Сам жа Калумб быў упэўнены, што зямля круглая, і верыў у поспех свайго плана.



Хрыстафор Калумб абвяшчае далучэнне новых зямель да Іспаніі. *Малюнак XIX ст.*

Летам 1492 г. тры каравелы Калумба рушылі ў дарогу. 12 кастрычніка **1492** г. матрос каравелы «Пінта» радасна закрычаў: «Зямля! Зямля!» Гэта быў адзін з Багамскіх астравоў. **Дзень яго адкрыцця лічыцца датай адкрыцця Калумбам Амерыкі.** Затым былі адкрыты іншыя астравы. Але Калумб не ведаў, што ён адкрыў новую частку свету. Вярнуўшыся ў Іспанію, ён паведаміў, што адкрыў «Заходнюю Індыю».

*Гістарычная даведка*

Калумб ажыццявіў яшчэ тры экспедыцыі ў Амерыку. Аднак індыйскіх тавараў і золата ён там не знайшоў. А іспанскі кароль разлічваў на новыя багацці для апусцелай казны. Калумба нават арыштавалі, але потым выпусцілі.

Правообладатель Народная асвета

Новы кантынент праз некалькі гадоў пасля смерці яго адкрывальніка атрымаў сваю назву — Амерыка. Але названы ён быў не яго імем, а імем мараплаўца з Фларэнцыі — Амерыга Веспучы.

**5. Шлях у Індыю.** Ужо пасля смерці прынца Энрыкі партугальцы здолелі дабрацца па моры да Індыі. У 1488 г. мараплавец Барталамеу Дыяш адкрыў паўднёвы край афрыканскага мацерыка — мыс, названы ім мысам Добрай Надзеі. Адкрыцці Калумба прымусілі партугальцаў спяшацца.



Партугальскія каравелы на шляху ў Індыю. *Мініяцюра XV ст.*

Летам 1497 г. з Лісабона выйшла ў мора флатылія з 5 караблёў пад кіраўніцтвам ***Васка да Гамы.*** Караблі абагнулі мыс Добрай Надзеі і рушылі ўздоўж усходняга ўзбярэжжа Афрыкі. Там знаходзіліся гарады, дзе жыло шмат арабскіх купцоў. Васка да Гама здолеў атрымаць у якасці праваднікa вельмі вопытнага мараплаўца Ахмеда ібн Маджыда. Гэта быў не толькі знакаміты капітан, але і вядомы на Усходзе вучоны, які напісаў кнігі па марской справе. Усяго за 23 дні ібн Маджыд давёў партугальскія караблі да берагоў Індыі. Гэта адбылося 20 мая **1498** г. Так еўрапейцы адкрылі марскі шлях у Індыю.




Васка да Гама. *Мініяцюра XV ст.*

**1.** Чаму геаграфічныя адкрыцці еўрапейцаў сярэдзіны XV — сярэдзіны XVII ст. назвалі «Вялікімі»? **2.** Якія змяненні ў гаспадарчым жыцці Заходняй Еўропы сталі прычынай Вялікіх геаграфіч-

Правообладатель Народная асвета

ных адкрыццяў? **3.** Чаму ў Познім сярэдневякоўі міжземнаморскі гандаль страціў сваё значэнне для Заходняй Еўропы? **4.** Якія дасягненні навукі і тэхнікі зрабілі магчымымі плаванні еўрапейцаў да далёкіх зямель? **5.** Чаму Партугалія і Іспанія першымі пачалі Вялікія геаграфічныя адкрыцці? **6.** Якая роля прынца Энрыкі ў арганізацыі першых далёкіх плаванняў партугальцаў? **7.** Чаму Калумб адправіўся на пошукі Індыі не вакол Афрыкі, а на захад цераз Атлантычны акіян? **8.** Васка да Гама патраціў намнога менш часу на шлях ад усходнеафрыканскага ўзбярэжжа да Індыі, чым да паўднёвага краю Афрыкі. Чаму?

## § 13. Штодзённае жыццё чалавека Позняга сярэдневякоўя

**Успомніце:** **1.** Як праводзілі час жыхары Старажытнага Рыма? **2.** З якіх груп насельніцтва складалася еўрапейскае феадальнае грамадства? **3.** Растлумачце значэнне паняццяў: абшчына, замак, рыцар, манах.

**1. Пагаршэнне ўмоў жыцця еўрапейцаў у XIV ст.** Умовы жыцця еўрапейцаў у XIV ст. значна пагоршыліся. У 1315—1317 гг. надышло рэзкае пахаладанне. Гэта адбілася на ўраджаях, якія з году ў год станавіліся ўсё горшымі і горшымі. Пачаўся жудасны голад, якога Еўропа не ведала ўжо некалькі стагоддзяў. Значнае пагаршэнне харчавання людзей аслабіла іх здароўе. Чалавечы арганізм пачаў дрэнна супраціўляцца розным хваробам. Аднак сапраўдная трагедыя прыйшла пазней.

**2. «Чорная смерць» і яе наступствы.** У 1347 г. у Еўропу з Усходу, з прыкаспійскіх стэпаў, прыйшла «чорная смерць» — чума. Непасрэдна ж у Заходнюю Еўропу хваробу завезлі генуэзскія маракі. Пераносчыкамі чумы пры гэтым былі не самі людзі (хворых проста не бралі ў дарогу), а пацукі і паразіты (галоўным чынам, блохі), якіх было многа на караблях.

Найбольш ад успышкі хваробы пацярпелі гарады. І гэта было невыпадкова. На невялікай тэрыторыі горада жыло вельмі шмат людзей. У гарадах не падтрымліваліся парадак і чысціня. Медыцына ў тыя часы была развіта слаба. Да таго

Правообладатель Народная асвета

ж хвароба развівалася вельмі хутка. Хворы паміраў праз тры-чатыры дні пасля пачатку хваробы. У гарадах выміралі цэлыя вуліцы і кварталы. Гараджане забівалі свае дамы, кідалі або наогул спальвалі маёмасць і ішлі шукаць паратунку ў вёскі. «Чорная смерць» бушавала ў Заходняй Еўропе да 1353 г. У час хваробы памерла каля 25 млн чалавек. Гэта была амаль палова жыхароў Заходняй Еўропы таго часу.

***Гістарычная даведка***

Чума — сапраўдны біч сярэдневякоўя. Эпідэмія чумы рэзка зніжала колькасць насельніцтва. У цэлым колькасць ахвяр чумы даходзіла да 1/2 агульнай колькасці жыхароў. Урачы практычна не маглі распазнаць гэта захворванне. Узбуджальнікі яго былі невядомы. Народ прытрымліваўся аднаго праверанага рэцэпта: бегчы з заражанай мясцовасці хутчэй, далей і вяртацца пазней. Эпідэміі чумы перыядычна паўтараліся — праз дзесяць, дваццаць гадоў — і лютавалі з ранейшай сілай. Што ж рабіць? Збянтэжаныя ўрачы задавалі сабе гэтае пытанне і не знаходзілі адказу. У чым прычына хваробы? У грахах? Усюды панаваў жах, жыццё замірала, паміж мінулым і будучым была бездань. *(Успомніце, адкуль чума з'явілася ў Еўропе. Як яна трапіла ў Заходнюю Еўропу? Як эпідэмія чумы адбівалася на колькасці насельніцтва? Як людзі ратаваліся ад чумы? Як вы думаеце, якія слаі насельніцтва больш за ўсё цярпелі ад чумы? Чаму эпідэміі чумы выклікалі страх і паніку сярод людзей?)*

**3. Жыллё, вопратка, харчаванне.** На працягу сярэдневякоўя жыллё простых людзей звычайна рабілі з бярвёнаў і прутоў, абмазаных глінай. Дамы знаці будаваліся з бярвёнаў і камянёў. Буйныя феадалы жылі ў замках. А каралі — у палацах.

Рост тэрыторыі гарадоў быў абмежаваны сцяной. Таму ў іх узводзіліся пабудовы ў некалькі паверхаў. У дамах для рамеснікаў верхнія паверхі прызначаліся для жылых памяшканняў. На першых паверхах размяшчаліся майстэрні і крамы.

У перыяд Высокага сярэдневякоўя мэблю рабілі цесляры, а гэта значыць, што з-пад іх сякеры яна выходзіла вялікая і

Правообладатель Народная асвета



Сялянская хаціна.
*Малюнак сучаснага мастака*

грубая. У XV ст. ад цяслярнага рамяства аддзялілася сталярнае. Сталяры спецыялізаваліся на больш тонкай і якаснай рабоце з дрэвам. Таму іх вырабы былі прыгажэйшыя і больш вытанчаныя. Мэбля, зробленая для знаці, пакрывалася разьбой і паліравалася.

Практычна на працягу ўсяго сярэдневякоўя вопратка простых людзей не вылучалася разнастайнасцю: льняныя або суконныя кашулі, штаны, плашчы. На нагах насілі скураны ці драўляны абутак. Знатныя людзі імкнуліся надзяваць прыгожую вопратку з тонкіх дарагіх тканін.

Ад чумы памерла вельмі шмат людзей. У Заходняй Еўропе стала менш сялян, працаўнікоў мануфактур. Гэта значыць, што паменшылася колькасць работнікаў. Цяпер яны пагаджаліся працаваць толькі за больш высокую плату. Уладальнікі маёнткаў і гаспадары мануфактур былі вымушаны павышаць сваім работнікам плату за працу. Інакш яны маглі пайсці з маёнтка ці з мануфактуры да іншага гаспадара.

Простыя людзі, што ўцалелі пасля «чорнай смерці», зараблялі больш грошай. Яны маглі купіць больш прадуктаў, а значыць, сталі жыць лепш.



Сярэдневяковыя касцюмы.
*XII—XV стст.*

У Высокім сярэдневякоўі людзі елі, як правіла, два разы на дзень — раніцай і ўвечары. У Познім сярэдневякоўі харчаванне стала трохразовым. У Германіі ў канцы XV ст. рамеснік еў на снеданне хлеб,

Правообладатель Народная асвета



Сталовая ў замку. *Мініяцюра XV в.*

на абед — суп і дзве стравы: мясную і з агародніны, на вячэру — хлеб з мясной стравай. Знатныя людзі елі вельмі шмат мяса ў разнастайных стравах: смажаніна з газелі, фазанаў, курапатак, галубоў, пеўняў, свініны, адварныя цялячыя галовы і г. д. Хлеба, кандытарскіх вырабаў і агародніны знатныя людзі ўжывалі мала. Але затое на іх сталах былі аліўкі, айва, фінікі, артышокі, гэта значыць, многае з таго, што беднякі і ў вочы не бачылі. Гісторыкі, пісьменнікі і паэты не паведамляюць, як гатавалі ежу. Аднак аб гэтым можна даведацца з кулінарнай кнігі, створанай у Англіі. З гэтай кнігі вядома, напрыклад, што выпечаны напярэдадні хлеб англічане выкарыстоўвалі як талеркі. Бoханы наразалі вялікімі плоскімі лустамі. У сярэдзіне лусты рабілі паглыбленне, у якое клалі асноўную страву, напрыклад мяса. Пасля яды гэтыя лусты раздавалі беднякам.

**4. Становішча жанчыны ў грамадстве.** У сучасным грамадстве жанчыны адыгрываюць вельмі важную ролю. Але ў сярэднія вякі ў Заходняй Еўропе было зусім іншае грамадства. Становішча жанчын у ім значна адрознівалася ад сучаснага. У сярэдневякоўі месца жанчыны ў грамадстве залежала ў першую чаргу ад яе паходжання. Знатная жанчына займала больш высокае становішча, чым жанчына простага паходжання. На месца жанчыны ў грамадстве ўплывала таксама становішча яе мужа. У Англіі жонкі багатых рамеснікаў маглі насіць сукенкі са шлейфам даўжэйшым за той, што насілі жонкі небагатых рамеснікаў. У жыцці сярэд-

Правообладатель Народная асвета



Сельскае свята.
*Малюнак сучаснага мастака*

невяковага грамадства былі такія сферы, дзе дзейнічалі толькі жанчыны. Напрыклад, мужчына не мог быць на чале жаночага манастыра. У Кёльне вытворчасцю шаўковых тканін займаліся толькі жанчыны. На чале іх цэха стаяла «галоўная майстрыха». Але былі такія сферы грамадства, куды жанчыны не дапускаліся. Жанчына не магла быць святарам, салдатам або афіцэрам, студэнткай або выкладчыцай універсітэта.

**5. Забавы.** Галоўнымі сялянскімі святамі былі апошнія дні года. Ураджай быў сабраны. Асноўныя палявыя работы скончыліся. На апошнія дні года выпадалі каталіцкія Каляды. У гонар свята сяляне забівалі свінню і гатавалі пачастунак. Жыццё феадалаў праходзіла ў войнах, балях і паляваннях. Вяселле таксама займала сярод забаў феадалаў адно з галоўных месцаў.

Вось як апісваецца ў шведскай вершаванай «Хроніцы Эрыка» (XIV ст.) баль, наладжаны ў гонар прыбыцця ў Швецыю жонак герцага Вальдэмара і герцага Эрыка. На беразе ракі ў месцы, схаваным ад ветру, узвялі спецыяльную залу. Сцены ўнутры яе былі пакрыты аксамітам з вышыўкай са срэбра і малінавым шоўкам. Столі ў зале не было. Сцены ўвенчваў востраверхі дах. Пад ім знаходзілася папярочная бэлька, на якой ставілі велізарныя свечкі. Яны добра асвятлялі залу. Пад залай былі выкапаны склепы. Іх запоўнілі запасамі прадуктаў, якіх павінна было хапіць на некалькі дзён балявання. І вось па рацэ прыплылі ўпрыгожаныя караблі. На іх борце — маладыя жонкі герцагаў Вальдэмара і Эрыка. Свята пачалося. Ча-

Правообладатель Народная асвета

тыры дні балявалі госці. Яны елі рэдкія і дарагія стравы, запівалі іх здалёк прывезенымі вінамі і шведскім мёдам. Гучалі ўрачыстыя прамовы ў гонар герцагаў і іх жонак. Слых гасцей радавала музыка, іх весялілі блазны. Блазнаў запрасілі з розных краін спецыяльна для ўдзелу ў гэтым балі. У апошні дзень балю быў арганізаваны рыцарскі турнір.



Паляванне знатнага сеньёра.
*Малюнак сучаснага мастака*

**1.** Якія былі прычыны пагаршэння ўмоў жыцця еўрапейцаў у XIV ст.? **2.** Якімі былі наступствы эпідэміі чумы ў Заходняй Еўропе ў сярэдзіне XIV ст.? **3.** Якімі былі ў Познім сярэдневякоўі жыллё, мэбля і адзенне простых людзей і знаці? **4.** Чым харчаваліся простыя людзі і знаць у Познім сярэдневякоўі? **5.** Якія былі забавы людзей у Познім сярэдневякоўі? **6.** Якім было становішча жанчыны ў сярэдневяковым грамадстве?

***Гістарычная даведка***

**Голад у Францыі ў 1315 г.**

У вёсках з'елі ўсіх сабак, таму што не мелі магчымасці іх пракарміць, і палявалі, як за драпежным зверам, за кошкамі, што паспелі ўжо здзічэць. З-за адсутнасці кармоў пачаўся падзеж жывёлы, і галодныя людзі біліся з-за кавалка падлы. Жанчыны выкопвалі з-пад снегу замёрзлую траву і тут жа з'ядалі яе... Кожны дзень хлапчукі-падлеткі ныралі ў палонку дзе-небудзь на возеры або ў сажалцы, спадзяючыся злавіць рыбу. Старых у вёсках амаль не засталося. Абяссіленыя цесляры, якія падалі ад стомы, без перадышкі збівалі труны. Сціхнуў вясёлы шум млынавых колаў. Звар'яцелыя ад гора маці калыхалі скалелых мёртвых дзяцей, якія ўсё яшчэ сціскалі ў сваіх ручках пучок гнілой саломы.

Правообладатель Народная асвета

## АБАГУЛЬНЕННЕ ДА РАЗДЗЕЛА I

### Заходняя Еўропа

Перыяд Позняга сярэдневякоўя ўключае ў сябе толькі два стагоддзі з гісторыі чалавецтва. Але за гэты час Заходняя Еўропа ажыццявіла сапраўдны рывок у сваім развіцці.

Позняе сярэдневякоўе для Заходняй Еўропы было часам эканамічнага ўздыму. Таварна-грашовая гаспадарка прыйшла на змену натуральнай. З'явіліся мануфактуры і рэзка павялічылася колькасць вырабляемых тавараў. Выраслі гарады і попыт гараджан на прадукты харчавання. Сяляне, што атрымалі асабістую свабоду, былі зацікаўлены ў вырошчванні большага ўраджаю. Бо яны маглі прадаць на гарадскіх кірмашах частку сваіх прадуктаў і купіць патрэбныя ім прылады працы і іншыя неабходныя рэчы.

Важныя змяненні адбыліся і ў заходнееўрапейскім грамадстве. З'явіліся і ўмацаваліся новыя групы насельніцтва — уладальнікі мануфактур, банкіры, інтэлігенцыя. Пачалі разрывацца феадальныя сувязі. Знікла феадальная лесвіца, з гэтага часу адзіным сеньёрам для ўсіх феадалаў з'яўляўся кароль. Змяніліся таксама адносіны паміж феадаламі і сялянамі. Сяляне атрымалі асабістую свабоду, і асабістай залежнасці ад свайго феадала ў іх больш не было. Сяляне заставаліся толькі ў пазямельнай залежнасці ад феадалаў, таму павінны былі плаціць ім аброк. Цяпер сялян судзілі дзяржаўныя чыноўнікі, а не феадалы, кіруючыся сваім самавольствам.

Змяненні ў грамадстве прывялі да змен у дзяржаўным ладзе краін Заходняй Еўропы. Узмацнілася каралеўская ўлада. Дзяржавы сталі цэнтралізаванымі. Усімі справамі ў дзяржаве кіраваў манарх з дапамогай сваіх чыноўнікаў. Феадалы былі пазбаўлены права кіраваць залежнымі ад іх сялянамі ў сваіх уладаннях. У цэнтралізаваных дзяржавах сфарміра-

Правообладатель Народная асвета

лася саслоўна-прадстаўнічая манархія. Каралі кіравалі краінай, абапіраючыся на выбраныя саслоўямі органы — парламент, Генеральныя штаты, картэсы.

Вялікія змяненні адбыліся ў культуры. Патрэбы новых груп насельніцтва (уладальнікаў мануфактур, банкіраў, інтэлігенцыі) абумовілі з'яўленне новай культуры — культуры Адраджэння. Яе ідэалам стаў адукаваны, ініцыятыўны чалавек, які ўласнай працай стварае шчаслівае жыццё. Гуманісты лічылі феадальныя адносіны нявартымі чалавека. У пошуках новых адносін паміж людзьмі яны звярнуліся да гісторыі старажытных Афін, Рымскай рэспублікі. Адраджэнне цікавасці да антычнай культуры дазволіла стварыць вялікія творы ў літаратуры, жывапісе, скульптуры, архітэктуры. Навука выйшла з абстрактных, далёкіх ад жыцця спрэчак і звярнулася да патрэб чалавека. Еўрапейцы самастойна вынайшлі кнігадрукаванне, вядомае ў Кітаі яшчэ ў Высокім сярэдневякоўі.

У эканамічным развіцці сярод іншых цывілізацый Заходняя Еўропа выйшла наперад. У пошуках новых рынкаў збыту сваіх тавараў і сыравіны заходнееўрапейцы накіраваліся за далёкія моры і акіяны. Яны адкрылі для сябе новыя краіны і цэлыя кантыненты.

## Пытанні і заданні

Назавіце даты падзей: **1.** Заключэнне Кальмарскай уніі. **2.** Пачатак Стогадовай вайны. **3.** «Вялікі раскол» у каталіцкай царкве. **4.** Прыняцце «канстытуцыі» папскай дзяржавы. **5.** Авіньёнскі «палон» пап. **6.** Утварэнне Іспаніі. **7.** Захоп туркамі Канстанцінопаля. **8.** Адкрыццё Х. Калумбам Амерыкі. **9.** Адкрыццё еўрапейцамі марского шляху да Індыі.

Да гісторыі якіх краін адносяцца падзеі: **1.** Выданне першай друкаванай кнігі ў Еўропе. **2.** Аблога Арлеана. **3.** Адпраўка экспедыцыі Хрыстафора Калумба на пошук заход-

Правообладатель Народная асвета

няга шляху ў Індыю. **4.** Скліканне Генеральных штатаў. **5.** Прынясце «Залатой булы». **6.** Барацьба Людовіка XI і Карла Смелага. **7.** Завяршэнне Рэканкісты. **8.** Вайна Пунсовай і Белай ружы.

Успомніце: Якія дзяржавы існавалі ў цэнтры і на поўдні Італіі ў XVI—XV стст.? Якія дзяржавы знаходзіліся на Пірэнейскім паўвостраве ў канцы XV ст.? Дзе ўзнік Ганзейскі саюз? Якія гарады-рэспублікі Італіі кантралявалі гандаль у Міжземным моры? Дзе ўзніклі першыя мануфактуры? Мараплаўцы якой краіны адкрылі марскі шлях у Індыю?

Назавіце імёны гістарычных дзеячаў, звязаных з наступнымі падзеямі: **1.** Адкрыццё мыса Добрай Надзеі. **2.** Вынаходства кнігадрукавання ў Еўропе. **3.** Перамога французаў пад Арлеанам. **4.** Адкрыццё марскога шляху ў Індыю. **5.** Заснаванне новай каралеўскай дынастыі ў Англіі ў выніку вайны Пунсовай і Белай ружы. **6.** Стварэнне паэмы «Боская камедыя». **7.** Паўстанне англійскіх сялян у 1381 г.

Запоўніце табліцу «Кіраванне дзяржавай перыяду феадальнай раздробленасці і цэнтралізаванай дзяржавай»:

| Пытанні для параўнання | Дзяржава перыяду феадальнай раздробленасці | Цэнтралізаваная дзяржава |
|---|---|---|
| Якія правы меў кароль? | | |
| Крыніцы даходаў караля | | |
| Наяўнасць пастаяннай арміі | | |
| Хто вяршыў суд? | | |
| Хто ажыццяўляў кіраванне на месцах? | | |

Правообладатель Народная асвета

Карыстаючыся ведамі, атрыманымі ў 6-м класе, параўнайце: **1.** Значэнне гандлю ў жыцці жыхароў Заходняй Еўропы ў Высокім і Познім сярэднявякоўі. **2.** Ролю царквы ў развіцці адукацыі ў Раннім і Познім сярэднявякоўі. **3.** Залежнасць сялян ад феадалаў у Высокім і Познім сярэднявякоўі.

Запоўніце табліцу «Значэнне кнігадрукавання»:

| Рукапісныя кнігі | Друкаваныя кнігі |
|---|---|
| 1.Высокі кошт аднаго экземпляра кнігі. Магчымасць вырабу кніг толькі ў адзінкавых экземплярах. | 1. |
| 2. Тэрміны вырабу кнігі — ад некалькіх месяцаў да некалькіх гадоў. | 2. |
| 3. Асноўныя цэнтры вырабу кніг — | 3. Цэнтры вытворчасці кніг — тыпаграфіі, абсталяваныя спецыяльнымі станкамі, якія абслугоўваюцца наёмнымі рабочымі. |
| 4. Асноўныя чытачы — | 4. Асноўныя чытачы — |

Вызначце, якія з наступных палажэнняў звязаны з ідэямі гуманістаў. Дайце разгорнуты адказ, чаму гуманісты былі прыхільнікамі часткі з гэтых палажэнняў, а іншыя палажэнні не прымалі.

**1.** Знаходжанне на першым плане цікавасці да чалавечай асобы. **2.** Адмаўленне хрысціянства і веры ў Бога. **3.** Зварот да спадчыны антычнасці. **4.** Чалавек — каваль свайго шчасця. **5.** Адмаўленне ад зямных даброт і маёмасці, пропаведзь

Правообладатель Народная асвета

аскетычнага жыцця. **6.** Пагардлівыя адносіны да працы. **7.** Чалавек сваёй працай упрыгожвае свет.

Запоўніце табліцу «Дзеячы літаратуры і мастацтва Ранняга Адраджэння»:

| Дзеячы Ранняга Адраджэння | Сфера дзейнасці | Найбольш вядомыя творы |
|---|---|---|
| Дантэ Аліг'еры | | |
| Франчэска Петрарка | | |
| Джавані Бакачыо | | |
| Джота | | |
| Данатэла | | |
| Сандра Батычэлі | | |
| Філіпа Брунелескі | | |

Высвятліце прычыны: узвышэння Англіі і Францыі ў Познім сярэдневякоўі; значнага памяншэння насельніцтва Заходняй Еўропы ў сярэдзіне XIV ст.; Вялікіх геаграфічных адкрыццяў; павелічэння плошчы зямель пад пашу ў шэрагу краін Заходняй Еўропы; змена рамеснай майстэрні мануфактурай.

Падрыхтуйце расказ на адну з пазначаных тэм: **1.** Вынікі вызвалення сялян ад асабістай залежнасці ад феадалаў для развіцця сельскай гаспадаркі ў Заходняй Еўропе. **2.** Значэнне мануфактур для развіцця вытворчасці. **3.** Гаспадарчае развіццё Германіі і Паўночнай Італіі: агульныя рысы і адрозненні. **4.** Жыццё цэхавага рамесніка і наёмнага рабочага мануфактуры: асноўныя адрозненні. **5.** Асноўныя прычыны канфліктаў паміж дзяржавамі Заходняй Еўропы ў Познім сярэдневякоўі.

Правообладатель Народная асвета

# РАЗДЗЕЛ II. СЛАВЯНЕ Ў ПОЗНІМ СЯРЭДНЕВЯКОЎІ

## § 14. Чэхія ў Познім сярэднявякоўі

**Успомніце:** **1.** Калі ўзнікла Чэшская дзяржава? **2.** Калі чэхі прынялі хрысціянства? **3.** Якое становішча займала Чэхія ў складзе Свяшчэннай Рымскай імперыі?

**1. Развіццё эканомікі.** У Познім сярэднявякоўі ў Чэхіі хутка расла колькасць насельніцтва, узнікла шмат новых гарадоў. Часта гарады засноўваліся ў месцах знаходжання радовішчаў серабра. Так, у канцы XIII ст. быў пабудаваны горад Кутна-Гора. Яго жыхары здабывалі больш як 40 % усяго еўрапейскага серабра.

Чэшскія манеты — сярэбраныя грошы — сталі самымі ходкімі грашамі ў Цэнтральнай Еўропе, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі.

Аднак здабыча серабра не лепшым чынам адбілася на развіцці эканомікі чэшскіх зямель. Чэхія купляла шмат тавараў заходнееўрапейскіх краін, а сваіх уласных прадавала значна менш. Вырабы чэшскіх рамеснікаў не маглі на роўных канкурыраваць з іншаземнымі. Гэта прывяло да панавання ў гандлі на тэрыторыі Чэхіі нямецкіх купцоў.

Між тым цэны на рамесныя вырабы пастаянна раслі, а на прадукты сельскай гаспадаркі заставаліся ранейшымі. Сяляне былі не ў стане выплачваць аброк сваім феадалам і разараліся. Цяжка было знайсці сродкі да існавання і чэшскім рамеснікам. Беднякі з зайздрасцю глядзелі на свецкіх феадалаў і свяшчэннікаў, якія жылі ў раскошы.



Пражскі грош

**2. Чэшскае грамадства.** Насельніцтва Чэхіі ў Познім сярэднявя-

Правообладатель Народная асвета

коўі не было аднародным. Сярод сялян і гараджан і нават сярод феадалаў былі як бедныя, так і багатыя.

Зусім бяспраўнымі былі сяляне. Яны з'яўляліся толькі трымальнікамі зямлі, а не яе ўласнікамі і пры гэтым плацілі мноства падаткаў — свайму феадалу, дзяржаве і царкве. Цяжкім было жыццё простых чэхаў і ў гарадах. Тут кіраванне і суд апынуліся ў руках найбольш заможных гараджан. Як правіла, гэта былі немцы.

**Гістарычная даведка**

З XII ст. з Германіі ў Чэхію пачалі перасяляцца нямецкія феадалы, сяляне, рамеснікі і купцы. Яны станавіліся буйнымі землеўладальнікамі, гаспадарамі руднікоў, уладальнікамі майстэрняў. Немцы захапілі ўладу ў многіх чэшскіх гарадах. Нават у сталіцы Чэхіі Празе доўгі час не было ніводнага чэха ў яе гарадскім савеце. Нездарма тады гаварылі, што «чэх жыве ў сваёй краіне як выгнаннік».

Найбольш актыўным насельніцтвам горада былі рамеснікі і дробныя гандляры — ***бюргерства***. Рамеснікі валодалі ўласнай маёмасцю і былі аб'яднаны ў цэхі. Гандляры валодалі капіталам. Аднак бюргерства (а гэта былі ў асноўным чэхі) не мела ўлады ў горадзе. Да паловы гарадскога насельніцтва складалі беднякі.

Найбольш уплывовымі людзьмі ў Чэхіі былі буйныя землеўладальнікі — ***паны***. Яны займалі ўсе найважнейшыя пасады ў краіне, у тым ліку ў дарадчым органе пры каралі — ***сейме***. Акрамя паноў, у чэшскім сейме мелі права засядаць вышэйшыя духоўныя асобы. Вышэйшае духавенства ў Чэхіі адрознівалася асаблівым багаццем і магутнасцю. Царкве належала да трэці ўсёй зямлі, якая апрацоўвалася. Яе даходы фарміраваліся таксама за кошт дзесяціны і збораў за выкананне рэлігійных абрадаў.

Разам з панамі і духоўнымі асобамі (епіскапамі, абатамі) да ліку феадалаў належалі і дваране-рыцары. Іх уладанні маглі быць зусім невялікімі. Некаторыя рыцары атрымлівалі да-

Правообладатель Народная асвета

ходы толькі ад вайсковай службы і нават разбою.

Такім чынам, у Чэхіі да пачатку XV ст. многія пласты насельніцтва былі незадаволены сваім становішчам. Усеагульнае асуджэнне і зайздрасць выклікала багацце царквы.



Бюст Карла IV у саборы святога Віта ў Празе

**3. Праўленне Карла IV.** У XIV ст. Чэхія ператварылася ў самую багатую і развітую частку Свяшчэннай Рымскай імперыі. Адбылося гэта ў час кіравання імператара ***Карла IV*** (1346—1378 гг.). Ён шмат зрабіў для пашырэння меж Чэхіі, яе гаспадарчага і культурнага развіцця, добраўпарадкавання гарадоў.

***Гістарычная даведка***

У 1356 г. Карл IV зацвердзіў ім жа распрацаваную «Залатую булу». Згодна з булай, Чэшскае каралеўства займала асобае становішча ў імперыі. Калі перапынялася дынастыя чэшскіх правіцеляў, то права выбіраць новага караля належала толькі чэшскаму сейму. Чэхія захоўвала права чаканіць уласную манету. Чэшскі кароль мог набываць землі і замкі на тэрыторыі ўсёй імперыі, а іншыя правіцелі не мелі права купляць уладанні ў чэшскіх землях.

У **1348** г. у Празе паводле ўказа Карла IV быў заснаваны першы ў Цэнтральнай Еўропе універсітэт. Сюды былі запрошаны найбуйнейшыя вучоныя з усёй Еўропы.

Чэхія ў праўленне Карла IV стала сапраўдным цэнтрам Свяшчэннай Рымскай імперыі. Аднак разам з яго смерцю перыяд чэшскай магутнасці завяршыўся. Аслабла і ўлада чэшскага караля.

**4. Ян Гус і гусіты.** У 1402 г. адным з самых вядомых і ўплывовых людзей у Празе стаў ***Ян Гус***. У гэтым годзе ён быў абраны рэктарам універсітэта, прыняў сан свяшчэнніка і пачаў выступаць з пропаведзямі.

Правообладатель Народная асвета

***Гістарычная даведка***

Ян Гус нарадзіўся ў 1369 г. (або 1371) у сям'і заможных сялян. Вучыўся ў пражскай школе і ў мясцовым універсітэце. Ва універсітэце здольны студэнт атрымаў спачатку ступень бакалаўра, а затым магістра свабодных мастацтваў. Гэта дало яму права чытаць лекцыі. У хуткім часе Ян Гус узначаліў філасофскі факультэт, а затым і ўвесь універсітэт.

У сваіх пропаведзях Ян Гус крытыкаваў царкву за яе імкненне да багацця. Ён лічыў, што свяшчэннікі не павінны браць грошы за выкананне рэлігійных абрадаў, што нельга прадаваць царкоўныя пасады. Ян Гус сцвярджаў, што не папа рымскі з'яўляецца вышэйшым галавой царквы, а Ісус Хрыстос.

Ян Гус чытаў пропаведзі на чэшскай мове. Яго прамовы карысталіся вялікім поспехам у розных пластоў чэшскага грамадства.

Поспех пропаведзяў Яна Гуса і рост ліку яго прыхільнікаў напалохалі царкву і нямецкіх феадалаў. Папа рымскі і імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі выклікалі Яна Гуса на царкоўны сабор у Канстанцу. Тут яго абвінавацілі ў ерасі і паспрабавалі прымусіць адмовіцца ад сваіх поглядаў. *(Успомніце, што такое ерась.*




Гусіцкія войны

Правообладатель Народная асвета

*Чым пагражала чалавеку ў сярэдневякоўі абвінавачанне ў ерасі?)* Ян Гус рашуча адмовіўся і 6 ліпеня **1415** г. быў спалены на кастры.



Абароннае збудаванне гусітаў. *Мініяцюра XV ст.*

Пакаранне Яна Гуса выклікала выбух абурэння ў Чэхіі. У **1419** г. яго паслядоўнікі — ***гусіты*** — узнялі паўстанне ў Празе. У хуткім часе яно ахапіла ўсю краіну. Паўстанне было накіравана супраць каталіцкай царквы і нямецкага панавання ў Чэхіі. У ім прынялі ўдзел гараджане, сяляне і многія чэшскія феадалы. Але чэшскія паны і багатыя гараджане выступалі за нязначнае рэфармаванне царквы і схіляліся да захавання ўлады імператара. Найбяднейшыя жыхары горада, дробныя феадалы і сяляне дбалі аб сваіх інтарэсах. Яны жадалі стварыць «царства Божае на зямлі» — грамадства, дзе ўсе будуць жыць у роўнасці і па справядлівасці. Яны заснавалі і ўмацавалі горад на гары Табар (адсюль іх назва — ***табарыты***).

*Гістарычная даведка*

Папай рымскім неаднаразова абвяшчаліся крыжовыя паходы супраць гусітаў. На чале войскаў еўрапейскіх феадалаў станавіліся імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі, правіцелі суседніх дзяржаў, каталіцкі кардынал. Але пакуль гусіты выступалі разам, яны не ведалі паражэнняў. На чале з таленавітымі палкаводцамі Янам Жыжкай і Пракопам Голым гусіты паспяхова дзейнічалі і на тэрыторыі суседніх краін.

Бязлітасныя гусіцкія войны працягваліся 15 гадоў. Яны спыніліся, калі чэшскія паны і багатыя гараджане пайшлі на пагадненне з імператарам і папай рымскім. У 1434 г. апошнія табарыты, якія працягвалі супраціўляцца, былі разгромлены.

Правообладатель Народная асвета

Гусіцкія войны мелі важныя наступствы для Чэхіі. Яны падарвалі ўплыў каталіцкай царквы і папы рымскага. Рэальная ўлада і кіраванне ў гарадах перайшлі ад немцаў да чэхаў. Дзяржаўныя дакументы ад гэтага часу сталі пісацца на чэшскай мове.

*Гістарычная крыніца*

**З вучэння табарытаў (хроніка XV ст.).** Не будзе на зямлі ні каралёў, ні ўладароў, ні падданых; знікнуць усе падаткі; ніхто нікога не будзе прымушаць да чаго-небудзь; усе ж аднолькава будуць братамі і сёстрамі.

Як у горадзе Табары няма «майго» і «твайго», але ўсё агульнае, так і заўсёды ўсё павінна быць агульным для ўсіх, і ніхто не павінен мець прыватнай уласнасці...

Недапушчальна і надалей ні мець караля, ні выбіраць сабе такога... Праўленне павінна быць перададзена ў рукі народа; усіх паноў, дваран і рыцараў трэба знішчыць, як дрэвы, што не так растуць у лесе; павінны быць ліквідаваны цяпер падаткі і плацяжы разам з усялякай княжацкай уладай і свецкім уладараннем... *(Падумайце, чаму феадалы не маглі падтрымаць патрабаванні табарытаў.)*



Сабор святога Віта ў Празе

**5. Культура Чэхіі XIV—XV стст.** Створаныя ў Чэхіі ў перыяд Позняга сярэдневякоўя культурныя каштоўнасці да гэтай пары служаць чалавецтву. Уклад Чэхіі таго часу ў сусветную культуру велізарны.

У праўленне Карла IV у заснаваным ім універсітэце выкладалі лепшыя вучоныя таго часу з усёй Еўропы. Імператар падтрымліваў пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў. У гэты час з'явілася разнастайная літаратура, прычым не толькі на латыні, але і на чэшскай мове. У 60-я гг. XIV ст. на чэшскую мову была перакладзена Біблія.

Правообладатель Народная асвета

У XIV ст. назіраўся росквіт чэшскага жывапісу і скульптуры. Архітэктар і скульптар ***Петэр Парлер*** меў свой асобны погляд на гатычны стыль. Яго скульптурныя творы моцна паўплывалі на мастацтва Германіі. У эпоху Карла IV і яго пераемнікаў у Чэхіі вяршыні майстэрства дасягнулі мастакі ў стварэнні кніжных мініяцюр.

Асобную ўвагу Карл IV аддаваў чэшскай сталіцы — Празе. Тут у стылі позняй готыкі ўзводзіліся саборы, свецкія пабудовы, умацаванні. *(Успомніце, у чым заключаюцца асаблівасці гатычнага стылю.)* Шмат захавалася да нашых дзён, у тым ліку велічны замак Карлштэйн, цудоўны сабор святога Віта і найпрыгажэйшы мост праз Влтаву — Карлаў мост. Алтары храмаў і сцены замкавых памяшканняў былі распісаны таленавітымі мастакамі.

Ступень развіцця культуры Чэхіі ў Познім сярэдневякоўі ставіла яе на адзін узровень з вядучымі дзяржавамі Заходняй Еўропы.

**1.** Што станоўчае і адмоўнае было ў развіцці эканомікі Чэхіі ў Познім сярэдневякоўі? **2.** Што ўяўляла сабой чэшскае грамадства ў Познім сярэдневякоўі? **3.** Чым у гісторыі Чэхіі знамянальна праўленне Карла IV? **4.** Якая роля Яна Гуса ў гісторыі Чэхіі? **5.** Што прывяло да пачатку гусіцкіх войнаў? Якія іх вынікі? **6.** Ахарактарызуйце развіццё чэшскай культуры ў Познім сярэдневякоўі. **7.** Дайце вызначэнне паняццям: бюргерства, гусіты, табарыты.

## § 15. Польшча ў Познім сярэдневякоўі

**Успомніце: 1.** Калі ўзнікла Польская дзяржава? **2.** Як складваліся адносіны Польшчы з яе суседзямі ў Высокім сярэдневякоўі? **3.** Што ўяўляла сабой польскае грамадства ў Высокім сярэдневякоўі?

**1. Структура польскага грамадства.** У Познім сярэдневякоўі ў Польшчы ўтвараецца саслоўнае грамадства. *(Успомніце,*

Правообладатель Народная асвета

*на якія саслоўі падзялялася феадальнае грамадства.)* Яго складала духавенства, шляхта, сяляне і гараджане.

Значным уплывам карысталася духавенства. Яно ўжо не так моцна залежала ад дзяржавы, як у папярэдні перыяд. Царква мела значныя зямельныя ўладанні.

Асаблівасцю Польшчы была наяўнасць даволі шматлікага пласта дваран — ***шляхты***. Да канца сярэдневякоўя польская шляхта валодала такімі прывілеямі, якіх не мелі дваране ніводнай іншай еўрапейскай краіны.

**Гістарычная даведка**

«Рыцарскае права» шляхты давала ёй магчымасць распараджацца зямельнымі ўладаннямі па сваіх меркаваннях: дарыць іх, завяшчаць, прадаваць. Вялікі штраф накладаўся за забойства і знявагу шляхціча. Для шляхты існаваў асобны суд. За ўдзел у ваенных паходах шляхцічы атрымлівалі грашовую плату.

У XV ст. абвастрыліся адносіны шляхты з ***магнатамі***. Так у Польшчы называлі буйнейшых землеўладальнікаў. Дзякуючы свайму багаццю яны ўплывалі на палітыку дзяржавы, займалі найважнейшыя пасады. Прадстаўнікі шляхты і магнатаў збіраліся на ***вальныя сеймы***. Але ў адрозненне ад саслоўна-прадстаўнічых органаў Англіі або Францыі ў польскім сейме не было прадстаўнікоў ад іншых саслоўяў, акрамя феадалаў. У Польшчы так і не сфарміравалася саслоўна-прадстаўнічая манархія.

У Познім сярэдневякоўі польскія сяляне яшчэ не былі цалкам залежнымі і іх гаспадаркі развіваліся даволі паспяхова. Вельмі стракатым было насельніцтва польскіх гарадоў. Рамеснікі аб'ядноўваліся ў цэхі, але ў іх пастаянна адбываліся канфлікты паміж майстрамі і падмайстрамі. Як і ў Чэхіі, улада ў польскіх гарадах апынулася ў руках багатых гараджан-немцаў.

**2. Развіццё эканомікі.** Да пачатку Позняга сярэдневякоўя Польшча ўжо прайшла перыяд палітычнай раздробленасці.

Правообладатель Народная асвета




Кракаў. *Мініяцюра канца XV ст.*

*(Успомніце, што такое палітычная раздробленасць.)* У выніку каралеўскіх і княжацкіх раздач зямельных уладанняў шляхце і духавенству з'яўлялася прыватнае землеўладанне — *вотчыны*. Гэта стала асновай для развіцця феадальных адносін.

Развіццю феадалізму ў Польшчы спрыяла таксама засваенне новых зямель, якое пачалося яшчэ ў XII ст., паводле так званага нямецкага права.

Першапачаткова перасяленцамі былі галоўным чынам немцы. Яны атрымлівалі асобыя граматы на валоданне засвоенымі імі землямі.

У XIV—XV стст. хутка расла колькасць гарадоў. У іх паспяхова развівалася цэхавае рамяство. Але гарадское насельніцтва было адносна невялікім. Самымі буйнымі гарадамі ў Польшчы XIV ст. былі Гданьск і Вроцлаў (па 20 тысяч жыхароў). Пераважалі ж гарады з некалькімі сотнямі жыхароў.

Рос унутраны і знешні гандаль. У Польшчы здабываліся соль, жалеза, свінец. Гэтыя тавары карысталіся попытам у суседніх краінах.

Правообладатель Народная асвета



Казімір III Вялікі.
*Мастак Я. Матэйка*

**3. Казімір III Вялікі.** У пачатку XIV ст. Польшча была зноў аб'яднана пад уладай аднаго валадара. Асабліва ўмацавалася каралеўская ўлада пры ***Казіміры III Вялікім*** (1333—1370 гг.).

Кароль падтрымліваў развіццё гандлю і рамяства, клапаціўся аб будаўніцтве дарог. Пры ім была праведзена грашовая рэформа. Развіццё гандлю патрабавала ўвядзення больш буйной манеты — гроша.

Асобую ўвагу Казімір III удзяляў гарадам. Некаторыя з іх былі перабудаваны, пашыраны, абнесены новымі каменнымі сценамі. Таму гаварылі, што Казімір III «атрымаў Польшчу драўлянай, а пакінуў яе каменнай». У гэтыя гады шмат гарадоў атрымалі права на самакіраванне. Узорам для яго служыла кіраванне нямецкага горада Магдэбурга — ***магдэбургскае права***.

За час свайго доўгага праўлення Казімір III больш чым удвая павялічыў тэрыторыю Польскай дзяржавы. Былі наладжаны адносіны з Тэўтонскім ордэнам. Аднак рыцары захавалі ўладу над Памор'ем — вобласцю, заселенай славянамі, якая давала выхад у Балтыйскае мора. *(Знайдзіце на карце (гл. с. 88) гэтую тэрыторыю.)*

**4. Польшча і Тэўтонскі ордэн.** Правіцелі, якія апынуліся на польскім троне пасля Казіміра III, не здолелі захаваць моцную ўладу. У **1374** г. кароль Людовік выдаў ***Кошыцкі прывілей***. Ён даваў шляхце значныя прывілеі. Галоўнай з іх было вызваленне шляхты ад усіх падаткаў і абавязкаў перад дзяржавай, акрамя вайсковай службы. У выніку дзяржаўная казна пазбавілася важнай крыніцы даходаў. Кароль апынуўся ў залежным становішчы ад шляхты. У далейшым гэта залежнасць узрастала.

Правообладатель Народная асвета

Аслабленне каралеўскай улады ў Польшчы адмоўна адбілася на яе магчымасці супрацьстаяць націску Тэўтонскага ордэна. Рыцары-крыжаносцы планамерна захоплівалі землі Прыбалтыкі.

Тэўтонскі ордэн быў галоўным праціўнікам не толькі Польшчы, але і Вялікага княства Літоўскага. Агульная пагроза зблізіла дзве суседнія краіны. У выніку ў **1385** г. была заключана ***Крэўская унія*** паміж Польшчай і Вялікім княствам Літоўскім.

***Гістарычная даведка***

Паводле ўмоў заключанай у замку Крэва уніі юная польская каралева Ядвіга павінна была пайсці замуж за вялікага князя літоўскага Ягайлу, які станавіўся польскім каралём. Ягайла прыняў каталіцтва (разам з гэтым і новае імя — Уладзіслаў) і абяцаў схіліць насельніцтва сваёй краіны да рымскай веры. У 1386 г. адбылася жаніцьба, і Ягайла быў урачыста каранаваны ў Кракаве — старажытнай сталіцы Польшчы. Яшчэ са смерцю Казіміра III, які не пакінуў сына-нашчадка, старажытная дынастыя Пястаў спынілася. З гэтага часу ў Польшчы пачала кіраваць каралеўская дынастыя Ягелонаў (на польскай мове імя Ягайлы гучала як Ягела).

Заключэнне Крэўскай уніі азначала, што у дзвюх дзяржаў будзе агульны валадар. Але пры гэтым поўнага аб'яднання не адбылося: у кожнай з іх захаваліся свае законы, свая сістэма кіравання.

Крэўская унія дала магчымасць аб'яднаць сілы Польшчы і Вялікага княства Літоўскага ў барацьбе з Тэўтонскім ордэнам. У 1409—1411 гг. адбылася *Вялікая вайна*. Перад яе пачаткам вялікі магістр Ордэна заключыў саюз са Свяшчэннай Рымскай імперыяй і Венгрыяй. На баку ж Польшчы і Вялікага княства Літоўскага ў вайне прынялі ўдзел воіны некаторых рускіх княстваў і татары. Будучы ваенны правадыр гусітаў Ян Жыжка прывёў чэшскі атрад.

Правообладатель Народная асвета



Польшча і суседнія краіны ў пачатку XV ст.


Грунвальдская бітва. *Фрагмент карціны Я. Матэйкі*

Рашаючая бітва адбылася 15 ліпеня **1410** г. каля вёскі ***Грунвальд***. Тэўтонскія рыцары пацярпелі сакрушальнае паражэнне. Моц Ордэна была падарвана.

Аднак барацьба працягвалася. Толькі ў **1466** г. згодна з умовамі заключанага міру Тэўтонскі ордэн адмовіўся ад захопленых польскіх зямель. Усходняе Памор'е было далучана да Польшчы. Яна атрымала выхад да Балтыйскага мора. Тэрыторыя Ордэна, якая засталася, апынулася ў залежнасці ад польскага караля.

**5. Культура Польшчы XIV—XV стст.** У Познім сярэдневякоўі ў Польшчы была створана свая самабытная культура.

Для развіцця польскай культуры ў гэты перыяд важнае значэнне мела заснаванне ў **1364** г. Кракаўскага універсітэ-

Правообладатель Народная асвета

та. *(Успомніце, дзе і калі быў адкрыты першы універсітэт у Цэнтральнай Еўропе.)* Акрамя таго, сотні польскіх юнакоў выязджалі вучыцца за мяжу. У XV ст. часцей за ўсё яны ехалі ў Італію.

З XV ст. у Польшчы ўсё больш стала з'яўляцца твораў літаратуры і навуковых прац, якія былі напісаны не на лацінскай, а на польскай мове. Неўзабаве пасля вынаходства Іагана Гутэнберга пачалося кнігадрукаванне і ў Польшчы.

Самым вядомым гісторыкам Польшчы па праву лічыцца ***Ян Длугаш*** (1415—1480 гг.). Ім была напісана «Гісторыя Польшчы» ў 12 кнігах. У ёй апісаны падзеі з найстаражытнейшых часоў да канца XV ст. Праца Длугаша змяшчае вельмі каштоўныя звесткі і па гісторыі ўсходнеславянскіх зямель.

У Познім сярэдневякоўі ў Польшчы было пабудавана шмат храмаў, палацаў, гарадскіх ратуш, жылых дамоў. Як і ў Чэхіі, панаваў гатычны стыль. Кракаў, Варшава, Познань сталі аднымі з найпрыгажэйшых еўрапейскіх гарадоў.

**1.** Якія саслоўі складалі познесярэдневяковае польскае грамадства? **2.** Што было характэрна для развіцця польскай эканомікі ў XIV—XV стст.? **3.** За якія заслугі Казімір III атрымаў імя Вялікі? **4.** Ахарактарызуйце становішча Польшчы пасля смерці Казіміра III. **5.** Чым завяршылася супрацьстаянне Польшчы і Тэўтонскага ордэна? **6.** Раскажыце аб развіцці польскай культуры ў Познім сярэдневякоўі.

## § 16. Краіны Балканскага паўвострава ў XIV—XV стст.

**Успомніце:** **1.** Якія дзяржавы існавалі на Балканскім паўвостраве ў Высокім сярэдневякоўі? **2.** Які характар мелі адносіны Візантыі са славянскімі дзяржавамі на Балканскім паўвостраве ў Раннім і Высокім сярэдневякоўі? **3.** Калі ўзнікла Другое Балгарскае царства? **4.** Што адбылося з Візантыйскай імперыяй у пачатку XIII ст.?

**1. Дзяржавы паўднёвых славян напярэдадні турэцкага заваявання.** У пачатку Позняга сярэдневякоўя большасць сла-

Правообладатель Народная асвета



Стэфан Душан.
*Фрэска XIV ст.*

вянскіх дзяржаў на Балканскім паўвостраве захоўвала незалежнасць. Толькі Харватыя апынулася ў складзе Венгерскага каралеўства. *(Успомніце, калі і пры якіх абставінах гэта адбылося.)*

Самай моцнай дзяржавай на Балканах стала ***Сербія***. Свайго росквіту яна дасягнула ў час праўлення ***Стэфана Душана*** (1331—1355 гг.). Гэты выдатны правіцель быў нашчадкам Стэфана Нямані. *(Успомніце, якую ролю адыграў Стэфан Няманя ў гісторыі Сербіі.)* Стэфан Душан вёў безупынныя войны з суседнімі дзяржавамі — Візантыяй і Венгрыяй. У выніку да Сербіі былі далучаны бліжэйшыя тэрыторыі, дзе жылі славяне, албанцы, грэкі.

***Гістарычная даведка***

Стэфан Душан быў таленавітым палкаводцам, дыпламатам. З яго імем таксама звязана стварэнне збору законаў — «Законніка» Стэфана Душана. Яго змест сведчыць аб тым, што ў Сербіі склалася феадальнае грамадства. Сяляне ў сярэдзіне XIV ст. ужо знаходзіліся ў залежнасці ад сваіх гаспадароў, на карысць якіх выконвалі разнастайныя павіннасці.

Каб паказаць сваю веліч, Стэфан Душан прыняў тытул «цара сербаў і грэкаў». У яго планах было стварэнне вялізнай імперыі з цэнтрам у Канстанцінопалі. Аднак хутка пасля смерці Стэфана Душана яго дзяржава распалася на некалькі незалежных уладанняў. Іх правіцелі вялі пастаянныя войны адзін з другім.

***Балгарыя*** (Другое Балгарскае царства) пры ***Іване Аляксандры*** (1331—1371 гг.) была яшчэ даволі моцнай дзяржавай. Але ўжо ў перыяд яго праўлення пачалося раздрабленне Балгарыі, а пасля яго смерці краіну сталі захопліваць туркі-асманы.

Правообладатель Народная асвета

**2. Асманскія заваяванні на Балканах.** Даўнім сапернікам славянскіх дзяржаў на Балканскім паўвостраве была Візантыйская імперыя. Але Візантыя пасля панавання на яе тэрыторыі крыжаносцаў ужо не магла ўзнавіць сваю былую магутнасць. *(Успомніце, якую дзяржаву заснавалі крыжаносцы на тэрыторыі Візантыі.)* Правіцелі дынастыі Палеалогаў з цяжкасцю захоўвалі ўладу ў дзяржаве. У барацьбе са сваімі ворагамі Візантыі не хапала ўласных сіл. Таму яна старалася пасварыць сваіх ворагаў паміж сабой і выкарыстаць сілы адных у вайне супраць іншых. Так, у войнах з Сербіяй і Балгарыяй Візантыя выкарыстала дапамогу туркаў-асманаў.

Туркі-асманы ўтварылі сваю дзяржаву ў Малой Азіі, якая некалі належала Візантыі. *(Знайдзіце на карце Малую Азію.)* Паступова яны сталі прасоўвацца на захад, захопліваючы ўсё больш візантыйскіх уладанняў. Унутраныя непарадкі ў імперыі ў сярэдзіне XIV ст. дазволілі туркам-асманам перайсці да заваёў на Балканскім паўвостраве. Урадлівыя землі і прыродныя багацці краю прыцягвалі заваёўнікаў.

Пакінуўшы Канстанцінопаль у сябе ў тыле, туркі-асманы рушылі на дзяржавы паўднёвых славян. Нягледзячы на страшэнную пагрозу, якая насоўвалася з усходу,




Заваяванне туркамі-асманамі Балканскага паўвострава

Правообладатель Народная асвета

балканскія правіцелі не здолелі аб'яднацца. Да канца XIV ст. заваёўнікі авалодалі ўсімі балгарскімі землямі. Крыху раней яны ўзяліся за падпарадкаванне Сербіі.

**3. Бітва на Косавым полі.** Сербы і баснійцы (паўднёваславянскі народ, які меў у той час сваю невялікую дзяржаву) паспрабавалі спыніць заваёўнікаў-туркаў і нават здолелі нанесці ім паражэнне. Але поспех быў часовым.

15 чэрвеня **1389** г. на *Косавым полі* ў самым цэнтры Балканскага паўвострава адбылася вырашальная бітва. Моцнай турэцкай арміі (яна пераважала па колькасці воінаў) на чале з султанам Мурадам I супрацьстаяла аб'яднанае войска сербаў і баснійцаў.

*Гістарычная даведка*

Славяне ў бітве на Косавым полі паказалі цуды гераізму. Так, у пачатку бою сербскі воін Мілаш Абіліч пракраўся ў турэцкі лагер, назваўшыся дарадчыкам султана. Разумеючы, што шансы сербаў выйграць бітву невялікія, ён вырашыў ахвяраваць сваім жыццём. Храбры серб закалоў султана, але пры гэтым загінуў сам.

Войска славян пацярпела на Косавым полі жорсткае паражэнне. Сілы былі занадта няроўнымі. Па словах аднаго з сучаснікаў, туркаў-асманаў было такое мноства, што калі б лінуў лівень, то ніводнай кроплі не давялося б упасці на зямлю, а ўсе ўпалі б на турэцкіх воінаў і іх коней. У бітве загінуў сербскі князь ***Лазар***. Яго пераемнік вымушаны быў прызнаць сваё падпарадкаванне туркам-асманам. Неўзабаве туркі-асманы падпарадкавалі ўсе балканскія дзяржавы. Адсутнасць адзінства паўднёваславянскіх народаў, войны паміж імі, раздробленасць Балгарыі і Сербіі сталі прычынамі заваявання іх туркамі-асманамі.

**4. Падзенне Канстанцінопаля.** Поўнаму панаванню туркаў-асманаў на Балканскім паўвостраве перашкаджала Візантыя, якая захоўвала яшчэ сваю незалежнасць. Да пачатку XV ст. ёй была падуладна зусім невялікая тэрыторыя

Правообладатель Народная асвета



Мехмед II захоплівае Канстанцінопаль.
*Мастак Ф. Занаро*

паміж Чорным і Мармуровым морамі, а таксама частка Грэцыі і бліжэйшых астравоў. *(Знайдзіце на карце (гл. с. 91) гэтыя тэрыторыі.)* З усіх бакоў гэта «імперыя» была абкружана турэцкімі ўладаннямі.

У крытычны момант Візантыя не здолела атрымаць істотнай дапамогі ад еўрапейскіх дзяржаў. Разлічваючы на яе, імператар Візантыі пайшоў нават на аб'яднанне каталіцкай і праваслаўнай цэркваў. У **1439** г. у Фларэнцыі на сумесным саборы адбылося ўрачыстае аб'яднанне дзвюх галін хрысціянскай царквы — была заключана царкоўная унія. Яна дапускала значныя ўступкі на карысць Рыма, таму мала хто з праваслаўных прыняў гэтую унію.

У красавіку 1453 г. туркі-асманы, спусташыўшы да гэтага часу ўсе навакольныя вобласці, пачалі аблогу Канстанцінопаля. Сілы абаронцаў горада былі зусім нязначныя: разам з атрадамі італьянскіх гарадоў-дзяржаў Венецыі і Генуі — каля 10 тысяч чалавек. У той жа час турэцкая армія налічвала больш за 150 тысяч воінаў. Нават сербы вылучылі дапаможныя войскі ў султанскую армію.

29 мая **1453** г. пасля шалёнага штурму туркі-асманы ўварваліся ў горад і перабілі яго абаронцаў. У бітве загінуў і апошні візантыйскі імператар Канстанцін XI Палеалог. Візантыя як дзяржава перастала існаваць.

**5. Балканы пад уладай Асманскай імперыі.** Наступствы асманскага заваявання Балканскага паўвострава аказаліся жахлівымі. Былі забіты або захоплены для продажу ў рабства дзясяткі тысяч людзей. Буйнейшыя гарады туркі-асманы раз-

Правообладатель Народная асвета

бурылі дашчэнту. Іх жыхары вымушаны былі бегчы ў горы, дзе потым заснавалі новыя гарады.

Але жыццё працягвалася, і насельніцтва заняволеных славянскіх зямель павінна было прыстасоўвацца да новых умоў. Туркі-асманы жадалі спакою ў захопленых землях і своечасовага паступлення падаткаў. Таму яны захавалі на сваіх пасадах праваслаўных свяшчэннікаў і епіскапаў. Захоўваліся і сельскія абшчыны з іх ранейшымі кіраўнікамі.

Становішча хрысціян у ісламскай дзяржаве — Асманскай імперыі — было вельмі цяжкім. Хрысціяне плацілі значна большыя, чым мусульмане, падаткі за карыстанне зямлёй. Яны не мелі права насіць зброю, ездзіць вярхом на кані і насіць адзенне сіняга і зялёнага колераў.

**Гістарычная даведка**

У Асманскай імперыі для хрысціян асабліва цяжкім з'яўляўся так званы «падатак крывёю». У тых сем'ях, дзе было некалькі сыноў, аднаго з іх забіралі ў школы Стамбула і іншых буйных турэцкіх гарадоў. Пазней яны служылі пры двары султана або станавіліся янычарамі — воінамі асобага турэцкага войска.

Заваёва туркамі-асманамі Балканскага паўвострава адмоўна адбілася на далейшым лёсе славянскіх і іншых народаў, якія тут жылі. На многія стагоддзі паўднёвыя славяне, як грэкі і албанцы, апынуліся пад турэцкім прыгнётам.

**1.** Якім было становішча дзяржаў паўднёвых славян напярэдадні турэцкага заваявання? **2.** Калі і як пад уладу туркаў-асманаў трапілі Балгарыя і Сербія? **3.** Назавіце прычыны поспехаў турэцкіх султанаў пры заваяванні краін Балканскага паўвострава. **4.** Растлумачце, чаму імператар Візантыі вымушаны быў пагадзіцца на заключэнне царкоўнай уніі з каталіцкай царквой? **5.** Раскажыце, калі і як перастала існаваць Візантыйская імперыя. **6.** Якія наступствы для краін Балканскага паўвострава мелі падзеі, што адбыліся ў 1389 і 1453 гг.? **7.** Складзіце хроніку турэцкіх заваёў на Балканскім паўвостраве.

Правообладатель Народная асвета

## § 17. Узмацненне Маскоўскага княства

**Успомніце:** **1.** Якое княства было адным з наймацнейшых у Паўночна-Усходняй Русі ў другой палове XII — пачатку XIII ст.? **2.** Якія былі вынікі мангольскага нашэсця на Русь? **3.** У чым выяўлялася залежнасць зямель Русі ад Залатой Арды?

**1. Узвышэнне Маскоўскага княства.** З XIV ст. у гісторыі ўсходніх славян асобнае месца заняла Масква. Менавіта гэты горад стаў адным з цэнтраў аб'яднання рускіх зямель і з цягам часу ўзначаліў іх барацьбу з мангола-татарскім ярмом.

Масква вядома з 1147 г. Але цэнтрам самастойнага княства яна стала толькі ў 1270 г. У гэты час яе атрымаў у спадчыну, як свой удзел, малодшы сын Аляксандра Неўскага Даніла. *(Успомніце, чым вядомы Аляксандр Неўскі.)* ***Удзелам*** (ад слова «доля») называлі тэрыторыю з адным або некалькімі гарадамі, якую абавязкова атрымліваў прадстаўнік княжацкай сям'і ў агульным радавым уладанні.

Першапачаткова Маскоўскае княства было адным з самых нязначных у Паўночна-Усходняй Русі. У канцы XIII ст. тут размяшчалася больш за дзесятак буйных княстваў. Чаму ж менавіта Маскве наканавана было стаць на чале аб'яднання зямель Паўночна-Усходняй Русі?

Гісторыкі называюць некалькі прычын. Так, выгадным было геаграфічнае становішча Масквы. Праз яе праходзілі ажыўленыя гандлёвыя шляхі. Яна размяшчалася далёка ад небяспечнай мяжы з Залатой Ардой, таму сюды перасяляліся людзі з іншых княстваў. Разам з простымі земляробамі і рамеснікамі ў Маскву прыходзілі феадалы. Маскоўскаму князю трэба было забяспечыць іх зямельнымі ўладаннямі. А гэта вымушала яго захопліваць суседнія землі, бо сваіх было мала. Для пашырэння меж княства даводзілася нават ісці на пагадненне з ворагамі Русі — татарамі. Узмацненню Масквы спрыяла і тое, што яе саюзнікам была праваслаўная царква.

Правообладатель Народная асвета

**Гістарычная даведка**

Пасля спусташэння Кіева манголамі мітрапаліт кіеўскі і ўсяе Русі пераехаў у галоўны горад Паўночна-Усходняй Русі — Уладзімір. Неўзабаве ён стаў падоўгу затрымлівацца ў Маскве. А ў 1328 г. мітрапаліт канчаткова перабраўся ў Маскву.

Поспеху Масквы спрыяла і сітуацыя, якая ўдала для яе складвалася ва Усходняй Еўропе, перш за ўсё аслабленне яе праціўнікаў. Гэтым умела карысталіся маскоўскія князі.

**2. Першыя маскоўскія князі.** Даніла Аляксандравіч быў роданачальнікам дынастыі маскоўскіх князёў. Ужо ў перыяд яго праўлення ў самым пачатку XIV ст. да Масквы быў далучаны багаты горад Разанскага княства — Каломна. Затым Масква здолела атрымаць частку Смаленскага княства з горадам Мажайскам. Ён стаў апорным пунктам яе абароны на захадзе. *(Знайдзіце на карце (гл. с. 103) гэтыя гарады.)*

Галоўным горадам у Паўночна-Усходняй Русі ў гэты час быў Уладзімір. *(Успомніце, якія моцныя князі кіравалі ва Уладзіміры ў другой палове XII — пачатку XIII ст.)* Той, хто валодаў *Уладзімірскім вялікім княжаннем*, станавіўся старэйшым князем ва ўсёй Паўночна-Усходняй Русі. Пытанне аб тым, хто будзе вялікім князем, вырашаў хан Залатой Арды. Ён выдаваў асобыя дакументы — ***ярлыкі*** на княжанне.

Ужо сын маскоўскага князя Данілы Аляксандравіча Юрый пачаў барацьбу за Уладзімір. Галоўным яго праціўнікам быў цвярскі князь, які трывала сядзеў на ўладзімірскім троне. Многія гады Масква вяла барацьбу з Цвер'ю. Маскоўскага князя падтрымліваў ардынскі хан. Аднак татары не жадалі празмернага ўзмацнення каго-небудзь з рускіх князёў, таму стараліся пасварыць іх аднаго з другім.



Рускі князь у ардынскага хана. *З гравюры мастака В. В. Верашчагіна*

Правообладатель Народная асвета

Толькі ў 1327 г. брат Юрыя ***Іван Каліта*** (1325—1340 гг.) здолеў умацавацца на вялікім княжанні ва Уладзіміры.

***Гістарычная даведка***

У 1327 г. паўсталі жыхары Цверы. Да іх у горад з'явіўся татарскі баскак Чалхан (на Русі яго называлі Шчалканам). *(Успомніце, хто такія баскакі.)* Самадурства і здзекі баскака выклікалі выбух абурэння. Чалхан быў забіты. Да паўстанцаў прымкнуў і цвярскі князь. Хан Залатой Арды адправіў на Цвер карны атрад. Да яго далучыўся маскоўскі князь Іван Каліта. Жорсткая расправа над цверычамі надоўга аслабіла Цвярское княства, затое ўмацавала становішча маскоўскага князя. Ардынскі хан, пераканаўшыся ў яго адданасці, перастаў пасылаць на Русь баскакаў. Галоўным зборшчыкам даніны для Арды стаў Іван Каліта. У той жа час ён атрымаў ад ардынскага хана ярлык на вялікае княжанне ва Уладзіміры.

Пры Іване Каліце Маскоўскае княства стала самым моцным у Паўночна-Усходняй Русі. Вялікае княжанне ў яго ўжо ніхто не мог аспрэчыць. Збор даніны з княстваў Паўночна-Усходняй Русі даў магчымасць маскоўскаму князю значна разбагацець. За гэта ён і атрымаў сваю мянушку «Каліта» — «кашэль для грошай». Павялічыліся і яго зямельныя ўладанні. Гэта дазваляла рабіць шчодрыя раздачы зямлі феадалам, якія аддана служылі князю. Дзякуючы гэтаму стала больш моцным маскоўскае войска.

Палітыку Івана Каліты прадоўжылі яго сыны — Сямён Горды і Іван Красны. Акрамя спадчыннага ўладання — Маскоўскага княства, ім належала Уладзімірскае вялікае княжанне. Прызнаў уладу маскоўскіх князёў і свабодалюбівы Ноўгарад Вялікі. Але ён яшчэ захоўваў сваю незалежнасць.

**3. Дзмітрый Данскі.** Улада маскоўскага князя ***Дзмітрыя Іванавіча*** (1359—1389 гг.) настолькі ўмацавалася, што ён змог кінуць выклік Залатой Ардзе. У самой Ардзе ў 50-х гг. XIV ст. пачаліся міжусобіцы. За 20 гадоў там змянілася больш за 20 ханаў. Нарэшце да сярэдзіны 70-х гг. XIV ст. уладу здолеў захапіць Мамай.

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная даведка*

Мамай не з'яўляўся нашчадкам Чынгісхана. Таму ён быў вымушаны кіраваць у Залатой Ардзе ад імя падстаўных, паслухмяных яму ханаў. Але многія татарскія ханы не прызналі Мамая.

Рыхтуючыся да змагання супраць Залатой Арды, князь Дзмітрый Іванавіч вырашыў засцерагчы ад небяспекі свае тылы. У 1375 г. аб'яднанае войска падуладных і саюзных яму зямель захапіла Цвер. Цвярскі князь вымушаны быў скарыцца Маскве.

Дзмітрый Іванавіч быў таленавітым палітыкам. Для барацьбы з ардынцамі ён здолеў з'яднаць многіх рускіх князёў.

**4. Бітва на Куліковым полі і яе значэнне.** У самым канцы лета 1380 г. палкі, якія павёў Дзмітрый Іванавіч, выступілі супраць татараў. З часу бітвы на рацэ Калцы рускія воіны не выходзілі насустрач татарам у стэп. *(Успомніце, калі адбылася бітва на Калцы і якія былі яе вынікі.)*

Пераправіўшыся праз Дон, войска Дзмітрыя Іванавіча размясцілася на Куліковым полі. Тут 8 верасня **1380** г. адбылася адна з самых грандыёзных бітваў у рускай гісторыі. Потым летапісцы і пісьменнікі назавуць яе «сечай на полі Куліковым, на рэчцы Няпрадва», «Мамаевым пабоішчам».



Кальчуга XIV ст.
*Рэканструкцыя*

*Гістарычная крыніца*

**«Сказанне пра Мамаева пабоішча».** І сышліся грозна абедзве сілы вялікія, цвёрда змагаючыся, жорстка адзін другога знішчаючы, не толькі ад зброі, але і ад жудаснай цеснаты пад конскімі капытамі каналі, бо немагчыма было ўмясціцца ўсім на тым полі Кулікове: было поле тое цеснае паміж Донам і Мечаю. На тым жа полі моцныя войскі сышліся, з іх выступалі крывавыя зоры, а ў іх трымцелі маланкі ад бляску мячоў. І быў трэск і гром вялікі ад пераломленых коп'яў і ад удараў мячоў...

Правообладатель Народная асвета

У бязлітаснай бітве вырашальную ролю сыграў раптоўны ўдар засаднага палка пад кіраўніцтвам князёў Уладзіміра Андрэевіча Храбрага і Дзмітрыя Баброк-Валынскага. Супраціўленне татараў было зломлена, войскі Мамая пацярпелі паражэнне. Маскоўскі князь Дзмітрый Іванавіч пасля бітвы быў празваны Данскім (ён удзельнічаў у бітве як радавы воін). Геніяльны план бітвы быў прыдуманы загадзя.



Раніца на Куліковым полі.
*Мастак А. П. Бубнаў*

Значэнне Кулікоўскай перамогі вялікае. Упершыню былі разгромлены асноўныя сілы Залатой Арды. Цяпер не заставалася сумненняў, што Русь можа змагацца з татарамі і перамагаць іх. У свядомасці народа мацнела ўпэўненасць у немінучым падзенні мангола-татарскага ярма.

**5. Знешняя палітыка Маскоўскага княства ў другой палове XIV ст.** Аб'яднанне зямель Русі вакол Масквы адбывалася ў жорсткай барацьбе з суседнімі дзяржавамі.

У другой палове XIV ст. праціўнікам Маскоўскага княства стала Вялікае княства Літоўскае. Яго правіцелі таксама ставілі за мэту аб'яднанне пад сваёй уладай усходнеславянскіх зямель.

У 1368 г. і 1370 г. да Масквы падступаў вялікі князь літоўскі Альгерд. Ён выступіў у абарону свайго цесця — цвярскога князя. Але ўзяць Маскву, напярэдадні ўмацаваную князем Дзмітрыем Іванавічам новымі белакаменнымі сценамі, не змог. Трэці паход Альгерда ў 1372 г. завяршыўся заключэннем міру. Князі спрабавалі вырашыць спрэчкі перагаворамі, а не вайной.

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная даведка*

У ваенным супрацьстаянні Масквы і Арды ў 1380 г. вялікі князь літоўскі Ягайла заняў бок Мамая. Ён нават ішоў на дапамогу да ардынскага валадара з моцным войскам, але прыняць удзел у бітве не адважыўся. Для воінаў Ягайлы татары былі не менш ненавісныя, чым для маскоўскіх. Да таго ж да Дзмітрыя Данскога далучыліся са сваімі дружынамі некаторыя князі, падуладныя Ягайлу.



Абарона Масквы ад войскаў Тахтамыша. *Мініяцюра XVI ст.*

Пасля разгрому Мамая на Куліковым полі ўлада ў Ардзе перайшла да хана Тахтамыша. У 1382 г. ён захапіў і спаліў Маскву. Мангола-татарскае ярмо для Паўночна-Усходняй Русі было адноўлена. Але ранейшай залежнасці ўжо не было. Так, Дзмітрый Данскі перадаў і Маскоўскае княства, і Уладзімірскае вялікае княжанне па спадчыне сваму сыну Васілю, не спытаўшы дазволу ў хана Залатой Арды. Васіль Дзмітрыевіч прымірыўся з вялікім князем літоўскім Вітаўтам. Іх аб'яднала барацьба з агульным ворагам — Залатой Ардой. Ад татарскіх набегаў аднолькава пакутавалі абедзве дзяржавы. Але ў 1399 г. Вітаўт пацярпеў скрышальнае паражэнне ад татараў на р. Ворскле. Планы сумеснай барацьбы з Ардой былі разладжаны.

У XV ст. Маскоўскае княства выступала значна ўзмоцненым, да яго былі далучаны многія землі Русі. Але яно па-ранейшаму падпарадкоўвалася Залатой Ардзе.

**1.** Чаму менавіта Маскоўскае княства стала на чале аб'яднання зямель Паўночна-Усходняй Русі? **2.** Якую ролю адыгрываў у Паўночна-Усходняй Русі горад Уладзімір? **3.** Раскажыце аб дзейнасці першых маскоўскіх князёў па ўзмацненні свайго княства. **4.** Якія важныя падзеі адбыліся ў час праўлення маскоўскага князя Дзміт-

Правообладатель Народная асвета

рыя Іванавіча? **5.** Калі адбылася Кулікоўская бітва, у чым яе значэнне? **6.** Раскажыце аб адносінах Маскоўскага княства з Вялікім княствам Літоўскім і Залатой Ардой у другой палове XIV ст. **7.** Дайце вызначэнне паняццю «ўдзел».

## § 18. Стварэнне адзінай Расійскай дзяржавы

**Успомніце:** **1.** Калі ў Старажытнай Русі наступіў перыяд палітычнай раздробленасці? **2.** У чым былі асаблівасці ладу Наўгародскай баярскай рэспублікі? **3.** Калі на Русі ўстанавілася мангола-татарскае ярмо?

**1. Феадальная вайна другой чвэрці XV ст.** На некаторы час няўхільнае ўзвышэнне Маскоўскага княства прыпынілася з прычыны ўнутранага бязладдзя. Яно ўзнікла з-за спрэчак аб атрыманні ў спадчыну маскоўскага прастола.

У 1425 г. памёр маскоўскі вялікі князь ***Васіль I Дзмітрыевіч***. Сваім спадчыннікам ён пакінуў малалетняга сына Васіля. Але на ўладу прэтэндаваў яго дзядзька, брат Васіля I, князь галіцкі і звянігарадскі Юрый Дзмітрыевіч.

**Васіль II Васілевіч** (1425—1462 гг.), хоць і быў яшчэ дзіцём, некалькі гадоў трывала сядзеў на прастоле свайго бацькі. Моцную падтрымку яму аказваў вялікі князь літоўскі Вітаўт. Справа ў тым, што маці Васіля II Соф'я з'яўлялася дачкой літоўскага валадара. Але ў 1430 г. Вітаўт памёр, і ўжо ў наступным годзе супраць пляменніка адкрыта выступіў яго дзядзька, Юрый Дзмітрыевіч. Так пачалася дынастычная барацьба за маскоўскі прастол. Гісторыкі называюць яе феадальнай вайной.

Юрый Дзмітрыевіч зусім ненадоўга захапіў Маскву. Але менавіта ён даў ёй герб — «Георгій Пераможац, які паражае змея». Пасля смерці Юрыя Дзмітрыевіча барацьбу з Васілём II працягвалі яго сыны. Маскоўскі князь быў бяздарным палкаводцам, бо ён прайграваў бітвы і сваім стрыечным братам, і татарам. У 1446 г. ён нават трапіў у палон і быў асляплены (таму атрымаў мянушку «Цёмны»). Тым не менш Васіль II выйшаў пераможцам з зацяжной феадальнай вайны. Рашаючай аказалася падтрымка маскоўскага князя з боку буйных землеўла-

Правообладатель Народная асвета



Іван III.
*Гравюра XV ст.*

дальнікаў — баяр. *(Як вы лічыце, чаму баяры падтрымалі маскоўскага князя?)*

У перыяд феадальнай вайны другой чвэрці XV ст. пераважала аб’яднальная палітыка Масквы. У вайне ніхто не аспрэчваў яе безумоўнае вяршэнства. Князі, што сапернічалі, імкнуліся авалодаць менавіта маскоўскім прастолам, а не ўзвысіць сваё княства.

**2. Іван III — «гасудар усяе Русі».** Пасля феадальнай вайны ўлада маскоўскага князя яшчэ больш умацавалася. Ужо з канца XIV ст. не Уладзімір, а Масква з’яўлялася галоўным горадам Паўночна-Усходняй Русі. З той пары гэту частку рускіх зямель гісторыкі могуць называць Маскоўскай Руссю.

Васіль II Цёмны ў апошнія гады жыцця зрабіў сваім суправіцелем старэйшага сына Івана. У перыяд самастойнага кіравання ***Івана III*** (1462—1505 гг.) Маскве адзін за адным былі падпарадкаваны ўсе княствы Паўночна-Усходняй Русі — Яраслаўскае, Растоўскае, Цвярское. Гэтыя княствы, як і Маскоўскае, называліся вялікімі.

У **1478** г. да Масквы была канчаткова далучана вялізная тэрыторыя Наўгародскай рэспублікі. Надзеі наўгародцаў на дапамогу літоўскага і польскага правіцеля Казіміра IV не спраўдзіліся. Іван III, які аблажыў Ноўгарад Вялікі з вялікім войскам, патрабаваў: «Вечавому звону ў Ноўгарадзе не быць; пасадніку не быць, а дзяржаву ўсю нам трымаць». Гэтыя ўмовы наўгародцамі былі прыняты.

За час кіравання Івана III тэрыторыя Маскоўскага княства вырасла больш чым у 5 разоў. Пасля далучэння да Масквы Наўгародскай зямлі ў 1478 г. і ліквідацыі незалежнасці Цвярскога вялікага княства ў 1485 г. Іван III стаў называцца не толькі вялікім князем маскоўскім, але і «гасударом усяе Русі».

Правообладатель Народная асвета

Вялікае княства Маскоўскае атрымала прызнанне на міжнародней арэне. Іван III у другім шлюбе ажаніўся з пляменніцай апошняга візантыйскага імператара Соф'яй Палеалог. *(Успомніце, што адбылося з Візантыйскай імперыяй у 1453 г.)* Магчыма, дзякуючы яе пасрэдніцтву Вялікае княства




Рост тэрыторыі Маскоўскага княства

Правообладатель Народная асвета

Маскоўскае атрымала герб — двухгаловага арла. Цяпер маскоўскі правіцель мог прэтэндаваць на «візантыйскую спадчыну» — землі, захопленыя туркамі-асманамі. Аднак, як і больш за 200 гадоў таму, Вялікае княства Маскоўскае павінна было плаціць даніну татарам.

**3. Падзенне мангола-татарскага ярма.** У XV ст. Залатая Арда распалася на некалькі незалежных дзяржаў. Самай моцнай з іх з'яўлялася Вялікая Арда. Яна займала тэрыторыю паміж Волгай і Донам, Ніжняе Паволжа і Паўночны Каўказ. Менавіта ёй працягвала плаціць даніну Вялікае княства Маскоўскае.

Вялікая Арда варагавала з іншымі татарскімі дзяржавамі — Крымскім і Казанскім ханствамі, Нагайскай Ардой.

У 1472 г. хан Вялікай Арды Ахмат накіраваўся на падуладныя Маскве землі «з многімі сіламі». Але Іван III выйшаў насустрач татарам з яшчэ большым войскам. Летапісец пісаў, што хан, убачыўшы мноства рускіх палкоў, «што, як мора, калыхаліся», вымушаны быў у страху вярнуцца назад. З гэтага часу Маскоўская Русь перастала плаціць даніну татарам.



«Стаянне на рацэ Угры».
*Мініяцюра XVI ст.*

Хан Ахмат паспрабаваў прымусіць маскоўскага правіцеля ўзнавіць выплату даніны. У пачатку восені **1480** г. войска Вялікай Арды падышло да прытока ракі Акі — Угры. Сюды ж прыйшлі і маскоўскія палкі. Больш за месяц стаялі праціўнікі на супрацьлеглых берагах ракі Угры. У рэшце рэшт ардынскі хан не асмеліўся ўступіць у бітву са значнымі сіламі маскоўскага князя і адступіў.

Правообладатель Народная асвета

***Гістарычная даведка***

На берагах Угры праціўнікі стаялі да той пары, пакуль рака не замерзла. Ахмат чакаў дапамогі ад літоўска-польскага правіцеля Казіміра IV. Але на землі Вялікага княства Літоўскага спусташальным набегам напаў саюзнік Масквы — крымскі хан. Казіміру IV стала не да вайны з Масквой. Халады ў той год надышлі рана. 26 кастрычніка Угру скаваў лёд. Маскоўскія палкі адышлі ад берага, адкрыўшы пераправы, быццам бы запрашаючы татараў перайсці раку і пачаць бітву. Аднак 11 лістапада 1480 г. татары пайшлі прэч. *(Як вы лічыце, чаму татары не асмеліліся ўступіць у бітву.)*

***«Стаянне на рацэ Угры»*** стала завяршэннем 240-гадовага перыяду мангола-татарскага ярма. Вялікае княства Маскоўскае атрымала поўную незалежнасць.

**4. Адзіная Расійская дзяржава.** У выніку ўмацавання ўлады Івана III і росту яго ўладанняў ва Усходняй Еўропе да пачатку XVI ст. узнікла моцная дзяржава. Паступова, да канца XVI ст., за ёю замацавалася назва ***«Расія»***. У даўнім саперніцтве з Вялікім княствам Літоўскім яна пачала браць верх. Да сваіх уладанняў Іван III далучыў многія яго тэрыторыі і каля 20 гарадоў: Старадуб, Чарнігаў, Гомель, Бранск, Пуціўль і інш.

***Гістарычная даведка***

Новы тытул Івана III — «гасудар усяе Русі» — адкрыта гаварыў аб узмацненні яго ўлады. Паняцце «гасудар» у тыя часы азначала літаральна «гаспадар». Гасударом з'яўляўся ў дачыненні да сваіх людзей уладальнік халопаў. Такім чынам, Іван III разглядаў сваю ўладу як непадзельную, богам дадзеную, якая прэтэндуе на ахоп усёй тэрыторыі ўсходняга славянства, на усю Русь.

Тэрыторыя адзінай Расійскай дзяржавы ў асноўным сфарміравалася ўжо ў час праўлення сына Івана III — ***Васіля III*** (1505—1533 гг.). Яго ўлада ўсталявалася ў Пскоўскай зямлі і Разанскім княстве. У склад Расійскай дзяржавы ўвайшло і Смаленскае княства, якое раней належала Вялікаму княству Літоўскаму.

Правообладатель Народная асвета

Рост тэрыторыі Расійскай дзяржавы быў толькі знешнім бокам яе фарміравання. Унутры дзяржавы ішоў няўхільны працэс абмежавання ўлады раней незалежных князёў, ператварэнне іх з васалаў у падданых. Пры гэтым яны маглі захоўваць свае ўладанні. Такіх князёў называлі ***служылымі*** ці ***службовымі***.

Працэс утварэння адзінай Расійскай дзяржавы меў свае асаблівасці. У Заходняй Еўропе ўтварэнню нацыянальных дзяржаў спрыяла іх эканамічнае развіццё. Ва Усходняй Еўропе найважнейшымі ж былі знешнія абставіны, перш за ўсё неабходнасць аб'яднання сіл для барацьбы з татарамі.

***Гістарычная даведка***

Працэс утварэння адзінай Расійскай дзяржавы меў і іншыя асаблівасці. У Заходняй Еўропе каралі ў барацьбе супраць самаўладдзя феадалаў абапіраліся на багатыя самакіравальныя гарады. На Русі ж гарадское самакіраванне было амаль поўнасцю знішчана ў перыяд мангола-татарскага ярма. Да таго ж утварэнне адзінай Расійскай дзяржавы адбывалася ва ўмовах замаруджанага развіцця феадальных адносін, а заходнееўрапейскія дзяржавы фарміраваліся ў гэты час ужо ва ўмовах распаду феадальных адносін.

Такім чынам, да канца XV ст. Маскоўскае княства з невялікага ўдзела ператварылася ў вялікую і моцную дзяржаву, з якой павінны былі лічыцца буйнейшыя дзяржавы Еўропы і Азіі.

**1.** Што было галоўнай прычынай феадальнай вайны другой чвэрці XV ст. у Маскоўскім княстве? Чым яна закончылася? **2.** Раскажыце, як адбывалася «збіранне рускіх зямель» у час праўлення Івана III. **3.** Калі і як адбылося падзенне мангола-татарскага ярма? **4.** Калі ў асноўным сфарміравалася тэрыторыя адзінай Расійскай дзяржавы? Як змяніўся тытул яе правіцеля? **5.** Якія былі асаблівасці працэсу ўтварэння адзінай Расійскай дзяржавы?

## § 19. Грамадства і гаспадарка Маскоўскай Русі

**Успомніце:** **1.** Якой была структура грамадства Старажытнай Русі? **2.** Якую ролю адыгрывала ў Старажытнарускай дзяржаве княжацкая дружына? **3.** Якія заняткі былі асноўнымі для насельніцтва Старажытнай Русі?

Правообладатель Народная асвета

**1. Феадальнае грамадства.** Разам з утварэннем адзінай Расійскай дзяржавы працягвалася фарміраванне феадальнага грамадства. Для яго была характэрна наяўнасць слою феадалаў-землеўладальнікаў і залежных ад іх сялян.

Уласнасць феадалаў на зямлю магла ўзнікнуць двума шляхамі. Адным з іх быў захоп зямлі членамі абшчыны, якія разбагацелі. Аднак ў Маскоўскай Русі пераважаў іншы шлях. Вярхоўным уласнікам зямлі лічыўся князь. Ён мог падараваць сваім прыбліжаным права збіраць даніну з часткі земель, якія яму падпарадкоўваліся. Карыстаючыся гэтым правам, ***баяры*** (першапачаткова гэта былі найбольш багатыя дружыннікі князя, менавіта яны і атрымлівалі ад князя зямлю) паступова ператвараліся ва ўласнікаў зямлі.

Баярамі з цягам часу сталі называць любых уласнікаў зямлі з сялянамі, а іх уладанні — ***вотчынамі.*** Становішча баяр істотна адрознівалася ад становішча заходнееўрапейскіх феадалаў. Так, на Русі не было баярскіх замкаў. Таму пры ўварванні ворага баяры абаранялі не толькі свае сядзібы, але і ўсё княства.

Найбольш багатыя баяры з'яўляліся прыбліжанымі князя. З часам пры маскоўскім вялікім князю яны склалі ***Баярскую думу***. Гэта была вузкая група людзей, з якімі гасудар мог раіцца па самых розных пытаннях. Сам князь вырашаў, хто ўвойдзе ў Баярскую думу, надзяляючы «думнымі чынамі» адданых яму ўплывовых людзей. *(Як вы лічыце, ці абмяжоўвала Баярская дума ўладу князя?)*

Маскоўскія князі мелі патрэбу ў моцным войску. Але за вайсковую службу трэба было плаціць. Грошай казны не хапала, таму служылым людзям (іх называлі ***дваранамі***) давалі зямельныя ўладанні з сялянамі. У 80-я гг. XV ст. Іван III выселіў з Наўгародскай зямлі многіх баяр, а на іх землі «іспамясціў» маскоўскіх служылых людзей. Так з'явілася другая форма феадальнага землеўладання — ***памесце*** (маёнтак).

Правообладатель Народная асвета

Калі вотчыну яе ўладальнік мог перадаць па спадчыне, то маёнтак лічыўся ўласнасцю вялікага князя. За валоданне ім трэба было несці службу, яго нельга было прадаваць, дарыць, завяшчаць. Праўда, неўзабаве і дваране сталі перадаваць свае маёнткі па спадчыне.

**2. Сельская гаспадарка.** Асноўную масу насельніцтва Маскоўскай Русі складалі земляробы. З канца XIV ст. усіх іх — і залежных, і вольных — пачалі называць ***сялянамі*** (рускае «крестьяне» ад слова «хрысціяне» — тыя, хто прызнаваў хрысціянства, верыў у Ісуса Хрыста і яго вучэнне). Сяляне жылі ў сёлах і вёсках. Сёлы ўяўлялі сабой больш буйныя паселішчы, звычайна ў іх была царква.

Тэрыторыя, падуладная маскоўскаму князю, у Познім сярэдневякоўі актыўна засялялася перасяленцамі з іншых зямель. Людзі адыходзілі далей ад мяжы з Залатой Ардой. Пад раллю расчышчаліся лясы, таму захоўвала сваё значэнне ляднае земляробства. У канцы XV ст. распаўсюдзілася больш прагрэсіўнае *трохполле*. Удасканальваліся і прылады працы.

Земляробства заставалася асноўным заняткам насельніцтва. Сяляне вырошчвалі галоўным чынам жыта, крыху менш пшаніцу, ячмень. Акрамя таго, у сялянскай гаспадарцы важнае значэнне мелі лён і хмель. *(Як вы думаеце, для чаго яны выкарыстоўваліся?)* Стол рабілі разнастайным прадукты садоў і агародаў: яблыкі, грушы, слівы, вішні, часнок, капуста, рэпа, цыбуля, мак.

Акрамя земляробства, сяляне спакон веку займаліся жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбалоўствам, бортніцтвам і найпрасцейшымі рамёствамі.

**3. Гарады і рамяство.** Мангольскае нашэсце нанесла вялізны ўрон усходнеславянскім гарадам. Многія гарады былі спалены, іх жыхары забіты або ўзяты ў палон. Старажытнарускае рамяство, якое дасягнула высокага ўзроўню, прыйшло да заняпаду.

Правообладатель Народная асвета

***Гістарычная даведка***

У выніку мангольскага нашэсця перапыніліся традыцыі ювелірнага майстэрства. Так, быў страчаны сакрэт вырабу унікальных перагародчатых эмалей. Больш за стагоддзе спатрэбілася на ўзнаўленне тэхнікі скані і чэрні. Зусім спыніўся выраб шкляных бранзалетаў і пацерак. Было забыта майстэрства каменнага будаўніцтва і разьбы па камені.

Многія рамеснікі з зямель Русі апынуліся ў Залатой Ардзе. І пазней татарскія ханы патрабавалі ад князёў прывозіць у Арду ўмелых майстроў і рамеснікаў. Толькі з сярэдзіны XIV ст., калі залежнасць ад Арды аслабла, у гарадах пачалося адраджэнне рамяства. Князі, баяры і манастыры ў свае ўладанні запрашалі рамеснікаў, якія абслугоўвалі толькі іх патрэбы. Гэта былі кавалі, ганчары, цесляры, шаўцы і краўцы. Аднак рамяство ў Маскоўскай Русі знаходзілася на больш нізкім узроўні ў параўнанні з рамяством заходнееўрапейскіх гарадоў.



Ювелірны выраб. Гузік. *XV ст.*

Своеасаблівасць гарадоў Маскоўскай Русі заключалася таксама ў тым, што большасць іх жыхароў займалася земляробствам, як і сяляне. Адрозненне многіх гарадоў ад сёл і вёсак было толькі ў іх большых памерах і наяўнасці крапасных сцен.

**4. Гандаль.** Залатая Арда не перашкаджала ажыццяўленню гандлю на Русі, але яе правіцеляў цікавіла толькі ўласная выгада. Прывілеяванае становішча ў Ардзе атрымалі мусульманскія купцы з Сярэдняй Азіі. Яны часта пазычалі грошы ардынскім ханам.



Гліняныя вырабы рускіх рамеснікаў

З часам на чарнаморскім і азоўскім узбярэжжах ўсталяваліся генуэзскія купцы. Маскоўскія купцы вялі выгадны

Правообладатель Народная асвета



Рынак каля Крамля.
*Мастак А. М. Васняцоў*

гандаль з крымскім горадам Суражам (сучасны Судак), які кантралявалі генуэзцы.

Маскоўскія купцы часта бывалі ў Вялікім княстве Літоўскім і Польшчы. Адсюль яны пранікалі і далей — у Чэхію і Германію.

Ноўгарад Вялікі ў XIV—XV стст. вёў бойкі гандаль з ганзейскім саюзам і перш за ўсё з галоўным горадам гэтага гандлёвага аб'яднання — Любекам. Збожжа было асноўным таварам у гандлі Масквы і Цверы з Ноўгарадам і Псковам.

**5. Абавязкі насельніцтва.** У Маскоўскай Русі ўсё менш заставалася вольных людзей. Частка асабіста вольных сялян (іх называлі чарнасошнымі) передавалася князем у дваранскія маёнткі. Князі працягвалі і надзяляць баяр вотчынамі.

На карысць вотчыннікаў і памешчыкаў (назва ад слова «памесце») сялянам даводзілася выконваць усё больш цяжкія павіннасці. Галоўнай з іх з'яўляўся *натуральны (прадуктовы) аброк*. Да працы на палетках феадала (*баршчына*) сяляне яшчэ не прыцягваліся. Панскую зямлю апрацоўвалі ў асноўным халопы, якія працавалі ў гарачую пару. *(Успомніце, хто такія халопы.)* У канцы XV ст. з'яўляюцца кабальныя халопы. Так называлі людзей, якія, пазычыўшы грошы ў пана, абавязаны былі выконваць павіннасці да яго смерці.

На карысць царквы ўсё падатковае насельніцтва павінна было плаціць *дзесяціну*. А тым, хто кіраваў і вяршыў суд, гарадское і сельскае насельніцтва давала прадукты — карміла

Правообладатель Народная асвета



«Юр'еў дзень». *Мастак С. В. Іванаў*

за свой кошт (таму мясцовых кіраўнікоў называлі *кармленшчыкамі*).

У XV ст. сяляне яшчэ маглі свабодна пайсці ад аднаго землеўладальніка да другога. Але працэс запрыгоньвання сялян ужо пачаўся. Каб пайсці ад свайго гаспадара, селянін павінен быў выплаціць вялікую грашовую суму — «пажылое». Час выхаду стаў абмяжоўвацца тыднем да і тыднем пасля Юр'евага дня (26 лістапада, цяпер — 9 снежня). У **1497** г. Іванам III быў зацверджаны ***Судзебнік*** (зборнік законаў), у якім гэта правіла стала абавязковым для сялян усёй Расійскай дзяржавы.

**1.** Якім шляхам у Паўночна-Усходняй Русі ўзнікала феадальная ўласнасць на зямлю? **2.** Якія змены адбыліся ў развіцці сельскай гаспадаркі ў Маскоўскай Русі? **3.** Як паўплывала мангольскае нашэсце на развіццё рамяства ў Паўночна-Усходняй Русі? **4.** З кім гандлявалі маскоўскія купцы ў Познім сярэдневякоўі? **5.** Што было асноўным таварам у гандлі купцоў Паўночна-Усходняй Русі? **6.** Якім было становішча сялян ў Маскоўскай Русі? **7.** Дайце вызначэнне паняццям: баяры, вотчына, маёнтак, Баярская дума, дваране.

## § 20. Праваслаўная царква ў Маскоўскай Русі

**Успомніце:** **1.** Калі на Русі было прынята хрысціянства? **2.** Пры якім кіеўскім князю было прынята хрысціянства? **3.** Што такое ерась? Каго называлі ерэтыкамі?

**1. Роля царквы ў жыцці краіны.** Праваслаўная царква адыграла надзвычай важную ролю ў справе яднання рускіх зямель. У сярэдневякоўі ва ўмовах панавання натуральнай

Правообладатель Народная асвета

гаспадаркі насельніцтва разрозненых рускіх сёл і вёсак звязвала агульная вера ў Ісуса Хрыста. Царква натхняла насельніцтва Русі на барацьбу супраць Залатой Арды і была адданай саюзніцай маскоўскіх князёў у «збіранні рускіх зямель».

У той час як на Русі панавала палітычная раздробленасць, праваслаўная царква захоўвала адзіную арганізацыю. Яна карысталася вялізным аўтарытэтам. Гэта разумелі і ханы Залатой Арды. Таму надзялілі яе асобымі прывілеямі: вызвалілі ад выплаты даніны, устанавілі недатыкальнасць царкоўных уладанняў. Але і руская царква падпарадкоўвалася ардынцам: таксама як і князі, мітрапаліты павінны былі ездзіць на паклон да хана, каб атрымаць ярлык. Пры гэтым галава рускай царквы па-ранейшаму назначаўся ў Канстацінопалі. *(Успомніце, як называлі галаву праваслаўнай царквы.)*

Усе людзі ў тыя далёкія часы верылі ў Бога. Пры ўдзеле святароў праходзіла ўсё жыццё чалавека: нараджэнне, хрэсьбіны, шлюб, пасты, святы, смерць і пахаванне. У чалавека заўсёды была жывая надзея, што Бог пачуе малітву і пазбавіць яго ад немачы, няшчасця, прыгнечання.

Царква з часам ператварылася ў буйнейшага землеўладальніка. І князі, і баяры лічылі неабходным дарыць царкве «на ўпамін душы» частку сваіх уладанняў. Пры манастырах працавалі тысячы сялян. Самі манахі адрозніваліся руплівай працай, таго ж яны патрабавалі і ад сялян. Менавіта ў манастырскіх вотчынах раней за ўсё пачаўся працэс запрыгоньвання сялян.

**2. Мітрапаліт Алексій, Сергій Раданежскі.** У рускай гісторыі найбольш вядомыя і паважаныя выдатныя царкоўныя дзеячы — мітрапаліт ***Алексій*** і манах ***Сергій Раданежскі***. Гэтыя два вельмі непадобныя чалавекі былі ўдзельнікамі найважнейшых падзей другой паловы XIV ст.

Правообладатель Народная асвета

***Гістарычная даведка***

Мітрапаліт Алексій паходзіў са знатнай баярскай сям'і. У 18 гадоў ён стаў манахам. Таленавіты і энергічны манах прыцягнуў увагу высокіх духоўных асоб. Яму быў нададзены сан епіскапа, а ў 1353 г. ён стаў мітрапалітам кіеўскім і ўсяе Русі. Вылечыўшы ад слепаты жонку залатаардынскага хана, Алексій здолеў атрымаць падтрымку татараў.

Руская праваслаўная царква ў часы мітрапаліта Алексія шмат зрабіла для ўмацавання магутнасці Масквы. Мітрапаліт дапамог вярнуць ярлык на Уладзімірскае вялікае княжанне князю Дзмітрыю Іванавічу, адлучаў ад царквы ворагаў маскоўскага князя, заключыў дагавор з літоўскім князем. Ёсць звесткі, што менавіта Алексій быў ініцыятарам будаўніцтва вакол Масквы белакаменнай сцяны. Алексій не дажыў да Кулікоўскай бітвы (памёр у 1378 г.), але сваёй дзейнасцю ён падрыхтаваў Маскву для рашучага сутыкнення з Ардой.

Сергій набыў вядомасць у Паўночна-Усходняй Русі як манах-пустэльнік, які жыў у адзіноце далёка ад людзей у глухім Раданежскім лесе пад Масквою. З цягам часу да яго далучыліся іншыя манахі. Так узнік Троіцкі манастыр (у будучым — Троіца-Сергіева лаўра). Сергій стаў яго першым ігуменам (настаяцелем). У манастыры ўсёй маёмасцю распараджалася манаская абшчына. Манахі харчаваліся з агульнага катла, а не кожны асобна ў сваёй келлі, насілі аднолькавае адзенне. (**Келля** — *асобнае жылое памяшканне манаха ў манастыры*.)

Духоўны аўтарытэт Сергія быў вельмі вялікі. Пешшу «вялікі старац» абышоў усю Паўночна-Усходнюю Русь, пераконваючы князёў спыніць згубныя ўсобіцы. Сергій блаславіў Дзмітрыя Данскога на барацьбу з Залатой Ардой. Вядома, што на Кулікоўскую бітву Сергій адправіў двух сваіх мана-



Мітрапаліт Алексій. *Абраз*

Правообладатель Народная асвета

хаў — Перасвета і Аслябю. *(Як вы думаеце, ці маглі манахі прымаць удзел у бітвах?)* Ужо неўзабаве пасля смерці Сергій Раданежскі стаў шанавацца як святы.

**3. Рэлігійныя спрэчкі, ерасі.** У сярэдневякоўі погляды чалавека на навакольны свет, на паходжанне тых ці іншых з'яў, на існуючыя ў свеце людзей адносіны (г. зн. яго светапогляд) цалкам вызначаліся рэлігіяй. Царква вельмі строга сачыла за ўстаноўленымі правіламі, абрадамі (таінствамі). Усякае адхіленне ад афіцыйнага царкоўнага вучэння жорстка каралася. Нягледзячы на гэта, з'яўляліся вальнадумцы (ерэтыкі), якія асмельваліся крытыкаваць царкву.

У XIV ст. у Ноўгарадзе і Пскове распаўсюдзілася ерась *стрыгольнікаў* (паходжанне іх назвы невядома). Стрыгольнікі асуджалі амаральныя паводзіны святароў і настойвалі на ўспрыманні веравучэння розумам. У тым жа Ноўгарадзе Вялікім ерэтыкі прапаведавалі і ў канцы XV ст. Яны выступілі супраць асновы хрысціянскага веравучэння — уяўлення аб існаванні Бога ў абліччах Бога-Айца, Бога-Сына і Святога Духа. Акрамя таго, яны адмаўлялі неабходнасць царкоўнай арганізацыі, лічачы, што сам чалавек — Божы храм. Супраць ерэтыкоў





Працы Сергія Раданежскага. *М. В. Несцераў*

Правообладатель Народная асвета

рашуча выступіў манах *Іосіф Валоцкі*. Ерэтыкі былі асуджаны і сурова пакараны. Найбольш уплывовыя з іх былі нават спалены.

**4. Рускія манастыры.** Мноства манастыроў было заснавана ў Старажытнай Русі яшчэ да мангольскага нашэсця. Манастыр лічыўся месцам адасаблення, куды чалавек мог аддаліцца ад людзей, каб прысвяціць сябе служэнню Богу. Русь пераймала арганізацыю жыцця манахаў з Візантыі, таму ў ёй, у адрозненне ад Заходняй Еўропы, не было манаскіх ордэнаў і манахаў-жабракоў.

У XIV ст. манастыры сталі адраджацца ў Паўночна-Усходняй Русі. Тут з’явіліся, акрамя Троіца-Сергіева, такія вядомыя манастыры, як Кірыла-Белазерскі, Іосіфа-Валакаламскі, Ферапонтаў і інш. *(Як вы думаеце, чаму манастыры атрымалі такія назвы?)*

Манастыры адыгрывалі важную ролю ў жыцці рускіх земель. Яны спрыялі каланізацыі і гаспадарчаму засваенню новых тэрыторый. З часам манастыры ператварыліся ў моцныя гаспадаркі, у якіх толькі невялікая частка манахаў займалася выключна царкоўнай службай. Вядома мноства прыкладаў удзелу манахаў у палітычным жыцці. Манастыры абгароджваліся моцнымі сценамі і тым самым ператвараліся ў невялікія крэпасці, якія абаранялі разам з гарадамі рускія землі ад ворагаў. За манастырскімі сценамі захоўваліся бясцэнныя культурныя скарбы — кнігі, творы мастацтва. Некаторыя манахі былі таленавітымі пісьменнікамі, мастакамі. Яны выступалі і як асветнікі суседніх з Руссю народаў, прыносілі ім разам з прапаведдзю хрысціянства пісьменнасць.



Троіца-Сергіева лаўра. *Мастак Э. Ліснер*

Правообладатель Народная асвета

**1.** Якую ролю адыгрывала праваслаўная царква ў Паўночна-Усходняй Русі пасля мангольскага нашэсця? **2.** Якое месца займала царква ў жыцці насельніцтва Маскоўскай Русі? **3.** Якую ролю адыгралі мітрапаліт Алексій і манах Сергій Раданежскі ў гісторыі Маскоўскай Русі? Што агульнае было ў іх дзейнасці? **4.** Якія былі прычыны ўзнікнення ерасей у рускіх землях у Познім сярэдневякоўі? Супраць чаго выступалі ерэтыкі? **5.** Дакажыце, што манастыры адыгрывалі важную ролю ў гісторыі Русі.

## § 21. Культура Паўночна-Усходняй Русі XIV—XV стст.

**Успомніце:** **1.** Якія выдатныя творы літаратуры былі створаны ў Старажытнай Русі? **2.** Якія выдатныя помнікі архітэктуры былі створаны ў Старажытнай Русі? **3.** Што такое абраз? У чым яго адрозненне ад іншых твораў жывапісу?

**1. Літаратура.** Нават пасля спусташальнага мангольскага нашэсця 1237—1241 гг. усходнія славяне не страцілі сваёй самабытнай культуры, здолелі захаваць кнігі, летапісы, паданні. У XIV—XV стст. культурнае жыццё ў Паўночна-Усходняй Русі стала хутка адраджацца.

Характэрнай рысай рускай літаратуры Позняга сярэдневякоўя з'яўлялася ўслаўленне гераізму і мужнасці рускіх людзей у барацьбе з жорсткімі ворагамі, апяванне любові да роднай зямлі. Усе літаратурныя творы XIV—XV стст. прасякнуты глыбокім патрыятызмам.

***Гістарычная даведка***

Нашэсце полчышчаў Батыя на Русь знайшло адлюстраванне ў некалькіх творах таго часу. Адзін з іх — «Аповесць пра разбурэнне Батыем Разані». У ёй расказваецца пра мужнасць абаронцаў горада, які першым пацярпеў ад нашэсця манголаў. Пасля таго як горад быў спалены і яго жыхары знішчаны, у барацьбу ўступіў Еўпацій Калаўрат. Са жменькай паплечнікаў ён наносіў удары па ворагу.

Падзеі Кулікоўскай бітвы леглі ў аснову аповесцей *«Задоншчына»* і *«Сказанне пра Мамаева пабоішча»*. Іх аўтары ў паэтычных вобразах перадалі напружанне барацьбы

Правообладатель Народная асвета

з магутным ворагам у канцы XIV ст. Так, у «Задоншчыне» ўсхваляюцца героі бітвы на Куліковым полі, гучыць журба аб загінуўшых, што склалі свае галовы «за Рускую зямлю і за веру хрысціянскую». У створаным ужо ў XV ст. «Сказанні пра Мамаева пабоішча» паэтычна апісваецца сам ход пераможнай бітвы.

У XV ст. пашырыліся палітычныя, эканамічныя і культурныя сувязі княстваў Паўночна-Усходняй Русі з іншымі краінамі. Гэта знайшло адлюстраванне і ў літаратуры. Так, цвярскі купец ***Афанасій Нікіцін***, які дабраўся ў 60-я гг. нават да Індыі, пакінуў дзённік свайго падарожжа — *«Хаджэнне за тры моры»*. У ім ён апісаў звычаі народаў, з якімі сустрэўся, даў ім сваю ацэнку. У той жа час горыччу напоўнены словы падарожніка аб сваёй радзіме, дзе князі пастаянна варагавалі адзін з другім: «Няхай лад будзе ў Рускай зямлі, а то мала ў ёй справядлівасці».

**2. Архітэктура.** Жылыя пабудовы ўсходніх славян у Познім сярэдневякоўі заставаліся такімі ж, як і стагоддзі раней. Найбольш значныя змены адбываліся ў будаўніцтве абарончых і культавых (цэркваў, сабораў) пабудоў.

Усе сярэдневяковыя гарады мелі крапасныя сцены. Уздоўж сцен выкопвалі глыбокія равы, якія напаўнялі вадой. Разам з гэтым у найбуйнейшых гарадах будаваўся ***крэмль***. Так называлі ўнутраную гарадскую крэпасць, цытадэль. У крамлі збіраліся жыхары, калі ўвесь астатні горад быў ужо захоплены ворагам.

У XIV—XV стст. у шэрагу гарадоў Паўночна-Усходняй Русі былі пабудаваны новыя крамлі. Некаторыя з іх ужо ўзводзілі не з дрэва, а з каменю. Але такое маглі сабе дазволіць толькі самыя магутныя і багатыя князі. Унутры крамля знаходзіліся княжацкія палацы, галоўныя храмы, двары баяраў і царкоўнай знаці.

Узводзіліся ў рускіх гарадах у XIV—XV стст. і новыя велічныя храмы. Галоўным храмам Масквы быў *Успенскі*

Правообладатель Народная асвета

*сабор*, але з часам яго сцены састарэлі. Іван III задумаў будаўніцтва новага каменнага сабора. Для гэтага з Італіі быў запрошаны выдатны майстар ***Арыстоцель Фіяраванці***. Да 1479 г. будаўніцтва новага Успенскага сабора было завершана. Сюды быў перанесены і самы шануемы абраз на Русі — Уладзімірская Божая Маці.

**3. Маскоўскі Крэмль.** Сімвалам узмацнення магутнасці маскоўскіх князёў у XIV—XV стст. стала будаўніцтва новага Крамля. Ён прызначаўся не толькі для абароны ад захопнікаў. Сваімі памерамі і хараством Крэмль павінен быў паказаць непрыяцелям і саюзнікам маскоўскага князя яго багацце і імкненне да ўладарання над усімі землямі Русі.

Спачатку Іван Каліта ўзвёў новыя сцены з дубу і пабудаваў пяць каменных храмаў унутры Крамля. *(Успомніце, у якія часы кіраваў у Маскве Іван Каліта.)* Пасля жудаснага пажару 1365 г. князь Дзмітрый Данскі вырашыў «...ставіці горад Маскву камен» і для гэтага запрасіў будаўнікоў з усёй Русі. Дзесяткі тысяч людзей працавалі на падвозцы белага каменю, з якога ўзводзіліся сцены Крамля. Масква стала белакаменнай.

Пры Іване III ажыццёўлена чарговая перабудова Крамля. Сцены і вежы былі збудаваны з чырвонай цэглы. У агульных рысах яны захаваліся да нашых дзён. Сярод унутраных пабудоў Крамля вылучаліся сваёй непаўторнай архітэктурай Успенскі, Благавешчанскі і Архангельскі саборы. У канцы XV ст. была пабудавана Гранавітая палата. Яна прызначалася для ўрачыстых прыёмаў.



Успенскі сабор у Маскве. *Сучасны выгляд*

Маскоўскі Крэмль з'яўляўся не толькі непрыступнай крэпасцю, але і лепшым узорам рускай архітэктуры таго часу.

Правообладатель Народная асвета



Маскоўскі Крэмль пры Дзмітрыю Данскім. *Мастак А. М. Васняцоў*

**4. Жывапіс: Феафан Грэк і Андрэй Рублёў.** У канцы XIV—XV ст. назіраўся росквіт рускага жывапісу. У гэты час працавалі выдатныя іканапісцы і майстры фрэскавага роспісу ўсходнеславянскага сярэдневякоўя — ***Феафан Грэк*** і ***Андрэй Рублёў***.

*Гістарычная даведка*

Феафан Грэк быў родам з Візантыі. У 1378 г., ужо ў сталым узросце (ён нарадзіўся ў 30-х гг. XIV ст.), Феафан прыехаў у Ноўгарад. Работа візантыйскага майстра спадабалася наўгародцам. Неўзабаве ён быў запрошаны ў Маскву. Тут жывапісец у канцы XIV— пачатку XV ст. распісаў фрэскамі некалькі сабораў, у тым ліку Архангельскі і Благавешчанскі.

Феафана Грэка адрознівала асобая манера пісьма. Яго творы выкананы ў цёмных, змрочных тонах. На фрэсках грэчаскага майстра святыя паўстаюць перад гледачом поўныя драматызму, у іх адчуваецца нешта суровае і грознае.

Правообладатель Народная асвета



Феафан Грэк.
*Успенне*

Разам з Феафанам Грэкам у роспісе Благавешчанскага сабора ў Маскве прымаў удзел Андрэй Рублёў. Творчасць Феафана Грэка вельмі ўразіла Рублёва, але ён не стаў яго пераймальнікам. Андрэй Рублёў быў манахам Троіцкага манастыра, заснаванага Сергіем Раданежскім, а затым перайшоў у адзін з маскоўскіх манастыроў. Гісторыкі мяркуюць, што ў пачатку сваёй творчай дзейнасці ён жыў і вучыўся ў Візантыі ці Балгарыі.

Андрэй Рублёў дасягнуў непераўзыдзенага майстэрства ў жывапісе. У сваіх работах майстар аддаваў перавагу асобым мяккім, прыемным колерам, менавіта ім упершыню ўжытым у царкоўным жывапісе.

Творчая манера Андрэя Рублёва праявілася ў роспісе мноства храмаў, у тым ліку Успенскага сабора ва Уладзіміры. Сусветную вядомасць набыў яго абраз «Тройца». Гэта адзін з нямногіх твораў вялікага майстра, які захаваўся да нашага часу.

***Гістарычная даведка***

У «Тройцы» адлюстраваны біблейскі сюжэт аб прыходзе да старца Аўрама трох юнакоў-вандроўнікаў, якія аказаліся анёламі, пасланымі Богам. У той жа час гэты абраз сімвалізаваў трыадзінства Бога: Бога-Айца, Бога-Сына і Бога Святога Духа. Гэтае трыадзінства хрысціяне называюць Тройцай. Тры асобы Тройцы — розныя, але яны адзінаісныя і разам складаюць адзінства.

У «Тройцы» жывапісец здолеў перадаць ідэю неабходнасці аб'яднання рускіх зямель. «Тройца» Андрэя Рублёва была напісана з парушэннем існуючага тады іканапіснага канона (устаноўленых правілаў). Але ўжо ў XIV ст. на царкоўным саборы яна была абвешчана ўзорам. Усе іканапісцы павін-

Правообладатель Народная асвета

ны былі надалей пісаць абразы Ісуса Хрыста і святых так, як гэта рабіў Андрэй Рублёў.


А. Рублёў. Тройца

Такім чынам, мангольскае нашэсце і 240-гадовае панаванне Залатой Арды над Руссю, якое надышло ўслед, не здолела знішчыць самабытную рускую культуру. Яе адраджэнне супала з узвышэннем у Паўночна-Усходняй Русі Масквы і пачаткам збірання ёю рускіх зямель.

**1.** Якія асноўныя тэмы былі ў рускай літаратуры ў XIV—XV стст.? Назавіце творы рускай літаратуры гэтых часоў. **2.** Як адбілася на развіцці літаратуры пашырэнне палітычных, эканамічных і культурных сувязей Паўночна-Усходняй Русі з іншымі краінамі? **3.** Якія новыя рысы выявіліся ў архітэктуры Паўночна-Усходняй Русі ў Познім сярэдневякоўі? **4.** З чым былі звязаны перабудовы Маскоўскага Крамля ў XIV—XV стст.? **5.** Раскажыце пра рускіх жывапісцаў Феафана Грэка і Андрэя Рублёва. Што агульнае і асаблівае было ў іх творчай манеры?

## § 22. Жыццё людзей Маскоўскай Русі

**Успомніце:** **1.** Як апраналіся мужчыны і жанчыны ў Старажытнай Русі? **2.** Як бавілі вольны час людзі ў Старажытнай Русі? **3.** Што ўяўляла сабой войска Старажытнай Русі?

**1. Жыллё.** Штодзённае жыццё ўсходніх славян пасля мангольскага нашэсця амаль не змянілася. Па-ранейшаму ўмовы жыцця залежалі ад багацця чалавека і яго становішча ў грамадстве. Аднак жыццё і побыт простых і заможных людзей не вельмі адрозніваліся. Толькі князі і іх сем'і, якія жылі ў спецыяльна пабудаваных палацах і харчаваліся незвычайнымі стравамі, рэзка вылучаліся сярод насельніцтва.

Людзі Маскоўскай Русі жылі ў зрубавых пабудовах — ***хатах***. Хатай першапачаткова называлі ўсякае цёплае жыллё з

Правообладатель Народная асвета

печчу. Хаты ацяпляліся па-чорнаму — у іх не было коміна. Менавіта таму часта адбываліся пажары. Жыллё багатых людзей — ***палацы*** — мелі больш удасканаленае ацяпленне і асвятленне.

**2. Харчаванне.** Ежа людзей Маскоўскай Русі была даволі разнастайнай. Яе асновай, як і раней, быў хлеб. З жытняй мукі выпякалі аладкі, праснакі, блінцы, з пшанічнай мукі рабілі калачы. На сталах часта прысутнічалі пірагі з рознай начынкай: макам, мёдам, капустай, рэпай, грыбамі, мясам, кашай. Усялякія кашы (грэцкія, аўсяныя, прасяныя, ячныя) былі і самастойнай стравай. Са збожжа гатавалі і напіткі: хлебны квас, ячнае піва.

Звычайнымі ў Познім сярэдневякоўі былі агародніна і садавіна. Праўда, месца прывычнай у нашы дні бульбы займала рэпа. Ужывалі ў розным выглядзе мяса і рыбу. Аднак на іх ужыванне існавалі абмежаванні. Вельмі частымі былі пасты, якія ўстанаўліваліся царкоўнымі правіламі. Яны працягваліся па некалькі тыдняў. У дні Вялікага посту (пачынаўся пасля Масленіцы і доўжыўся да Вялікадня) забаранялася есці нават рыбу.

Па сваім складзе рацыён і простых людзей, і феадалаў быў аднолькавым. Але на стале баяраў і князёў часцей з'яўлялася мяса, нярэдкімі былі запечаныя цалкам або засмажаныя на ражне гусі і лебедзі. Ежа шчодра прыпраўлялася заморскімі прыправамі.

**3. Адзенне.** У адзенні ўсходніх славян на працягу многіх стагоддзяў захоўваліся традыцыйны набор элементаў і крой. Па-ранейшаму аснову мужчынскага і жаночага касцюмаў складала кашуля (у жанчын больш доўгая). Ногі мужчын закрывалі порткі, на кашулю надзяваліся плашчы (ватолы). Жанчыны паверх кашулі надзявалі некалькі сукенак — адну карацейшую за другую. Жаночы касцюм дапаўнялі доўгі пояс, плашч, які зашпільваўся на плячы, і боцікі. Упрыгажэннямі

Правообладатель Народная асвета

багатых сялянак і гараджанак былі завушніцы, шыйныя грыўны, бранзалеты.

Адзенне сялян некалькі адрознівалася ад адзення гараджан. Сяляне ў асноўным насілі лапці і лямцавыя капелюшы, а гараджане — скураны абутак і каўпакі. Крой адзення бедных і багатых людзей быў аднолькавым. Але заможныя людзі маглі дазволіць сабе шыць яго з даражэйшай тканіны, прывезенай з заходнееўрапейскіх або ўсходніх краін.



Жаночая кашуля

**4. Сям'я.** У Познім сярэдневякоўі малая сям'яператварылася ў асноўную гаспадарчую адзінку. У шлюб уступалі вельмі рана. Са з'яўленнем жа нявесткі ў доме прыбаўляліся рабочыя рукі. Палітычнымі меркаваннямі растлумачваліся раннія шлюбы ў княжацкіх сем'ях.

*Гістарычная даведка*

Мітрапаліт Фоцій (XV ст.) у пасланні наўгародцам вызначыў найбольш ранні ўзрост выдачы замуж дзяўчынак — 12 гадоў. Юнакі звычайна жаніліся пазней — у 15—16 гадоў. Але ў рэальнасці шлюбы маглі заключацца і ў больш раннім узросце. Так, сын Васіля II Цёмнага Іван (будучы Іван III) у першым шлюбе ажаніўся з дачкой цвярскога князя Барыса Аляксандравіча Марыяй у 12 гадоў. Нявесце ж тады споўнілася толькі 10 гадоў.

У XIV—XV стст. паступова выкараняліся язычніцкія святы — «д'ябальскія ігрышчы» і «скаканні», на якіх маглі пазнаёміцца будучыя муж і жонка. Звычайным стала сватанне, калі падбор жаніха і нявесты бралі на сябе бацькі. Каханне і ўзаемаразуменне паміж мужам і жонкай былі рэдкай з'явай.

Усё большы ўплыў на сямейныя адносіны аказвала царква. Царкоўнымі правіламі строга забараняліся развод, паўторны шлюб і мнагажонства. У Познім сярэдневякоўі ўжо склаліся асноўныя традыцыі сямейнага побыту, найбольш ха-

Правообладатель Народная асвета



Выхад баярыні (княгіні).
*Мастак А. М. Васняцоў*

рактэрнай рысай якога была моцная ўлада бацькі. Разам з гэтым укараніўся звычай шырока адзначаць сямейныя святы, на якіх збіраліся ўсе блізкія родзічы.

**5. Вайсковая справа.** Узброеныя сілы тагачаснага Маскоўскага княства ўяўлялі сабой феадальнае войска. Але ў адрозненне ад перыяду палітычнай раздробленасці ў маскоўскім войску намнога ўзрасла роля аднаасобнага камандавання.

Аснову войска складаў «двор» вялікага князя і гарадавыя палкі. «Двор» складаўся са «службовых» князёў, баяр і служылых людзей — дзяцей баярскіх і дваран. Апошнія з'яўляліся дробнымі землеўладальнікамі і за ўладанне зямлёй абавязаны былі несці вайсковую службу. Гарадавыя палкі набіраліся з гараджан — рамеснікаў, купцоў і іншых жыхароў.

Асноўнай вайсковай адзінкай у XIV—XV стст. быў ужо ***полк***, а не княжацкая дружына. Колькасць палкоў была рознай: яна вызначалася людскімі магчымасцямі княстваў, ад якіх полк выстаўляўся. Камандаваў палком князь або прызначаны ім з баяр ваявода. Нягледзячы на розную колькасць, палкі мелі стройную арганізацыю. Яны дзяліліся на тысячы, сотні і дзесяткі, якімі камандавалі тысяцкія, соцкія і дзесяцкія. Такая арганізацыя давала магчымасць больш эфектыўна кіраваць войскам у бітве і ў паходзе. У бітве воіны арыентаваліся на свой сцяг (харугву). Акрамя таго, для кіравання палком прымяняліся ратныя (вайсковыя) трубы, літаўры і сцягі.

У паходзе і бітве ўсё войска («рацdevi») дзялілася на пяць частак: перадавы полк, вялікі полк, палкі правай і левай рукі,

Правообладатель Народная асвета

тыльны (засадны) полк. Гэтае чляненне было характэрнай асаблівасцю маскоўскага войска.

У Заходняй Еўропе войска звычайна дзялілася на тры часткі — авангард, галоўныя сілы і ар’ергард. *(Як вы думаеце, якое дзяленне было больш эфектыўным у ходзе бітвы?)*

Асноўная роля ў бітве належала конніцы, але вялікае значэнне мелі пяхота і лучнікі. Кантакты з заходнімі і асабліва ўсходнімі суседзямі моцна паўплывалі на тактыку бою і ўзбраенне воінаў Маскоўскай Русі.



Рускі конны воін. *Канец XIV ст. З малюнка А. В. Фёдарава*

**Гістарычная даведка**

У баі рускія воіны ўжывалі коп’і, суліцы (кідальныя коп’і), рагаціны, мячы, шаблі, сякеры і інш. У Кулікоўскай бітве галоўнай зброяй быў яшчэ меч. Але ўжо да канца XV ст. у Маскоўскай Русі меч выцесніла шабля. Значна больш дасканалым стала абароннае ўзбраенне — кальчугі, даспехі, шлемы, шчыты. Кідальнай зброяй служылі лукі і самастрэлы (арбалеты). У XIV ст. у Маскоўскай Русі з’явілася агнястрэльная зброя. У XV ст. былі вядомы пушкі, пішчалі і цюфякі (ад цюркскага слова «цюфенг» — стрэльба). Да канца стагоддзя з’явілася і ручная агнястрэльная зброя («пішчалі завесныя»).

Аднастайна ўзброеных воінаў у маскоўскім войску не было. Кожны выбіраў сабе зброю зыходзячы з асабістых пераваг і матэрыяльных магчымасцей. Паступова ўзбраенне рускіх воінаў якасна паляпшалася і станавілася больш разнастайным.

Дзякуючы стварэнню стройнай вайсковай арганізацыі маскоўскія князі здолелі аднавіць незалежнасць Паўночна-Усходняй Русі, стварыць Расійскую дзяржаву.

**1.** Што ўяўляла сабой насельніцтва Маскоўскай Русі ў XIV—XV стст.? **2.** Што елі і ў што апраналіся людзі ў Маскоўскай Русі?

Правообладатель Народная асвета

**3.** Як ствараліся сем'і ў Маскоўскай Русі ў Познім сярэдневякоўі? **4.** Як уплывала царква на сямейныя адносіны? **5.** Што ўяўлялі сабой узброеныя сілы Маскоўскага княства ў XIV—XV стст.? **6.** Дайце вызначэнне паняццям: хата, палац, полк.

## *АБАГУЛЬНЕННЕ ДА РАЗДЗЕЛА II*

### Славяне ў Познім сярэдневякоўі

У другім раздзеле вы пазнаёміліся з асаблівасцямі развіцця славянскіх дзяржаў у Познім сярэдневякоўі (XIV—XV стст.). У гэты перыяд гістарычныя шляхі ўсходніх, заходніх і паўднёвых славян разышліся.

Усходнія славяне Паўночна-Усходняй Русі на многія гады апынуліся пад прыгнётам Залатой Арды. Але частка ўсходнеславянскага насельніцтва, у тым ліку продкі беларусаў, украінцаў, стала этнічнай асновай Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Паўднёваславянскія землі былі захоплены туркамі-асманамі.

Польская і Чэшская дзяржавы знаходзіліся пад моцным уплывам заходнееўрапейскай цывілізацыі. Чэхія, нягледзячы на магутны нацыянальны гусіцкі рух, заставалася ў складзе Свяшчэннай Рымскай імперыі. Польшча разам з Вялікім княствам Літоўскім ва ўпартай барацьбе здолела перамагчы свайго моцнага праціўніка — Тэўтонскі ордэн.

Найважнейшай падзеяй перыяду Позняга сярэдневякоўя для Усходняй Еўропы стала ўзнікненне Расійскай дзяржавы. Пасля падзення Візантыйскай імперыі яна прэтэндавала на палітычнае лідэрства ў праваслаўным свеце.

### Пытанні і заданні

Успомніце, якія важныя падзеі ў гісторыі Чэшскай і Польскай дзяржаў адбыліся ў 1364, 1374, 1415, 1434 гг.

Успомніце, якія важныя падзеі ў гісторыі зямель Балканскага паўвострава адбыліся ў 1331, 1389, 1439 гг.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Успомніце, якія важныя падзеі ў гісторыі Паўночна-Усходняй Русі адбыліся ў 1327, 1380, 1485, 1497 гг.

Успомніце, калі адбыліся наступныя падзеі: спаленне ардынскім ханам Тахтамышам Масквы; канчатковае далучэнне да Масквы Наўгародскай зямлі; падзенне мангола-татарскага ярма; захоп туркамі-асманамі Канстанцінопаля; падзенне Візантыйскай імперыі; заснаванне Пражскага універсітэта; паўстанне прыхільнікаў Яна Гуса ў Празе; заключэнне Крэўскай уніі; Грунвальдская бітва.

Назавіце час (перыяд): гусіцкіх войнаў у Чэхіі; праўленне маскоўскага вялікага князя Івана III; праўленне імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Карла IV; праўленне польскага караля Казіміра III Вялікага; праўленне сербскага гасудара Стэфана Душана; мангола-татарскага ярма на Русі.

Вызначце, хто са славянскіх дзяржаўных і культурных дзеячаў былі сучаснікамі: Карл IV, Ян Гус, Петэр Парлер, Казімір III Вялікі, Ян Длугаш, Стэфан Душан, Лазар, Іван Каліта, Васіль II Цёмны, Іван III, Сергій Раданежскі, Андрэй Рублёў, Феафан Грэк.

Складзіце храналагічныя табліцы: «Барацьба рускіх зямель за вызваленне ад мангола-татарскага ярма», «Аб'яднанне рускіх зямель вакол Масквы».

Дайце вызначэнне наступных паняццяў: бюргерства, паны, шляхта, гусіты, табарыты, магнаты, магдэбургскае права, прывілей, удзел, ярлык, службовыя князі, баяры, дваране, Баярская дума, вотчына, маёнтак, крэмль.

Складзіце расказ на тэмы: «Жыццё селяніна ў Маскоўскай Русі», «Жыццё ў праваслаўным рускім манастыры».

Выкарыстоўваючы матэрыял вучэбнага дапаможніка і дадатковыя звесткі, складзіце палітычны партрэт Карла IV, Казіміра III Вялікага, Стэфана Душана, Івана Каліты, Дзмітрыя Данскога, Івана III.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Запоўніце табліцу «Славянскія дзяржавы ў Познім сярэдневякоўі».

| | Вялікае княства Маскоўскае | Чэхія | Польшча |
|---|---|---|---|
| Найбольш вядомыя правіцелі | | | |
| Асаблівасці грамадскага ладу | | | |
| Знешнепалітычнае становішча | | | |
| Культурнае развіццё | | | |

Дайце разгорнутыя адказы на пытанні: Якія наступствы для паўднёваславянскіх народаў мела турэцкае заваяванне? Якое становішча займала Чэхія ў складзе Свяшчэннай Рымскай імперыі? Якія асаблівасці меў працэс утварэння адзінай Расійскай дзяржавы? Якую ролю іграла Руская праваслаўная царква ў справе яднання зямель Русі? У чым выяўлялася развіццё феадальных адносін у Маскоўскай Русі?

Высветліце прычыны: першынства Масквы ў аб'яднанні зямель Русі; поспеху туркаў-асманаў у заваяванні зямель Балканскага паўвострава; паражэння гусітаў; перамогі маскоўскага князя ў феадальнай вайне другой чвэрці XV ст.; пад'ёму культуры Маскоўскай Русі ў XIV—XV стст.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# РАЗДЗЕЛ III. ЦЫВІЛІЗАЦЫІ АЗІІ, АФРЫКІ І АМЕРЫКІ

## § 23. Іран і Сярэдняя Азія

**Успомніце:** **1.** Калі і кім былі аб'яднаны плямёны манголаў? **2.** Якія мангольскія дзяржавы былі ўтвораны ў Іране і Сярэдняй Азіі ў XIII ст.? **3.** Чым праславіліся Біруні і Амар Хаям?

**1. Канец мангольскага ўладарання ў Іране.** Мангольская дзяржава, утвораная ў сярэдзіне XIII ст. унукам Чынгісхана ***Хулагу***, мела вялізную тэрыторыю. У яе ўваходзілі Іран, Міжрэчча, Закаўказзе, Афганістан, частка Малой Азіі. Але гэтая дзяржава не магла быць даўгавечнай. Жорсткі прыгнёт заваёўнікаў выклікаў нездаволенасць мясцовага насельніцтва.

Манголы разбурылі ў Іране ірыгацыйныя збудаванні, і зямля перастала радзіць. Шмат палеткаў качэўнікі ператварылі ў пашу для сваіх коней. Амаль усё вырашчанае і зробленае сялянамі і рамеснікамі забіралася манголамі ў выглядзе падаткаў. Працаўнікі жылі ў галечы і голадзе, а падаткі раслі. Вялікіх сродкаў патрабавалі войны, а мангольскія правіцелі часта ваявалі з суседзямі. Варагавалі яны і з іншымі мангольскімі дзяржавамі: Залатой Ардой і дзяржавай нашчадкаў сына Чынгісхана ***Чагатая*** ў Сярэдняй Азіі.

Нясцерпны ўціск прывёў да народнага паўстання ў Іране. Паўстанцы вырашылі, што лепш загінуць, чым будуць цярпець панаванне манголаў. У **1353** г. яны забілі апошняга мангольскага правіцеля з роду Хулагу і стварылі сваю незалежную дзяржаву. Выгнаўшы манголаў, іранцы абвясцілі, што больш ніводны качэўнік не паставіць свой шацёр у Іране. Але не прайшло і 30 гадоў, як краіна зноў была заваявана. Захопнікі прыйшлі з Сярэдняй Азіі.

**2. Заваёвы Цімура і яго дзяржава.** Да сярэдзіны XIV ст. нетрывалая дзяржава нашчадкаў Чагатая ў Сярэдняй Азіі

Правообладатель Народная асвета



Цімур. *Рэканструкцыя М. М. Герасімава*

распалася на некалькі частак. У ходзе войнаў паміж імі ўзвысіўся ***Цімур*** — выхадзец са знатнай, але небагатай мангольскай сям'і. У 1370 г. ён захапіў адзін з буйнейшых гарадоў Сярэдняй Азіі — Самарканд. Гэты горад стаў яго сталіцай.

Цімур жадаў стаць такім жа вялікім заваёўнікам, як Чынгісхан. Ён марыў стаць «уладаром свету». Цімур гаварыў, што ўвесь свет нявартьı мець нават двух уладароў. Ён стварыў вялізнае войска і пачаў захопніцкія паходы.

**Гістарычная даведка**

Імя Цімур азначае «жалезны». Цімур быў цудоўным ездаком, але, калі злазіў з каня, пры хадзьбе моцна накульгваў. Па гэтай прычыне яго называлі яшчэ і Кульгавы Цімур. Ён не быў нашчадкам Чынгісхана. Таму Цімур не прыняў тытул хана, а назваўся эмірам. Галоўнай сілай яго вялізнай арміі, якая складалася з 200 тысяч воінаў, была адборная конніца. Войска Цімура мела лепшую асадную тэхніку: каменямётныя, сценабітныя прылады. Як палкаводзец, ён дзейнічаў імкліва, хутка і з надзвычайнай жорсткасцю.

Цімур скарыў усю Сярэднюю Азію і Іран. Супраціўленне іранцаў было аслаблена тым, што ім давялося ваяваць і супраць нападаў правіцеля Залатой Арды Тахтамыша. Цімур заваяваў таксама Закаўказзе, міжрэчча Тыгра і Еўфрата. Гэтыя тэрыторыі ўвайшлі ў склад яго дзяржавы. Кроў, гора і смерць пакідаў за сабой гэты заваёўнік.

**Гістарычная даведка**

Аднойчы жыхары іранскага горада Ісфахана паўсталі супраць Цімура. Яны перабілі яго гарнізон. Тады паводле загаду Цімура над гараджанамі была ўчынена жудасная расправа. У выніку яе былі складзены піраміды з 70 тысяч адсечаных чалавечых галоў.

Правообладатель Народная асвета




Заваёвы Цімура

Жорсткі заваёўнік пакінуў свае крывавыя сляды і ў Індыі, і ў Залатой Ардзе, і ў Турцыі. З захопленых зямель велізарная здабыча паступала ў Самарканд. Туды ж Цімур зганяў палонных рамеснікаў. Іх прымусовай працай будаваўся і ўпрыгожваўся Самарканд, які стаў адным з самых цудоўных гарадоў тагачаснага свету. Пад кантролем заваёўніка знаходзіўся Вялікі шаўковы шлях. Гэта прыносіла велізарныя прыбыткі. Магутнасць Цімура была настолькі вялікай, што з ім шукалі саюза і Візантыя, і Францыя, і Кастылія, і Генуя.

Але велізарная дзяржава Цімура не была трывалай. Яе насельніцтва складалі розныя народы. Сярод іх было і насельніцтва высокаразвітых краін, і адсталыя качэўнікі. А галоўнай апорай Цімура з'яўлялася знаць качэўнікаў. Усялякую незадаволенасць Цімур бязлітасна душыў. Яго ўлада трымалася на ваеннай сіле і страху насельніцтва перад жорсткімі расправамі.

Правообладатель Народная асвета

***Гістарычная крыніца***

**Пасол Кастыліі аб Самаркандзе (XV ст.).** Самарканд размешчаны на раўніне і абкружаны земляным валам і вельмі глыбокімі равамі. За горадам пабудавана шмат дамоў. Так што тое, што знаходзіцца за валам, больш населена, чым сам горад. Цімур вельмі жадаў узвялічыць гэты горад і, калі заваёўваў якія-небудзь землі, адусюль прыводзіў людзей, каб яны засялялі горад і навакольныя землі. Асабліва ён збіраў майстроў па розных рамёствах. З Дамаска ён прыслаў розных майстроў, якіх здолеў знайсці: разнастайных ткачоў, умельцаў па вырабе лукаў для стральбы і збройнікаў, тых, хто апрацоўвае шкло і гліну, і гэтыя майстры лічацца лепшымі ў свеце. А з Турцыі ён прывёў арбалетчыкаў і іншых умельцаў, якіх змог знайсці: муляраў, залатых спраў майстроў, колькі іх знайшлося. І столькі іх прывёз, што ў горадзе можна знайсці любых майстроў і ўмельцаў. *(З якой мэтай Цімур збіраў рамеснікаў у сваёй сталіцы? Як вы думаеце, якім чынам пышнасць сталіцы Цімура адбівалася на жыцці заваяваных ім краін?)*

**3. Распад дзяржавы Цімура.** Цімур, які марыў стаць «уладаром свету», задумаў захапіць і Кітай. Але ледзь яго войска выступіла ў паход, як у лютым 1405 г. Цімур памёр. Адразу



Прыём замежных паслоў Цімурам. *Мініяцюра XV ст.*



Дом для вучняў. *Мініяцюра 1432 г.*

Правообладатель Народная асвета

ж яго сыны і ўнукі пачалі барацьбу за ўладу. Ніхто ў гэтай барацьбе не змог перамагчы. Адзінай арміі ўжо не існавала. Воіны Цімура ваявалі адзін супраць другога ў войсках яго спадчыннікаў. Велізарная дзяржава распалася.

Скарыстаўшы барацьбу паміж пераемнікамі Цімура, Іран захапілі качавыя туркменскія плямёны. У Сярэдняй Азіі працягвалі барацьбу паміж сабой нашчадкі Цімура. З іх найбольш праславіўся яго ўнук ***Улугбек***. Але славу яму прынеслі не перамогі ў войнах, а заняткі навукай і тое, што ён падтрымліваў культуру і адукацыю. Улугбек быў выдатным матэматыкам і астраномам. Ён пабудаваў у Самаркандзе абсерваторыю. Але супраць Улугбека выступілі яго прыбліжаныя, якія прагнулі ваенных перамог і здабычы. Яго забілі, а абсерваторыю разбурылі.

**1.** Чаму пала мангольскае валадарства ў Іране? **2.** Якой была мэта заваёў Цімура і якія іх вынікі? **3.** Чаму паходы Цімура былі паспяховымі? **4.** Назавіце прычыны распаду дзяржавы Цімура. **5.** Што агульнае ў лёсе велізарных дзяржаў, утвораных Чынгісханам і Цімурам? **6.** Паэт Алішэр Наваі (XV ст.): «Усе суродзічы Улугбека сышлі ў нябыт. Хто пра іх успамінае ў наш час? Але Улугбек працягнуў руку да навук і дамогся шмат чаго». Чаму паэт узвышае Улугбека, а не Цімура?

## § 24. Асманская дзяржава

**Успомніце:** 1. Якія дзяржавы знаходзіліся на Балканскім паўвостраве ў Высокім сярэдневякоўі? **2.** Якія тэрыторыі ўваходзілі ў дзяржаву, заснаваную Сельджукам? **3.** Якія наступствы мела бітва на Косавым полі ў 1389 г. для краін Балканскага паўвострава?

**1. Асманскае княства.** Каля сярэдзіны XIII ст. манголы разграмілі туркаў-сельджукаў у Малой Азіі. Манголы захавалі ўладу султанаў з дынастыі Сельджукідаў, але абавязалі іх плаціць даніну. Залежнасць ад манголаў выклікала нездаволенасць туркаў. Султан, які плаціў даніну манголам, страціў

Правообладатель Народная асвета

свой аўтарытэт. І ў Малой Азіі з'явілася два дзесяткі турэцкіх княстваў, якія не жадалі прызнаваць ні ўладу султана, ні мангольскіх правіцеляў, што аселі ў Іране.

Самымі дужымі былі княствы на берагах Эгейскага і Міжземнага мораў. Яны багацелі за кошт здабычы ў паходах на Візантыю і рабавання караблёў еўрапейскіх купцоў. Але не ім было наканавана стаць стваральнікамі новай турэцкай дзяржавы. Моц гэтых княстваў была падарвана каля сярэдзіны XIV ст. крыжовым паходам супраць іх французаў, італьянцаў і візантыйцаў. Аб'яднальнікам туркаў стала невялікае княства, якое размяшчалася на паўночным захадзе Малой Азіі ўдалечыні ад міжземнаморскіх гандлёвых шляхоў.

Заснавальнікам гэтага княства быў ***Асман***. Ён каля 1300 г. абвясціў аб незалежнасці ад султана. Па яго імені княства стала называцца ***Асманскім***. Першыя правіцелі княства стварылі коннае і пешае войска. Аснову яго склалі воіны, якія атрымлівалі ў паходах грошы за службу, а ў мірны час — зямлю, на якой працавалі. Моцная армія дала магчымасць Асманскаму княству прыступіць да заваявання суседніх тэрыторый. Спачатку галоўнай мэтай правіцеляў княства стаў захоп візантыйскіх уладанняў у Малой Азіі. Да сярэдзіны XIV ст. туркі-асманы выйшлі да берагоў Мармуровага мора. Але сіл для захопу Канстанцінопаля было недастаткова.

І тады асманскія правіцелі вырашылі прыступіць да захопу славянскіх зямель на Балканскім паўвостраве. Іх поспехам спрыяла тое, што паўднёваславянскія дзяржавы варагавалі паміж сабой і з Візантыяй, а таксама палітычная раздробленасць і барацьба за ўладу ў гэтых дзяржавах.

**2. Турэцкае войска.** Для далейшых заваёў патрабавалася больш моцнае войска. Пераемнікам Асмана ўдалося стварыць такую армію, якая ні ў чым не саступала арміям еўрапейскіх дзяржаў і нават пераўзыходзіла іх. Быў сфарміраваны пастаянны корпус пяхоты з воінаў-палонных і рабоў. Гэтых воінаў

Правообладатель Народная асвета

сталі называць ***янычарамі***. Звычайна янычараў выкарыстоўвалі пры штурме гарадоў і крэпасцей.

**Гістарычная даведка**

Назва «янычары» паходзіць ад слоў «новае войска» (па-турэцку — «йені чэры»). Спачатку ў янычарскі корпус набіралі захопленых у палон воінаў і рабоў. Іх прымушалі прымаць іслам. Янычары не павінны былі жаніцца, мець зносіны з чужымі людзьмі. Яны лічыліся рабамі правіцеля. Затым у янычары пачалі рыхтаваць хлопчыкаў з хрысціянскіх сем'яў. Іх забіралі ў бацькоў і аддавалі ў турэцкія сем'і. Хлопчыкаў вучылі вайсковай справе, строгай дысцыпліне. Іх выхоўвалі як фанатычных мусульман для барацьбы з іншаверцамі. Пасталеўшы, юнакі прымаліся ў шэрагі янычараў і станавіліся гвардыяй турэцкага правіцеля. *(Чаму янычары лічыліся найбольш надзейнымі ў войску туркаў-асманаў?)*

Па-новаму стала фарміравацца конніца. Асманскія правіцелі пачалі раздаваць лепшым воінам ***цімары*** — землі з сялянамі. Цімары даваліся за вайсковую службу без перадачы па спадчыне. Уладальнік цімара з гэтага часу мог сам не працаваць на зямлі. Яго забяспечвалі залежныя сяляне. У адрозненне ад уладальніка заходнееўрапейскага бенефіцыя ўладальнік цімара не меў права асабіста ўстанаўліваць павіннасці для сялян і судзіць іх. Ён атрымліваў толькі частку ўраджаю са сваёй зямлі, якая строга вызначалася правіцелем дзяржавы. Цімар даваўся для матэрыяльнага забеспячэння конных воінаў, якіх не павінны былі адцягваць гаспадарчыя клопаты. Турэцкія воіны імкнуліся атрымаць цімары. І гэта служыла магутным стымулам для заваявання ўсё новых зямель.

У другой палове XIV ст. войска туркаў-асманаў уяўляла сабой грозную сілу. Яго галоўную моц складала выдатна падрыхтаваная і ўзброеная конніца. У пешым страі ваявалі адданыя правіцелю янычары. Туркі навучыліся браць моцна ўмацаваныя гарады, выкарыстоўваючы артылерыю. З'явіўся і свой флот. З такой арміяй асманскія правіцелі змаглі скарыць велізарныя тэрыторыі.

Правообладатель Народная асвета



Турэцкія воіны. *Рэканструкцыя*

**3. Турэцкія заваёвы.** У сярэдзіне XIV ст. туркі-асманы аказалі ваенную дапамогу аднаму з прэтэндэнтаў на візантыйскі прастол. Ва ўзнагароду яны атрымалі крэпасць на заходнім беразе Мармуровага мора. Туды сталі перакідвацца турэцкія войскі, і неўзабаве пачалося заваяванне Балканскага паўвострава. Унук Асмана ***Мурад I*** прыняў тытул султана. Выкарыстоўваючы разлад паміж правіцелямі паўднёваславянскіх дзяржаў, туркі-асманы разграмілі сербаў, балгараў. Султан Мурад I загінуў у бітве на Косавым полі ў 1389 г., але гэта не спыніла заваёўнікаў. *(Успомніце, як загінуў Мурад I.)* Акрамя паўднёваславянскіх дзяржаў, туркі-асманы паступова захоплівалі землі Візантыі. Канстанцінопаль апынуўся ў акружэнні зямель, падуладных асманскаму султану.

Скарыўшы большую частку Балканскага паўвострава, туркі-асманы выйшлі да меж Венгрыі. Іх імклівыя заваяванні выклікалі трывогу ў многіх дзяржавах Еўропы. У 1396 г. 60-тысячнае войска рыцараў з Венгрыі, Польшчы, Германіі, Чэхіі, Францыі і нават Англіі рушыла ў крыжовы паход на туркаў. *(Як вы думаеце, чаму паход супраць туркаў быў абвешчаны крыжовым?)* Але ў бітве пад Нікапалем гэтае войска было ўшчэнт разгромлена арміяй султана ***Баязіда***, празванага «Маланкавым». Гэта была страшэнная параза. Здавалася, што і дні Візантыі злічаны.

Нечаканае выратаванне прыйшло з усходу. Сярэднеазіяцкі заваёўнік Цімур у 1402 г. у бязлітаснай бітве разбіў Баязіда і ўзяў яго ў палон. Цімур разрабаваў Малую Азію. Аднак пасля смерці Цімура асманскія султаны здолелі хутка аднавіць сваю магутнасць. Новыя паходы венграў, палякаў, рыцараў з

Правообладатель Народная асвета

іншых краін Еўропы супраць туркаў закончыліся паражэннямі. Увесну 1453 г. туркі-асманы пачалі аблогу Канстанцінопаля. У канцы мая штурмам яны завалодалі горадам. Візантыя знікла з карты свету. Султан ***Мехмед II Заваёўнік*** перайменаваў Канстанцінопаль у *Стамбул* і зрабіў яго сталіцай саваёй дзяржавы. Гэтая дзяржава стала адной з найбуйнейшых у Еўропе.

**4. Аб'яднанне турэцкіх дзяржаў Асманамі.** Асманскія правіцелі не адразу падпарадкавалі сабе іншыя турэцкія дзяржавы ў Малой Азіі. Гэта адбывалася адначасова з іх заваяваннямі на Балканскім паўвостраве.

Ваенныя поспехі Асманаў, багатая здабыча прыцягвалі да іх воінаў з іншых турэцкіх княстваў. Яны прагнулі здабычы і цімараў. Гэтага не маглі даць ім мясцовыя князі. Спробы ваяваць з Асманамі канчаліся разгромам непакорлівых. Таму многія турэцкія княствы палічылі за лепшае прызнаць уладу асманскага султана. Султан Мехмед II пасля ўзяцця Канстанцінопаля завяршыў аб'яднанне пад сваёй уладай Малой Азіі.

На працягу Позняга сярэдневякоўя Асманская дзяржава з маленькага княства здолела ператварыцца ў адну з найбуйнейшых дзяржаў свету. Яе тэрыторыя размяшчалася і ў Азіі, і ў Еўропе. Магутнае войска, сістэма цімараў, якая стымулявала турэцкіх воінаў ваяваць, слабасць суседніх дзяржаў і супярэчнасці паміж імі забяспечылі поспех асманскім султанам. Захапіўшы Візантыю і большую частку Балканскага паўвострава, турэцкія султаны і не думалі спыняць свае заваяванні. Над краінамі Еўропы і Азіі навісла сур'ёзная пагроза.



Турэцкі султан заслухоўвае даклады міністраў. *Мініяцюра XV ст.*

Правообладатель Народная асвета

**1.** Як вы думаеце, чаму заснавальнікам новай адзінай турэцкай дзяржавы сталі не моцныя прыморскія княствы, а невялікае княства ўдалечыні ад міжземнаморскіх гандлёвых шляхоў? **2.** У чым была сіла войска Асманскай дзяржавы? **3.** Чым турэцкі цімар адрозніваўся ад заходнееўрапейскага бенефіцыя? **4.** Якія былі прычыны хуткіх і велізарных турэцкіх заваяванняў у Еўропе? **5.** Чаму асманскі султан перанёс сваю сталіцу менавіта ў Канстанцінопаль? **6.** Як вы думаеце, калі б правіцелі Асманскага княства адразу ж сталі падпарадкоўваць сабе іншыя турэцкія княствы, то змаглі б яны дамагчыся такіх імклівых і вялікіх поспехаў у заваяваннях іншых зямель?

## § 25. Індыя ў XIV—XV стст.

**Успомніце:** **1.** Чаму шматлікія заваёўнікі імкнуліся скарыць Індыю? **2.** Калі ўтварыўся Дэлійскі султанат? **3.** Якія рэлігіі існавалі ў Індыі? **4.** Чаму заходнееўрапейцы так настойліва шукалі марскі шлях у Індыю?

**1. Узвышэнне султанаў Дэлі.** На пачатку XIV ст. небяспеку для Дэлійскага султаната сталі прычыняць набегі манголаў. Нашчадкі Чынгісхана з Ірана і Сярэдняй Азіі нападалі на поўнач Індыі. Мангольскія атрады падыходзілі і да Дэлі, рабуючы яго наваколлі.

Султаны Дэлі арганізавалі актыўны адпор. Было рэарганізавана і павялічана славутае коннае войска султаната. Дзень і ноч рамеснікі сталіцы ў спецыяльных дзяржаўных майстэрнях кавалі зброю. Падатак на сялян быў павялічаны да неверагодных памераў — яны павінны былі аддаваць у казну палову свайго ўраджаю! А сваім прыбліжаным султан нават забараніў уладкоўваць балі і сустракацца адзін з адным. Гэтым ён жадаў пазбегнуць здрады.

Рашучыя меры дапамаглі стрымаць націск манголаў. Хутка іх набегі спыніліся. Тады добра падрыхтаваная армія Дэлійскага султаната пачала працягваць заваяванні астатніх індыйскіх зямель. Султаны Дэлі здолелі падпарадкаваць сабе амаль усю Індыю. Толькі на самым поўдні сваю незалежнасць захавала некалькі невялікіх дзяржаў.

Правообладатель Народная асвета

Але ўлада султанаў Дэлі не была трывалай. Многія правіцелі невялікіх дзяржаў прызналі ўладу дэлійскіх султанаў, каб пазбегнуць разгрому. Аднак яны захавалі свае сілы. Таму на працягу ўсёй гісторыі Дэлійскага султаната ў ім не спыняліся міжусобныя войны. Але не толькі гэта аслабляла султанат. Па-ранейшаму працягвалі варагаваць індусы і мусульмане.

**2. Гарады і рамяство.** У Познім сярэдневякоўі Дэлі стаў адным з найпрыгажэйшых і шматлюдных гарадоў Азіі. У ім было многа дамоў з каменю і цэглы. Ніводны з іх не меў менш чым два паверхі. Дамы ўпрыгожвалі балконы і багатая разьба па камені. Але галоўным будаўнічым матэрыялам з'яўлялася цэгла. Будаўнікі Індыі навучыліся вырабляць злучальны вапнавы раствор. Яны ўзводзілі вытанчаныя аркі, якія з гэтага часу сталі сімвалам індыйска-мусульманскай культуры.

Горад упрыгожвалі шматлікія вялікія сады. У XIV ст. у Дэлі налічвалася каля 1000 навучальных устаноў, каля 70 бальніц, больш за 2000 храмаў і манастыроў. Горад быў абнесены моцнымі сценамі, таўшчыня якіх складала 5 метраў.

Бурна развівалася індыйскае рамяство. Індыя славілася сваімі разнастайнымі тканінамі. У сярэднія вякі тут было вынайдзена прадзільнае кола і механічнае прыстасаванне для расчэсвання бавоўны. Гэта дало магчымасць у 10 разоў хутчэй вырабляць тканіну.

Славутымі тканінамі былі муслін і парча. Муслін — напаўпразрыстая вельмі лёгкая тканіна. Парча, наадварот, тканіна шчыльная, цяжкая і бліскучая. У вобласці Кашмір навучыліся вырабляць вельмі тонкую шарсцяную тканіну. Да нашых дзён ва ўсім свеце яна мае назву па імені сваёй радзімы — кашмір ці кашамір.



Індуісцкія храмы ў Канчыпураме. *Сучасны выгляд*

Правообладатель Народная асвета

**Гістарычная даведка**

Індыя была вядома як краіна незлічоных скарбаў. Бо менавіта тут здабывалі мноства розных каштоўных камянёў, якія потым прадавалі на тэрыторыі ад Іспаніі да Японіі. Султаны Дэлі валодалі самым вялікім вядомым тады дыяментам — Кахінурам. Ён важыў 37 грамаў.

**3. Сельская гаспадарка.** Правіцелі Дэлійскага султаната шмат рабілі для развіцця сельскай гаспадаркі. Менавіта гэта павінна было спрыяць сіле і росквіту дзяржавы. У Індыі земляробству часта перашкаджала распаўсюджанне джунгляў. Сялянскія абшчыны часам з цяжкасцю ўтрымлівалі наступленне джунгляў на палі. Адзін з султанаў Дэлі проста вырашыў гэту праблему. Паводле яго загаду ўсе лясы вакол Дэлі былі высечаны. Гэты раён стаў адным з найважнейшых цэнтраў сельскай гаспадаркі. Для будаўніцтва арашальных каналаў зганялася мноства людзей.

Спрыяльны клімат і багатыя глебы Індыі давалі магчымасць практычна паўсюдна збіраць па 2—3 ураджаі ў год. Асноўнай культурай быў рыс. У Індыі ўжо тады вырошчвалі 21 сорт гэтай расліны.

Аднак жыццё індыйскіх сялян заставалася вельмі цяжкім. З раніцы да ночы яны працавалі, каб большую частку ўраджаю аддаць у выглядзе падатку сваім валадарам. Нягледзячы на багацце краіны, у Індыі на дарогах можна было сустрэць мноства жабракоў і галодных. Не менш іх пражывала ў гарадах, запаўняючы цесныя вулачкі.

**4. Занепад Дэлійскага султаната. Дзяржавы поўдня Індыі.** У 1398 г. у Індыю ўварвалася велізарная армія новага заваёўніка — Цімура. Індусы і мусульмане, забыўшыся пра супярэчнасці і крыўды, разам аказвалі адчайнае супраціўленне. Каб зламаць яго, Цімур праяўляў нечалавечую жорсткасць. З адсечаных чалавечых галоў складаліся горы-вежы.

Застрашаная сталіца Дэлі здалася. Але гэта не пазбавіла горад ад поўнага разгрому. Некалькі дзён з горада бес-

Правообладатель Народная асвета



Бітва войскаў Цімура з індыйцамі.
*Малюнак сучаснага мастака*

перапыннай чарадой выводзілі палонных рамеснікаў для будаўніцтва гарадоў у дзяржаве Цімура. Астатнія жыхары былі знішчаны. Горад абязлюдзеў.

Цімур не стаў усталёўваць у Індыі сваё панаванне. Але ў выніку яго нашэсця Дэлійскі султанат прыйшоў у заняпад. Яго межы паменшыліся да тэрыторыі вакол Дэлі. Індыя распалася на мноства варагуючых дзяржаў.

На поўдні найбуйнейшымі дзяржавамі сталі Бахмані і Віджаянагар. Улада ў Бахмані належала мусульманскім правіцелям. Яны таксама насілі тытулы султанаў, каб падкрэсліць сваю незалежнасць ад Дэлі. Але большасць падданых султанаў Бахмані спавядалі індуізм. Султаны вымушаны былі нават адмяніць падатак на ўсіх немусульман, абавязковы ва ўсіх краінах, дзе панаваў іслам. У Віджаянагары ўлада належала правіцелям, якія спавядалі індуізм, як і амаль усё насельніцтва гэтай дзяржавы. Абедзве дзяржавы поўдня Індыі варагавалі паміж сабой і вялі частыя войны.

**5. Гандаль. Прыбыццё еўрапейцаў у Індыю.** На акіянскім узбярэжжы Індыі існавала мноства багатых гарадоў. У іх партах ішоў актыўны гандаль. Бо сюды прыплывалі купцы з самых розных краін. Больш за ўсё было арабскіх купцоў — бясстрашных мараплаўцаў. Яны прывозілі ў Індыю славутых арабскіх скакуноў.

Правообладатель Народная асвета

Індыйскія купцы таксама адпраўляліся ў далёкія падарожжы. Індыйцы будавалі караблі без выкарыстання жалеза. Драўляныя часткі сцягвалі раслліннымі валокнамі. Гэтыя караблі былі адносна невялікія.

У 1498 г. да Індыі дабраўся першы еўрапейскі карабель. Але калі яго капітан партугалец Васка да Гама прапанаваў свае тавары ў дарунак індыйскім правіцелям, тыя палічылі гэта абразай — настолькі горшымі яны былі ў параўнанні з індыйскімі вырабамі. Затое самі еўрапейцы захапляліся багаццямі Індыі, асабліва каштоўнасцямі і мясцовымі вострымі прыправамі.

**1.** Чаму ўлада султанаў Дэлі ў XIV ст. у Індыі не была трывалай? **2.** Чым гарады Індыі Позняга сярэдневякоўя адрозніваліся ад заходнееўрапейскіх гарадоў? **3.** Якімі рамеснымі вырабамі славілася Індыя? **4.** Якіх поспехаў дасягнулі індыйцы ў развіцці сельскай гаспадаркі ў Познім сярэдневякоўі? **5.** Дакажыце, што Цімур здзейсніў менавіта рабаўніцкі паход у Індыю. **6.** Чаму Дэлійскі султанат распаўся? Ці ёсць тут падабенства з прычынамі распаду Арабскага халіфата?

### *Гістарычная даведка*

**Стаўленне да рэлігійных вераванняў у Дэлійскім султанаце.** Дэлійскія султаны абвясцілі дзяржаўнай рэлігіяй іслам. Індусам дазвалялася свабодна ўшаноўваць сваіх багоў. Але часам асабліва веруючыя мусульмане палілі свяшчэнныя кнігі індусаў, знішчалі статуі багоў і руйнавалі храмы.

Большасць індыйцаў засталіся вернымі сваёй рэлігіі — індуізму, родным мовам і ладу жыцця. Яны свята паважалі каставыя звычаі. *(Як ставіліся заваёўнікі да рэлігійных вераванняў індыйцаў? Ці прывяло валадарства султанаў Дэлі да прыняцця большасцю насельніцтва Індыі ісламу і адмове ад каставых звычаяў?)*

Правообладатель Народная асвета

## § 26. Кітай у XIV—XV стст.

**Успомніце:** **1.** Якім быў дзяржаўны лад Кітая ў VII—X стст.? **2.** Калі Кітай быў заваяваны манголамі? **3.** Калі распалася адзіная Мангольская дзяржава, створаная Чынгісханам? **4.** Якія рэлігіі існавалі ў сярэдневяковым Кітаі?

**1. Звяржэнне мангольскага ярма.** Мангольская дынастыя ***Юань***, якая кіравала ў Кітаі з канца XIII ст., выклікала ўсеагульную нянавісць. Падаткі павялічыліся ў некалькі дзесяткаў разоў. Кітайцы былі пазбаўлены амаль усіх правоў. Ім забаранялася насіць зброю, паляваць, вучыцца вайсковай справе, праводзіць якія-небудзь сходы, запальваць па начах святло ў сваім жыллі. Перамяшчацца па краіне можна было, толькі атрымаўшы асобы дазвол мангольскіх улад. Кітайцаў не дапускалі да дзяржаўных пасад.

Мангольскае валадарства разбурыла гаспадарку Кітая. Шматлікія раёны, якія раней працвіталі, часам не маглі пракарміць сябе і мангольскае войска, што размяшчалася тут. Шмат людзей памірала ад голаду. Нездарма менавіта пры манголах у Кітаі пачалася наймацнейшая эпідэмія чумы — «чорнай смерці». Ад яе памёр кожны трэці кітаец. Праз некалькі дзесяткаў гадоў яна дабралася да Еўропы, забраўшы і тут мільёны чалавечых жыццяў.

У дадатак да ўсіх бед услед адбылося некалькі катастрафічных паводак. Рака Хуанхэ знесла дамбы ў земляробчых раёнах. Раз за разам яна разлівалася. Загінулі сотні тысяч людзей. Занепакоіліся нават мангольскія ўлады. Дзесяткі тысяч людзей былі сагнаны, каб аднавіць дамбы.

У сярэдзіне XIV ст. у Кітаі пачалося магутнае народнае паўстанне супраць валадарства манголаў. Паўстанцы насілі павязкі чырвонага колеру, і іх барацьбу з манголамі назвалі паўстаннем «чырвоных войскаў». Паўстанцамі былі галоўным чынам сяляне. У **1368** г. паўстанцы вызвалілі Пекін і неўзабаве выгналі манголаў з краіны.

Правообладатель Народная асвета



Храм Неба. *Сучасны выгляд*

**2. Дынастыя Мін на чале ўлады.** На чале краіны ўстаў правадыр «чырвоных войскаў», што паўсталі, ***Чжу Юаньчжан***. Ён абвясціў сябе імператарам і пачаў рэформы, каб аднавіць краіну. Новая дынастыя атрымала назву ***Мін*** — «Святло».

Першыя імператары Мін імкнуліся ўсімі сіламі ўмацаваць сваю ўладу. Яны нават адмянілі пасаду першага міністра, каб ні з кім не дзяліць кіраванне краінай. Войска было падпарадкавана асабіста імператару. Тым часам асобае значэнне набылі *інспектары*, якія павінны былі служыць «вушамі і вачамі» імператара.

Чжу Юаньчжан паходзіў з сялян. Імператарскую ўладу ён атрымаў не з-за знатнасці або па спадчыне, а ў барацьбе з манголамі. Новы імператар баяўся, што яго могуць звергнуць. Ён не давяраў нікому, акрамя ўласных шматлікіх сыноў. Іх ён назначыў кіраўнікамі ў самыя буйныя гарады. Заахвочваліся даносы на знатных людзей, чыноўнікаў, вышэйшых ваенных. Праводзіліся масавыя пакаранні смерцю і ссылкі людзей, западозраных імператарам у замаху на яго ўладу. Але па-ранейшаму чыноўнікі з'яўляліся галоўнай апорай імператара ў кіраванні краінай. Пануючай рэлігіяй было канфуцыянства.

**3. Аднаўленне гаспадаркі краіны.** Першыя імператары новай дынастыі імкнуліся раздаць сялянам зямлю, каб паправіць справы ў сельскай гаспадарцы. Важнай праблемай стала засяленне апусцелых пры манголах зямель. Сяляне, якія перасяляліся сюды, вызваляліся ад усіх падаткаў і ўсялякіх форм залежнасці.

Адначасова на апусцелыя землі выводзілі вайсковыя пасяленні. Іх жыхары былі салдатамі на дзяржаўнай службе,

Правообладатель Народная асвета

але адначасова апрацоўвалі зямлю як сяляне. Гэту палітыку асабліва паспяхова ўжывалі ў аддаленых правінцыях, якія засяляліся кітайскім насельніцтвам. На пачатку кіравання дынастыі Мін становішча сялян палепшылася.



Сельская школа.
*Мініяцюра XIV ст.*

Эканамічныя рэформы першых мінскіх імператараў прывялі краіну да росквіту. Пасля аднаўлення сельскай гаспадаркі быў праведзены ўсеагульны перапіс насельніцтва, а затым уведзена адзіная сістэма падаткаў. Але паступова падаткі сталі павялічвацца. І не толькі на сялян, але і на рамеснікаў і купцоў. Велізарны апарат чыноўнікаў, армія, раскошны імператарскі двор патрабавалі вялікіх сродкаў. Рамяство і гандаль кантраляваліся дзяржавай. У руках дзяржавы знаходзіўся і знешні гандаль. Гэта стрымлівала ініцыятыву рамеснікаў і купцоў. У выніку жыццё людзей стала пагаршацца.



Урачысты выхад імператара з Забароненага горада.
*Мініяцюра з кітайскага летапісу*

**4. Узвышэнне Кітая пры мінскіх імператарах.** Імператары Мін пакінулі сталіцу ў Пекіне. У горадзе ў канцы XV ст. пражывала каля мільёна чалавек. Ужо пры першых імператарах пачалося будаўніцтва ў Пекіне ***Забароненага горада*** — імператарскай рэзідэнцыі, куды быў забаронены

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



Караблі адмірала Чжэн Хэ. *Рэканструкцыя*

ўваход простым людзям. Сюды звозіліся скарбы з усёй краіны і зганяліся лепшыя майстры для вядзення будаўнічых работ.

Імперыя Мін неўзабаве пачала заваявальную палітыку, падпарадкаваўшы такія краіны, як В’етнам, Карэя, Бірма. Імператары жадалі даведацца, якія яшчэ землі можна захапіць. Да многіх багатых краін цяжка было дабрацца па сушы. Таму правіцелі Кітая арганізавалі некалькі буйных марскіх экспедыцый.

Праслаўлены адмірал ***Чжэн Хэ*** здзейсніў 7 марскіх вандраванняў. У іх удзельнічала па некалькі дзесяткаў вялікіх караблёў. Гэта былі караблі з 3—4 і болей мачтамі і з экіпажам да 600 чалавек. Караблі Чжэн Хэ дасягнулі Індыі, Аравіі і Усходняй Афрыкі. Так яшчэ за паўстагоддзя да прыбыцця еўрапейцаў афрыканскае ўзбярэжжа пачула грукат артылерыйскіх залпаў.

У далёкіх краінах з’явіліся калоніі кітайскіх купцоў. Кітайскі гандаль квітнеў. Бо ва ўсім свеце працягвалі шанаваць і купляць кітайскі шоўк і фарфор.

Кітайскія імператары сталі патрабаваць падпарадкавання ад усіх гасудароў свету, як ад нявартых і адсталых варвараў «чатырох бакоў свету». Яны запатрабавалі выяўлення пакорнасці і прынясення даніны нават ад Цімура. Жорсткі правіцель прыйшоў у лютасць і пачаў рыхтаваць паход у Кітай. Толькі смерць Цімура ў 1405 г. выратавала Кітай ад новага спусташальнага нашэсця.

? **1.** Што прынесла Кітаю мангольскае валадарства? **2.** Калі і як манголы былі выгнаны з Кітая? **3.** У чым былі асаблівасці дзяржаўнага кіравання ў Кітаі пры першых імператарах дынастыі Мін? **4.** Чаму мінскія імператары зрабілі пануючай рэлігіяй менавіта

Правообладатель Народная асвета

канфуцыянства? **5.** Дакажыце, што ў перыяд кіравання дынастыі Мін у Кітаі наступіў гаспадарчы ўздым. **6.** Якімі былі мэты кітайскіх марскіх экспедыцый? Ці адрозніваліся яны ад плаванняў заходнееўрапейцаў пачатку Вялікіх геаграфічных адкрыццяў?

***Гістарычная даведка***

Першыя майстэрні з падзелам працы па спецыяльнасцях з'явіліся ў Кітаі яшчэ ў старажытнасці. У I ст. да н. э. майстэрні належалі дзяржаве. Чыноўнікі сачылі за іх працай і за якасцю вырабаў рамеснікаў. Археолагі выявілі на пакрытым лакам кубку такі надпіс: «Абмераў кубак майстар па імені Цзінь, пакрыў яе лакам — Цэі, паліраваў яе — Цынь, пазалаціў яе ручкі — Мао, афарбаваў яе — Лі, гравіраваў яе — І. Камандзір аховы майстэрні — Чжан. Дырэктар — Лян. Намеснік дырэктара — Фэн. Памочнік — Лон, пісаў — Бао».

*(Параўнайце старажытнакітайскую майстэрню з еўрапейскай мануфактурай.)*

| Пытанні для параўнання | Старажытнакітайская майстэрня | Еўрапейская мануфактура |
|---|---|---|
| Хто валодаў майстэрняй? | | |
| Ці быў падзел працы? | | |
| Хто працаваў? | | |
| Хто сачыў за якасцю вырабаў? | | |

## § 27. Японская цывілізацыя

**Успомніце:** **1.** Якія грамадскія адносіны склаліся ў Японіі ў Высокім сярэдневякоўі? **2.** Хто такія самураі? **3.** Якія іншаземныя захопнікі нападалі на Японію ў Высокім сярэдневякоўі?

**1. Асаблівасці дзяржаўнага ладу Японіі.** Японія была адзінай пазаеўрапейскай цывілізацыяй, дзе сфарміраваліся феадальныя адносіны. Яны паўплывалі і на дзяржаўны лад кра-

Правообладатель Народная асвета

іны. Галоўнай асаблівасцю японскай дзяржавы ў Познім сярэдневякоўі была наяўнасць двух вярхоўных правіцеляў. Галавой дзяржавы па-ранейшаму лічыўся *імператар*, але на самай справе ўся ўлада знаходзілася ў руках *сёгуна*.

Асоба імператара для японцаў з'яўлялася свяшчэннай. Бо па вераваннях сінтаізму яго род паходзіў ад самой багіні сонца — галоўнай багіні сінтаізму. І ніхто не аспрэчваў ролю імператара як галоўнага свяшчэннаслужыцеля старажытнай рэлігіі японцаў. Імператары, як і раней, мелі раскошныя палацы, шматлікіх прыдворных. Ім падпарадкоўваліся вышэйшыя чыноўнікі і чыноўнікі на месцах.

Але паралельна з імператарскім апаратам кіравання дзяржавай свой уласны апарат стварылі і сёгуны. Яны былі ваеннымі правадырамі, лічыліся першымі з самураяў. Самураі і з'яўляліся іх галоўнай апорай. З іх ліку сёгуны стварылі свой урад. Яго называлі па-ваеннаму — «*стаўка*». Ва ўсе вобласці і раёны краіны і нават у буйныя ўладанні сёгуны назначалі сваіх упаўнаважаных. Гэтыя вайсковыя чыноўнікі адцяснілі ад кіравання чыноўнікаў імператара і самі кіравалі даручаным ім насельніцтвам.

Сёгуны назначаліся імператарамі. Але паколькі за сёгунамі стаяла ваенная сіла з самураяў, імператары не мелі выбару. Яны прызначалі новым сёгунам таго, каго вызначаў сваім пераемнікам папярэдні сёгун. У выніку сфарміраваліся цэлыя дынастыі сёгунаў. На пачатку XIV ст. краінай кіравалі сёгуны з роду *Мінамота*, а затым — з роду *Асікага*.

**2. Міжусобныя войны.** Адбіўшы мангольскае нашэсце ў XIII ст., Японія не вяла войнаў з іншымі дзяржавамі да самага канца XVI ст. Але ваеннае саслоўе самураяў складала больш за 1/10 насельніцтва краіны. Гэтыя людзі і члены іх сем'яў не сеялі, не жалі, заняткі рамяством і гандлем сярод іх лічыліся ганебнымі. Галоўнымі вартымі заняткамі для іх былі вайна і авалоданне баявымі мастацтвамі.

Правообладатель Народная асвета

***Гістарычная даведка***

У Францыі і Англіі ў адрозненне ад Японіі рыцарскае саслоўе складала не больш за 1—2 % насельніцтва краіны. *(Якія заняткі лічылі вартымі еўрапейскія рыцары?)*

Самураі ганарыліся ўмелым валоданнем вялікім двухручным мячом, мастацтвам трапна страляць з лука вярхом на кані і іншымі навыкамі вайсковай справы. Сялянам, гараджанам мець зброю забаранялася. Самураі складалі саслоўе ваенных людзей у Японіі.

Самураі-васалы беспярэчна падпарадкоўваліся загадам сваіх сеньёраў. Вернасць гаспадару лічылася галоўнай доблесцю самурая. Яны абавязаны былі адпомсціць забойцу ці крыўдзіцелю свайго гаспадара нават цаной уласнага жыцця. Усе гэтыя якасці і ўменні самураяў выкарыстоўвалі буйныя феадалы ў войнах за свае інтарэсы.

У 30-я гг. XIV ст. у Японіі разгарэлася доўгая міжусобная вайна. Яна працягвалася амаль 60 гадоў. Тады імператары паспрабавалі аднавіць сваю ўладу над краінай. Іх падтрымалі буйныя феадалы поўдня, дзе было шмат самураяў яшчэ з часоў адбіцця нашэсця манголаў. Кіраванню сёгунаў з роду Мінамота быў паложаны канец. Але і імператары не дабіліся свайго. Да ўлады прыйшлі новыя сёгуны з роду Асікага.





Японец у касцюмах воіна і князя. XIV—XV стст. *Рэканструкцыя*

Аднак сёгунам не ўдалося ўтрымаць уладу над краінай. Буйныя феадалы не жадалі прызнаваць сябе іх васаламі. А прызначаныя сёгунам кіраўнікі абласцей падпарадка-

Правообладатель Народная асвета



Бітва паміж князямі. *Мініяцюра 1348 г.*

валі сабе мясцовых самураяў. У выніку ўтварылася мноства вялікіх армій з самураяў, якія служылі сваім гаспадарам. З канца XV ст. у Японіі разгарэліся бесперапынныя міжусобныя феадальныя войны. Яны доўжыліся больш за 100 гадоў, і японцы называюць гэты перыяд «смутным часам».

Войны спусташалі краіну. Асабліва пакутавалі сяляне і гараджане. Даведзеныя да роспачы сяляне адной з абласцей Японіі ў канцы XV ст. паўсталі. Яны выгналі войскі феадалаў і ўсталявалі сваё самакіраванне. Сем гадоў сяляне самі кіравалі вобласцю, але затым феадалы задушылі паўстанне.

Слабасць цэнтральнай улады ў Японіі і наяўнасць вялікай колькасці воінаў-самураяў у буйных феадалаў прывялі да працяглых міжусобных войнаў.

**3. Японскі жывапіс і тэатр.** Нягледзячы на цяжкае становішча ў краіне, японская культура не прыйшла ў заняпад. Паспяхова развіваліся жывапіс, літаратура, узнік тэатр *Но*.

Японскія мастакі ў сваіх карцінах і малюнках па-майстэрску адлюстроўвалі прыроду сваёй краіны. У Познім сярэдневякоўі распаўсюдзіўся жывапіс чорнай тушшу. Карыстаючыся ўсяго адным колерам, мастакі дакладна і аб’ёмна малявалі велічнасць гор, бурныя струмені рэк, парывы ветру, які нахіляе дрэвы. Птушкі і жывёлы выглядалі нібы жывыя.

Правообладатель Народная асвета



Маскі японскага нацыянальнага тэатра

Любоў да прыроды праяўлялася не толькі ў жывапісе. Японцы стваралі цудоўныя сады. У іх былі не толькі дрэвы і кусты, але і прыгожыя камяні, розныя травы, кветкі. Наведванне такога саду павінна было пакінуць у баку паўсядзённыя справы чалавека, заахвоціць яго задумацца аб харастве прыроды, сваім месцы ў неабсяжным свеце.

З XIV ст. існуе японскі нацыянальны тэатр Но. Ён незвычайны для еўрапейцаў. Акцёры ў ім гралі ў масках. Яны паказвалі чалавечыя пачуцці не выразам твару, а голасам, рухамі цела і асабліва танцамі. Спектакль даваўся на пляцоўцы, на якой разам з акцёрамі знаходзіліся хор і аркестр з трох барабанаў і флейты. Часцей за ўсё ставіліся п'есы пра подзвігі самураяў, і тэатр Но стаў любімым тэатрам самураяў. Просты ж народ аддаваў перавагу спектаклям, дзе акцёры і лялечнікі паказвалі смешныя сцэны са штодзённага жыцця.

**1.** Чаму ў Японіі ў Познім сярэдневякоўі галавой дзяржавы лічыўся імператар, хаця рэальная ўлада ў краіне належала не яму, а сёгуну? **2.** Што з'яўлялася галоўнай апорай улады сёгунаў? **3.** Чаму ў Японіі ў Познім сярэдневякоўі міжусобныя феадальныя войны працягваліся дзесяцігоддзямі? **4.** Ці можна гаварыць аб заняпадзе японскай культуры ў Познім сярэдневякоўі? **5.** Што галоўным чынам малявалі на сваіх карцінах японскія мастакі? Як вы думаеце чаму? **6.** Чым тэатр Но адрозніваецца ад нашага сучаснага тэатра?

Правообладатель Народная асвета

# § 28. Цывілізацыі Трапічнай Афрыкі і Амерыкі

**Успомніце:** **1.** Якія дзяржавы існавалі ў Трапічнай Афрыцы ў Раннім і Высокім сярэдневякоўі? **2.** Што вам вядома пра іх сувязі з іншымі цывілізацыямі? **3.** Якім быў грамадскі лад гарадоў-дзяржаў майя?

**1. Дзяржавы Трапічнай Афрыкі.** У Познім сярэдневякоўі ў Трапічнай Афрыцы павялічылася колькасць дзяржаў, створаных мясцовым насельніцтвам. Яны размяшчаліся ўжо не толькі па цячэнні ракі Нігер, у возера Чад і на землях Эфіопіі. Да XIV ст. узнікла дзяржава ***Конга***, а з пачатку XV ст. вядома буйная дзяржава на тэрыторыі цяперашняга Зімбабве. Позняе сярэдневякоўе было часам росквіту гарадоў-дзяржаў на тэрыторыі Нігерыі і ўсходняга ўзбярэжжа Афрыкі.

І ўсе ж такі афрыканскія цывілізацыі былі асобнымі ачагамі высокаразвітога грамадства. А між імі на велізарных прасторах жыло мноства плямёнаў яшчэ ва ўмовах першабытнага ладу. Сувязі паміж афрыканскімі цывілізацыямі былі слабымі. Пра многія з іх еўрапейцы даведаліся толькі ў самым канцы сярэдневякоўя.

Найбуйнейшымі дзяржавамі Позняга сярэдневякоўя ў басейне ракі Нігер былі ***Малі*** і ***Сангай***. Іх правіцелі кантралявалі гандаль з арабамі Паўночнай Афрыкі. У гэтых дзяржавах быў прыняты іслам.



Зімбабве — сталіца Манаматапы. *Рэканструкцыя*

***Гістарычная даведка***

У пачатку XIV ст. адзін з правіцеляў Малі здзейсніў вандраванне ў Мекку. Яго суправаджалі 8 тысяч воінаў і яшчэ большая колькасць слуг і рабоў. Велізарны караван вярблюдаў вёз больш як дванаццаць тон золата. Малійскі правіцель шчодра траціў золата: не гандлюючыся, плаціў любую цану за тавары, раздаваў вялізныя сумы як міласціну беднякам. Арабы былі здзіўлены яго багаццем і раскошай. У сярэднія вякі Малі і суседнія афрыканскія дзяржавы называлі «краінай золата».

Правообладатель Народная асвета

У XIV ст. сангаі плацілі даніну Малі. Але ў XV ст. іх правіцель ***Алі Бер Вялікі*** зрабіў мноства ваенных паходаў супраць суседзяў. І Сангайская дзяржава стала наймацнейшай.

На паўднёвы ўсход ад яго набірала сілу дзяржава Конга. Уладанні яго правіцеляў распасціраліся далёка за даліну аднайменнай ракі. Каля ўсходняга ўзбярэжжа Афрыкі сфарміравалася буйная дзяржава ***Манаматапа***. Вандроўнікаў здзіўлялі велізарныя каменныя будынкі ў яго сталіцы. Правіцелі гэтай дзяржавы багацелі на гандлі з гарадамі-дзяржавамі ўзбярэжжа, прадаючы золата, слановую косць, шкуры леапардаў.

Позняе сярэдневякоўе было часам росквіту хрысціянскай Эфіопіі. Значна ўзмацнілася ўлада цара, які кіраваў краінай з дапамогай велізарнай колькасці чыноўнікаў. Хрысціянская царква разам з царамі выкараняла рэшткі язычніцтва, сурова праследавала ерэтыкоў.

**2. Грамадскія адносіны ў дзяржавах Трапічнай Афрыкі.** У аснове гаспадарчага жыцця афрыканскіх дзяржаў было земляробства. Большую частку насельніцтва складалі земляробы, аб'яднаныя ў абшчыны. Гэтыя людзі былі асабіста вольнымі. Але зямля лічылася ўласнасцю правіцеля дзяржавы. І сяляне-абшчыннікі абавязаны былі аддаваць валадару частку сабранага ўраджаю. Яны ж апрацоўвалі і спецыяльна вылучаныя для правіцеляў палі, увесь ураджай з якіх паступаў правіцелю.

Асаблівасцю сярэдневяковых цывілізацый Трапічнай Афрыкі была наяўнасць вялікай колькасці рабоў. Гэтыя бяспраўныя людзі ўваходзілі ў склад абшчыны і выконвалі ў ёй самую цяжкую работу. Шмат рабоў працавала на палях правіцеляў, а таксама іх сваякоў і чыноўнікаў. Частка рабоў набіралася ў войска. Там яны верна служылі правіцелям, разлічваючы здабыць свабоду і дастатак.

Правообладатель Народная асвета



Правадыр афрыканскага племені. *Рэканструкцыя*

Афрыканскія дзяржавы былі манархіямі. Але ўлада манарха абмяжоўвалася саветам знаці. Дзяржаўных чыноўнікаў было нямнога. Адзінаўладдзю манарха перашкаджалі племянныя правадыры і старэйшыны.

У дзяржавах Трапічнай Афрыкі феадальныя адносіны не сфарміраваліся. Толькі ў Эфіопіі і шэрагу мусульманскіх дзяржаў правіцелі раздавалі землі за службу чыноўнікам і воінам. Але гэтыя ўладанні не былі спадчыннымі, як феод у Еўропе.

**3. Амерыканскія цывілізацыі.** Найбуйнейшыя цывілізацыі Амерыкі ў Познім сярэдневякоўі былі ўтвораны ў Цэнтральнай Амерыцы і ў паўночна-заходняй частцы Паўднёваамерыканскага кантынента.

На тэрыторыі сучаснай Мексікі стварылі цывілізацыю ***ацтэкі***. Яны заваявалі мноства суседніх народаў, якія плацілі ім даніну. Ацтэкі валодалі значнай колькасцю рабоў. Існавалі рынкі, дзе прадавалі і куплялі рабоў. Сталіца ацтэкаў размяшчалася на высокім востраве пасярэдзіне возера. Да горада вялі тры насыпныя, брукаваныя дарогі. У ім былі прамыя вуліцы і каналы, па якіх плавалі лодкі. У цэнтры знаходзіліся галоўныя храмы, дамы жрацоў, школы. Побач стаялі раскошныя палацы ацтэкскіх правіцеляў. Горад патанаў у садах, у ім дзейнічала некалькі базараў. Жыло ў ім і шмат рамеснікаў і гандляроў.

Ацтэкі верылі ў багоў, якія ўвасаблялі сабой сілы прыроды. Яны лічылі, што багоў трэба пастаянна карміць чалавечай крывёю, інакш яны памруць, і ўвесь свет загіне. Таму ацтэкі прыносілі ў ахвяру палонных.

Правообладатель Народная асвета



Рэлігійнае свята ацтэкаў.
*Малюнак сучаснага мастака*



Жанчына з дзіцём.
*Статуэтка інкаў XIV ст.*

Уздоўж узбярэжжа Ціхага акіяна ў Паўднёвай Амерыцы існавала вялікая дзяржава ***інкаў***. На працягу XV ст. інкі, якія жылі на тэрыторыі сучаснага Перу, падпарадкавалі сабе шматлікія суседнія народы.

На чале дзяржавы стаяў вярхоўны Інка. Ён лічыўся сынам Сонца, аднаго з галоўных багоў. Заваёўнікі інкі былі толькі воінамі і чыноўнікамі. Падпарадкаванае насельніцтва плаціла даніну і выконвала работы, галоўным чынам сельскагаспадарчыя і будаўнічыя.

***Гістарычная даведка***

Пісьменнасці ў інкаў не было. Але як чыноўнікам ажыццяўляць улік і кантроль за насельніцтвам? Трэба было навучыцца перадаваць і захоўваць інфармацыю. І ў інкаў з'явілася «вузельчыкавае пісьмо». Да кавалка вяроўкі прывязваліся рознакаляровыя шнуркі. А на шнурках завязвалі вузельчыкі рознай формы. Усё гэта абазначала, колькі ў якім раёне людзей працуе на палях, колькі яны сабралі тых ці іншых пладоў, гародніны, збожжа, ці не было паводак і г. д.

Дзяржавы Амерыкі былі манархіямі. Манарх з'яўляўся не толькі вярхоўным правіцелем дзяржавы, але і вышэй-

Правообладатель Народная асвета

шым жрацом. Яго апорай былі шматлікія чыноўнікі. Вышэйшы пласт грамадства складалі заваёўнікі — ацтэкі і інкі. А асноўную масу насельніцтва — землякробы-абшчыннікі. Яны выплачвалі даніну правіцелям, гэтак жа як і рамеснікі, і гандляры.

**1.** Якія дзяржавы ўтварыліся ў розных частках афрыканскага кантынента ў Познім сярэдневякоўі? **2.** Хто складаў большасць насельніцтва афрыканскіх дзяржаў і якія былі абавязкі гэтых людзей перад дзяржавай? **3.** Чым была абмежавана ўлада манарха ў дзяржавах Трапічнай Афрыкі? **4.** Чым адрозніваўся дзяржаўны лад ацтэкаў і інкаў ад гарадоў-дзяржаў майя? **5.** Чым можна растлумачыць, што манархі ў ацтэкаў і інкаў адначасова з'яўляліся і вярхоўнымі жрацамі? **6.** Дакажыце, што ў сярэдневяковых цывілізацыях Трапічнай Афрыкі і Амерыкі феадальныя адносіны не сфарміраваліся.

## *АБАГУЛЬНЕННЕ ДА РАЗДЗЕЛА III*

### Цывілізацыі Азіі, Афрыкі і Амерыкі

У Познім сярэдневякоўі развіццё цывілізацый Азіі ў адрозненне ад Заходняй Еўропы не паскорылася, а замарудзілася. Гэта было выклікана шматлікімі прычынамі. Адной з галоўных з'яўляліся іншаземныя нашэсці, якія не спыняліся. Спусташальным было мангольскае валадарства ў Кітаі, Іране і іншых краінах. Яно было звергнута народнымі паўстаннямі, але яго пагібельныя наступствы адбіваліся вельмі доўга. Смерць і спусташэнні шматлікім краінам Азіі прынеслі крывавыя заваёвы Цімура. Яго велізарная дзяржава, якая трымалася на ваеннай сіле і страху, распалася адразу ж пасля смерці жорсткага заваёўніка.

Развіццю Японіі перашкаджалі міжусобныя войны, што не спыняліся. Індыя была падзелена на мноства дзяржаў, якія варагавалі.

Правообладатель Народная асвета

У цывілізацыях Азіі душылася ініцыятыва чалавека. Там гарады не ведалі самакіравання. Усё рэгулявалася і кантралявалася дзяржаўнымі чыноўнікамі: праца сялян, рамеснікаў, гандляроў.

У Азіі не ўзніклі прыватныя мануфактуры, як у Еўропе. Мануфактуры былі толькі дзяржаўнымі і выконвалі дзяржаўныя заказы. Вырабы ўсходніх рамеснікаў былі раскошнымі, але дарагімі. Яны не маглі канкурыраваць з таннымі таварамі з Заходняй Еўропы.

Ні ў грамадстве, ні ў дзяржаўным ладзе цывілізацый Азіі ў Познім сярэдневякоўі не адбылося сур'ёзных змяненняў. Яны нібы застылі ў сваім развіцці.

У лік наймацнейшых дзяржаў Азіі ў Познім сярэдневякоўі ўвайшла Асманская дзяржава. Узнікнуўшы ў Малой Азіі, яна неўзабаве раскінула свае межы і на захадзе Азіі, і на паўднёвым усходзе Еўропы. Яе ваенная моц заключалася ў сістэме зямельных уладанняў за вайсковую службу. Турэцкая пагроза на некалькі стагоддзяў навісла над краінамі Азіі, Еўропы і Афрыкі.

У Трапічнай Афрыцы і Амерыцы цывілізацыі па-ранейшаму існавалі ў выглядзе асобных ачагоў сярод велізарных тэрыторый, населеных людзьмі, якія не ведалі ні пісьменнасці, ні гарадоў, ні дзяржавы. Але ў Познім сярэдневякоўі ў Амерыцы з'явіліся буйныя цывілізацыі ацтэкаў і інкаў. А ў Афрыцы сфарміраваліся дзяржавы Сангай, Конга, Манаматапа.

## Пытанні і заданні

Назавіце даты наступных падзей: **1.** Выгнанне манголаў з Пекіна кітайскімі паўстанцамі. **2.** Уварванне Цімура ў Індыю. **3.** Прыбыццё Васка да Гамы ў Індыю. **4.** Узяцце туркамі-асманамі Канстанцінопаля. **5.** Разгром туркамі-асманамі крыжаносцаў пад Нікапалем.

Правообладатель Народная асвета

На тэрыторыі якіх сучасных краін размяшчаліся гэтыя сярэдневяковыя дзяржавы: **1.** Дэлійскі султанат. **2.** Дзяржава Цімура. **3.** Імперыя Мін. **4.** Бахмані. **5.** Віджаянагар. **6.** Дзяржава ацтэкаў?

Хто з вядомых вам правіцеляў азіяцкіх дзяржаў былі сучаснікамі еўрапейцаў: Жаны д'Арк, Франчэска Петраркі, Сандра Батычэлі, Філіпа Брунелескі?

Назавіце найбуйнейшыя дзяржавы Позняга сярэдневякоўя ў Азіі, Трапічнай Афрыцы, Амерыцы. Якія з названых вамі дзяржаў існуюць і цяпер?

Назавіце рэлігіі, распаўсюджаныя ў сярэдневяковых Індыі, Японіі, Кітаі, Асманскай дзяржаве.

Самураі і янычары былі выдатнымі воінамі. Але існавалі сур'ёзныя адрозненні паміж імі ў іх паходжанні, грамадскім і маёмасным становішчы, рэлігійных вераваннях, паводзінах. Ахарактарызуйце гэтыя адрозненні.

Якія мангольскія дзяржавы існавалі на захопленых манголамі землях? Якое з іх праіснавала даўжэй, чым астатнія?

Чаму Японія была адной з нешматлікіх краін Азіі, якую ў сярэднія вякі нікому не ўдалося захапіць?

Вызначце, да якіх з гэтых дзяржаў — Сангай, Эфіопія, інкаў — належаць наступныя дасягненні культуры:

**1.** Храм Сонца.
**2.** Стварэнне абразоў з выявай Багародзіцы.
**3.** Будаўніцтва мячэцей.
**4.** Вынаходства «вузельчыкавага пісьма».
**5.** Статуэткі багоў з золата.
**6.** Стварэнне манастырскіх бібліятэк.
**7.** Стварэнне фрэсак з выявамі Ісуса Хрыста.

Запоўніце табліцу «Рэлігіі Індыі — іслам і індуізм», выбраўшы адказы з прапанаванага пераліку:

мячэць, Каран, прарок, Рыгведа, адзін Бог — Алах, мнагабожжа, храм, санскрыт, арабская.

Правообладатель Народная асвета

| Пытанні для параўнання | Іслам | Індуізм |
|---|---|---|
| 1. Уяўленне вернікаў пра Бога і багоў | | |
| 2. Стаўленне вернікаў да Мухамеда | | не шануецца |
| 3. Свяшчэнная кніга | | |
| 4. Мова свяшчэннай кнігі | | |
| 5. Дом для малітваў і абрадаў | | |

Назавіце прычыны: узвышэння Асманскай дзяржавы ў Познім сярэдневякоўі; міжусобных войнаў у Японіі ў XIV—XV стст.; запаволення развіцця азіяцкіх цывілізацый у Познім сярэдневякоўі ў параўнанні з Заходняй Еўропай; адсутнасці ў познесярэдневяковай Індыі адзінай дзяржавы.

Уявіце сабе, што жыхар сярэдневяковага Парыжа нечакана апынуўся ў Дэлі XIV ст. З чым незвычайным для сябе ён бы сустрэўся? Якія цяжкасці чакалі б яго ў зносінах з жыхарамі Дэлі, у побыце, у паводзінах? Складзіце пра гэта апавяданне.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Сярэдневякоўе ў гісторыі чалавецтва

Вы завяршылі вывучэнне гісторыі сярэдніх вякоў. Вядома, вы дакрануліся толькі да маленькай часткі таго, што карпатліва вывучаюць гісторыкі. Гэта вельмі складаная, але яшчэ больш цікавая навука. Вы і самі можаце стаць гісторыкамі. Але для гэтага, як вы ўжо пераканаліся, патрэбны веды не толькі па адной гісторыі, але і па многіх іншых навучальных дысцыплінах. Без іх немагчыма, напрыклад, рэстаўрыраваць старыя рэчы, вызначыць узрост шматлікіх знаходак, перавесці ў сучаснае летазлічэнне даты, якія названы ў сярэдневяковых дакументах і кнігах. Але самае галоўнае і цікавае — гэта зразумець, што сярэдневяковыя людзі не такія, як мы. У іх былі іншыя інтарэсы, іншыя мэты ў жыцці, не такія, як у нас нормы паводзін. І нам многае часта здаецца незразумелым у іх учынках. Але высвятліць усё гэта і ёсць задача гісторыка. І калі вас гэта зацікавіла, то — наперад да далейшага пазнання гісторыі!

Сярэдневякоўе зусім не было перыядам заняпаду ці застою, як лічылі гуманісты, якія самі выраслі з сярэдневяковага грамадства. Перыяд Позняга сярэдневякоўя даў многае нашай сучаснасці. Грамадства грамадзян у антычнасці, напрыклад, не ведала выбарных прадстаўнічых устаноў. У велізарнай Рымскай дзяржаве немагчыма было склікаць грамадзян на народны сход з розных яе частак. А ў сярэднія вякі з'явіліся парламент, Генеральныя штаты, картэсы, дзе гэта праблема была вырашана геніяльна проста. Людзі на месцах выбіралі сваіх прадстаўнікоў у дзяржаўны орган, і ў ім яны прадстаўлялі іх інтарэсы.

Без друкаванай кнігі мы не ўяўляем сёння сваё жыццё. А кнігадрукаванне ж распаўсюдзілася па свеце дзякуючы вынаходству Іагана Гутэнберга. У Кітаі яго вынайшлі намнога раней, але яно было вядома толькі там і ў суседніх краінах. Еўрапейскае вынаходства кнігадрукавання стала здабыткам

Правообладатель Народная асвета

усяго чалавецтва. У скарбніцу культуры ўсяго чалавецтва ўвайшлі вялікія творы дзеячаў Адраджэння.

Развіццё сярэдневяковых цывілізацый было нераўнамерным. У Раннім і Высокім сярэдневякоўі кітайская, індыйская цывілізацыі намнога пераўзыходзілі па ўзроўні свайго развіцця цывілізацыі Еўропы. Але ў Познім сярэдневякоўі Еўропа зрабіла імклівы рывок наперад і стала аб’яднальнікам лёсу чалавецтва ў адзіны сусветна-гістарычны працэс.

Кожная з сярэдневяковых цывілізацый унесла свой уклад у развіццё чалавецтва. У тым ліку і цывілізацыі Афрыкі і Амерыкі, доўга невядомыя ні людзям Еўропы, ні Азіі. Мы зараз нават не задумваемся, адкуль, напрыклад, з’явіліся такія прадукты, як бульба, таматы, кукуруза, з чаго робяць шакалад. Адкрываючы для сябе далёкія землі, еўрапейцы дзівіліся велічы і прыгажосці пірамід-храмаў, створаных цывілізацыямі Амерыкі. Цяжка было паверыць, што на іншым краі Зямлі існуюць збудаванні, падобныя аднаму з сямі цудаў свету. Не меншае здзіўленне еўрапейцаў выклікалі і грандыёзныя каменныя будынкі на поўдні Афрыкі — на тэрыторыі сучаснага Зімбабве. У Еўропе доўга хадзілі легенды пра тое, што іх пабудавалі нейкія таямнічыя прышэльцы. Але гісторыкі даказалі, што гэтыя збудаванні — справа розуму і працы мясцовага афрыканскага насельніцтва.

Два стагоддзі Позняга сярэдневякоўя падрыхтавалі падмурак да пераходу чалавецтва да якасна новай эпохі ў яго гісторыі. Гэту эпоху так і назвалі — Новай гісторыяй. Галоўнай яе характарыстыкай з’явілася тое, што развіццё чалавецтва перастала быць гісторыяй толькі асобных цывілізацый свету. Яно станавілася адзіным працэсам, дзе лёс розных цывілізацый быў узаемазвязаным. Змяненні ва ўсіх сферах жыцця чалавека, грамадства сталі адбывацца намнога хутчэй, чым у эпохі старажытнасці і сярэдневякоўя. Пра гэта вы даведаецеся ў наступным класе, дзе будзеце вывучаць займальную і насычаную падзеямі эпоху Новай гісторыі.

Правообладатель Народная асвета

## АСНОЎНЫЯ ПАДЗЕІ ПОЗНЯГА СЯРЭДНЕВЯКОЎЯ

| Стагоддзе | Заходняя Еўропа | Славянскія краіны | Цывілізацыі Азіі, Афрыкі і Амерыкі |
|---|---|---|---|
| **XIV** | **1302 г.** Узнікненне Генеральных штатаў у Францыі<br>**1309—1377 гг.** Авіньёнскі «палон» пап<br>**1337—1453 гг.** Стогадовая вайна<br>**1347—1353 гг.** «Чорная смерць» (эпідэмія чумы)<br>**1358 г.** Жакерыя<br>**1381 г.** Паўстанне Уота Тайлера<br>**1388 г.** Адкрыццё партугальцамі мыса Добрай Надзеі<br>**1397 г.** Кальмарская унія<br>**XIV—XV стст.** Ранняе Адраджэнне | **Першая палова XIV ст.** Праўленне Івана Каліты (1325—1340 гг.)<br>Узмацненне Маскоўскага княства<br>Узвышэнне Сербіі пры Стэфане Душане (1331—1355 гг.)<br>**1348 г.** Заснаванне універсітэта ў Празе<br>**Сярэдзіна XIV ст.** Узмацненне Польшчы пры Казіміру III Вялікім (1333—1370 гг.)<br>**1364 г.** Заснаванне універсітэта ў Кракаве<br>**1380 г.** Кулікоўская бітва<br>**1385 г.** Крэўская унія<br>**1389 г.** Бітва на Косавым полі | **1330—1390-я гг.** Міжусобная вайна ў Японіі<br>**Сярэдзіна XIV ст.** Пачатак заваявання туркамі-асманамі Балканскага паўвострава<br>**1353 г.** Канец мангольскага панавання ў Іране<br>**1368 г.** Вызваленне Пекіна кітайскімі паўстанцамі ад манголаў<br>**Другая палова XIV ст.** Стварэнне дзяржавы Цімура ў Сярэдняй Азіі і Іране<br>**XIV ст.** Утварэнне дзяржавы Конга |

Правообладатель Народная асвета

| | | | |
|---|---|---|---|
| **XV** | **Каля 1445 г.** Вынаходства кнігадрукавання ў Еўропе<br>**1453 г.** Узяцце Канстанцінопаля туркамі-асманамі<br>**1455—1485 гг.** Вайна Пунсовай і Белай ружы ў Англіі<br>**1479 г.** Аб'яднанне Кастыліі і Арагона ў адзінае каралеўства Іспанія<br>**1492 г.** Завяршэнне Рэканкісты<br>**12 кастрычніка 1492 г.** Адкрыццё Калумбам Амерыкі<br>**1498 г.** Адкрыццё Васка да Гамай марскога шляху ў Індыю вакол Афрыкі | **1410 г.** Бітва пры Грунвальдзе<br>**1415 г.** Пакаранне смерцю Яна Гуса<br>**1419—1434 гг.** Гусіцкія войны<br>**Першая чвэрць XV ст.** Творчая дзейнасць Андрэя Рублёва<br>**1425—1453 гг.** Феадальная вайна ў Расіі<br>**1479 г.** Завяршэнне будаўніцтва Успенскага сабора ў Маскве<br>**1480 г.** Канец мангола-татарскага ярма на Русі | **Пачатак XV ст.** Распад дзяржавы Цімура<br>Кітайскія марскія экспедыцыі на чале з Чжэн Хэ ў Інданэзію, Індыю, Усходнюю Афрыку<br>**XV ст.** Заняпад Дэлійскага султаната<br>Росквіт дзяржаў інкаў і ацтэкаў у Амерыцы<br>Узвышэнне Сангайскай дзяржавы |

Правообладатель Народная асвета

# СЛОЎНІК

**Авіньёнскі «палон» пап** — перыяд знаходжання (1309—1377 гг.) кіраўнікоў каталіцкай царквы ў горадзе Авіньёне, а не ў Рыме.

**Адраджэнне** — новы тып культуры, што ўзнікла ў XIV ст. у Італіі, якой уласцівы гуманізм і цікавасць да антычнасці.

**Банкі** — установы, якія здзяйсняюць грашовыя разлікі і захоўваюць грашовыя назапашванні.

**Баярская дума** — пастаянны савет з вышэйшай знаці пры маскоўскім вялікім князю.

**Баяры** — у Старажытнай Русі — найбольш уплывовыя людзі, вышэйшы пласт княжацкай дружыны, затым — землеўладальнікі; у Маскоўскай Русі — буйныя ўласнікі зямельных уладанняў — вотчын, уваходзілі ў савет пры вялікім князю — Баярскую думу.

**Бюргерства** — гарадское насельніцтва (рамеснікі і гандляры) у Чэхіі і Германіі.

**Вотчына** — асноўная форма землеўладання ў Познім сярэдневякоўі ў Маскоўскай Русі; уласнік мог распараджацца зямлёю па сваім меркаванні — завяшчаць, прадаваць, дарыць.

**«Вялікі раскол»** — раскол у каталіцкай царкве з 1378 па 1417 г., калі адна частка католікаў лічыла сваім галавой папу ў Рыме, а другая — у Авіньёне.

**Вялікія геаграфічныя адкрыцці** — адкрыцці еўрапейскіх падарожнікаў з сярэдзіны XV ст. да сярэдзіны XVII ст.

**Генеральныя штаты** — саслоўна-прадстаўнічы орган у Францыі з трох палат для прадстаўнікоў духавенства, феадалаў і гараджан.

**Гуманізм** — вучэнне мысліцеляў Адраджэння, у цэнтры якога знаходзіўся чалавек ва ўсіх праявах яго жыцця.

Правообладатель Народная асвета

**Гусіты** — паслядоўнікі вучэння Яна Гуса, выступалі за паслабленне ўплыву каталіцкай царквы і супраць нямецкага панавання ў Чэхіі.

**Дваране** — служылыя людзі ў Маскоўскай Русі, якія атрымлівалі за службу зямельныя ўладанні.

**Дзяржаўная унія** — аб’яднанне дзяржаў пад адзінай уладай.

**Жакерыя** — паўстанне сялян у Францыі ў 1358 г.

**Забаронены горад** — палацавы комплекс у цэнтры Пекіна, з XV ст. імператарская рэзідэнцыя ў Пекіне, куды быў забаронены ўваход простым людзям.

**«Залатая була»** — асноўны закон Свяшчэннай Рымскай імперыі, які быў прыняты ў 1356 г. і вызначаў правы буйных феадалаў і правілы выбрання імператара.

**Ідальга** — назва рыцараў у дзяржавах Пірэнейскага паўвострава.

**Інтэлігенцыя** — асобая група людзей у грамадстве, якія займаюцца разумовай працаЯй.

**Каравела** — быстраходны парусны карабель з трыма-чатырма мачтамі, які выкарыстоўваўся для акіянскіх плаванняў.

**Картэсы** — саслоўна-прадстаўнічы орган у Іспаніі і Партугаліі.

**Магнаты** — буйныя землеўладальнікі, найбольш радавітыя і багатыя людзі ў Польшчы.

**Маёнтак** — форма землеўладання, якая з’явілася ў Маскоўскай Русі ў канцы XV ст.; даваўся дзяржавай за нясенне вайсковай ці іншай службы.

**Мануфактура** — прадпрыемства, заснаванае на падзеле працы і ручной вытворчасці.

**Наёмныя рабочыя** — работнікі мануфактур, якія атрымлівалі за сваю працу грашовую ўзнагароду.

**Паны** — буйныя землеўладальнікі, найбольш радавітыя і багатыя людзі ў Чэхіі; агульная назва феадалаў у Польшчы.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

**Падзел працы** — размеркаванне работнікоў па простых аперацыях пры вытворчасці вырабу.

**Паўстанне «чырвоных войскаў»** — вызваленчае паўстанне ў Кітаі, якое закончылася выгнаннем манголаў з краіны.

**Познефеадальнае грамадства** — грамадства, у якім галоўнымі застаюцца феадальныя адносіны, але знікае асабістая залежнасць сялян ад феадалаў і феадальная іерархія.

**Рэйхстаг** — орган саслоўнага прадстаўніцтва ў Германіі.

**Саслоўна-прадстаўнічая манархія** — манархія, якая абапіраецца на органы саслоўнага прадстаўніцтва дваран, духавенства, гараджан.

**Сейм** — у Познім сярэдневякоўі дарадчы орган пры правіцелю ў Чэхіі і Польшчы.

**Табарыты** — радыкальнае крыло руху гусітаў, змагаліся за стварэнне грамадства роўнасці і справядлівасці, назву атрымалі па г. Табар у Паўднёвай Чэхіі.

**Цімар** — землі з сялянамі, якія даваліся ў Асманскай імперыі за вайсковую службу без перадачы па спадчыне, без права судзіць сялян і асабіста ўстанаўліваць для іх павіннасці.

**Удзел** — тэрыторыя з адным ці некалькімі гарадамі, якую атрымліваў ва ўладанне прадстаўнік княжацкай сям'і ў Маскоўскай Русі.

**Цэнтралізаваная дзяржава** — дзяржава, кіраванне якой ажыццяўляецца з аднаго цэнтра.

**Шляхта** — прывілеяванае саслоўе свецкіх феадалаў у Польшчы і Вялікім княстве Літоўскам.

**Янычары** — пастаянны корпус пяхоты ў Асманскай дзяржаве, які набіраўся спачатку з воінаў-палонных і рабоў, а затым з выгадаваных мусульманамі дзяцей заваяваных хрысціянскіх народаў.

**Ярлык** — грамата ханаў Залатой Арды, якая давала рускім князям права на ўладу ў сваіх княствах.

Правообладатель Народная асвета

# З М Е С Т

Ад аўтараў . . . . . . . . . . 3
Уводзіны. Свет і Еўропа ў Познім сярэдневякоўі . . . . . . . . . . 4

Раздзел I. **ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА**

§ 1. Змяненні ў грамадстве ў Заходняй Еўропе . . . . . . . . . . 11
§ 2. Цэнтралізаваныя дзяржавы . . . . . . . . . . 17
§ 3. Каталіцкая царква ў Познім сярэдневякоўі . . . . . . . . . . 21
§ 4. Стогадовая вайна (1337—1453 гг.) . . . . . . . . . . 26
§ 5. Англія і Францыя ў другой палове XV ст. . . . . . . . . . . 31
§ 6. Германія . . . . . . . . . . 36
§ 7. Італія . . . . . . . . . . 40
§ 8. Іспанія і Партугалія . . . . . . . . . . 44
§ 9. Вытокі Адраджэння і гуманізму . . . . . . . . . . 47
§ 10. Мысліцелі, паэты і пісьменнікі Адраджэння . . . . . . . . . . 52
§ 11. Мастацтва Ранняга Адраджэння. Кнігадрукаванне . . . . . . . . . . 57
§ 12. Пачатак Вялікіх геаграфічных адкрыццяў . . . . . . . . . . 60
§ 13. Штодзённае жыццё чалавека Позняга сярэдневякоўя . . . . . . . . . . 66

*Абагульненне да раздзела I.* Заходняя Еўропа . . . . . . . . . . 72

Раздзел II. **СЛАВЯНЕ Ў ПОЗНІМ СЯРЭДНЕВЯКОЎІ**

§ 14. Чэхія ў Познім сярэдневякоўі . . . . . . . . . . 77
§ 15. Польшча ў Познім сярэдневякоўі . . . . . . . . . . 83
§ 16. Краіны Балканскага паўвострава ў XIV—XV стст. . . . . . . . . . . 89
§ 17. Узмацненне Маскоўскага княства . . . . . . . . . . 95
§ 18. Стварэнне адзінай Расійскай дзяржавы . . . . . . . . . . 101
§ 19. Грамадства і гаспадарка Маскоўскай Русі . . . . . . . . . . 106
§ 20. Праваслаўная царква ў Маскоўскай Русі . . . . . . . . . . 111
§ 21. Культура Паўночна-Усходняй Русі XIV—XV стст. . . . . . . . . . . 116
§ 22. Жыццё людзей Маскоўскай Русі . . . . . . . . . . 121

*Абагульненне да раздзела II.* Славяне ў Познім сярэдневякоўі . . . . . . . . . . 126

Раздзел III. **ЦЫВІЛІЗАЦЫІ АЗІІ, АФРЫКІ І АМЕРЫКІ**

§ 23. Іран і Сярэдняя Азія . . . . . . . . . . 129
§ 24. Асманская дзяржава . . . . . . . . . . 133
§ 25. Індыя ў XIV—XV стст. . . . . . . . . . . 138
§ 26. Кітай у XIV—XV стст. . . . . . . . . . . 143
§ 27. Японская цывілізацыя . . . . . . . . . . 147
§ 28. Цывілізацыі Трапічнай Афрыкі і Амерыкі . . . . . . . . . . 152

*Абагульненне да раздзела III.* Цывілізацыі Азіі, Афрыкі і Амерыкі . . . . . . . . . . 156
Заключэнне. Сярэдневякоўе ў гісторыі чалавецтва . . . . . . . . . . 160
Асноўныя падзеі Позняга сярэдневякоўя . . . . . . . . . . 162
Слоўнік . . . . . . . . . . 164

Правообладатель Народная асвета

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Фядосік** Віктар Анатольевіч
**Еўтухоў** Ігар Арэставіч
**Яноўскі** Алег Антонавіч і інш.

**ГІСТОРЫЯ СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ**
**XIV—XV стст.**

Вучэбны дапаможнік для 7 класа
агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна*. Рэдактар *Т. У. Люковіч*. Афармленне *В. Я. Нога*, *В. Р. Мішчанкі*. Падрыхтоўка картасхем *В. М. Цемушава*. Мастацкі рэдактар *А. М. Хількевіч*, *Л. І. Мялой*. Тэхнічны рэдактар *М. І. Чаплаводская*. Камп'ютэрная вёрстка *Е. Ю. Гурчонак*. Карэктары *В. С. Бабеня, Г. В. Алешка, Т. М. Вядзернікава.*

Падпісана ў друк 23.07.2009. Фармат $70\times90^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура школьная. Умоўн. друк. арк. 12,29. Ул.-выд. арк. 8. Тыраж 25 415 экз. Заказ 79.

Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0494083 ад 03.02.2009.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛП № 02330/0494156 ад 03.04.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Правообладатель Народная асвета